◂ № 34 (210) ◂ 24 верасня ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



ВЯЧАСЛАЎ СІЎЧЫК

Стар. 4

**БЕЗ ФУНДАМЕНТАЛЬНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ НАВУКА ПАМІРАЕ**

Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі — асоба знакавая і вядомая ў навуковых колах. Аўтарытэт гэтага чалавека, які многа зрабіў для айчыннай геалогіі, стаў прадаўжальнікам працы свайго бацькі, непахісны

Стар. 6

**КАРЛСАН, ЯКІ ГАЛАСУ ЗА ПРАВЫХ**

Сенсацыяй выбараў у Швецыі стаў прарыў у парламент правай радыкальнай партыі Шведскія дэмакраты

Стар. 27

**ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ**

Стар. 9–24

ISSN 2218-2144

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ**

**БАЧУ МЭТУ**

Нарыс Сяргея Нікалюка з цыклу «Азбука паліталогіі»

▸ СПРАВАЗДАЧА

# ВАЛЮТНЫ МІНУС

Вольга ХВОІН




**Старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Пётр Пракаповіч падчас сваёй справаздачы аб выкананні Асноўных кірункаў грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі паведаміў Аляксандру Лукашэнку, што база для ўстойлівага развіцця беларускай эканомікі створаная. І Нацбанк мае намер нарошчваць аб'ём золатавалютных рэзерваў. Адначасова назіраецца дэфіцыт на валютным рынку, які вымывае той самы стратэгічны золатавалютны запас.**

Паводле справаздачы кіраўніцтва Нацбанка, усе асноўныя паказчыкі грашова-крэдытнай палітыкі ў Беларусі па выніках васьмі месяцаў выконваюцца. Курс нацыянальнай валюты да кошыка замежных валют застаецца стабільным, захоўваюцца высокія тэмпы крэдытавання эканомікі, працэнтная палітыка адпавядае «Асноўным кірункам грашова-крэдытнай палітыкі». Так, курс беларускага рубля да кошыка замежных валют за студзень-жнівень паменшыўся толькі на 0,29% пры запланаваным на год калідоры ваганняў у межах +/-10%.

«Устойлівасць нашай нацыянальнай валюты, стабільнасць курсавой палітыкі заснаваныя не толькі на паспяховай працы нашай эканомікі, але і на тым, што мы маем дастаткова золатавалютных рэзерваў», — патлумачыў кіраўніку дзяржавы Пётр Пракаповіч. На 1 верасня золатавалютныя рэзервы Беларусі, па дадзеных Нацбанка, разлічаныя па нацыянальнай методыцы, склалі 6055 мільёнаў долараў ЗША, павялічыўшыся за студзень–жнівень 2010 года на 1,3%.

Старшыня праўлення Нацбанка рост золатавалютных рэзерваў тлумачыць тым, што павялічваецца валютная выручка беларускіх прадпрыемстваў, якая ў бягучым годзе больш чым на 20% (або на 2,5 мільярда долараў) перавышае паказчык мінулага года. Аднак не трэба забываць, што 1 мільярд долараў паступіў у казну ад продажу еўраабліґацый, 670 мільёнаў долараў выдзеліў Міжнародны валютны фонд, і 625 мільёнаў долараў выплаціла Расія за «Белтрансгаз». Сёлета, у адпаведнасці з Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі, золатавалютныя рэзервы мусяць павялічыцца на 0,5–1,8 мільярда долараў.

Разам з тым на беларускай валютна-фондавай біржы назіраецца значнае перавышэнне попыту на валюту над прапановай. Розніца, натуральна, пакрываецца з рэзерваў Нацбанка. Так, за першае паўгоддзе дэфіцыт пры аперацыях куплі-продажу склаў 1 455 357 тысяч долараў і 304414 тысяч еўра. У ліпені і жніўні — прапанова валюты ў доларах на біржы перавысіла на 17 795 тысяч, дэфіцыт еўра склаў 93 387 тысяч. Калі да канца года будуць падвышацца заробкі, то, натуральна, павялічыцца і попыт на валюту сярод насельніцтва, бо захоўваць свае прыбыткі беларусы ўсё ж любяць у замежных еўра і доларах, а не мясцовых рублях, тым больш, што хутка Новы год, а памяць пра дэвальвацыю беларускага рубля 2 студзеня 2009 года яшчэ свежая.

Прыкрыць дзіркі ў фінансавых запасах магчыма праз знешнія пазыкі, але сёлета Беларусь на гэтым полі і так адзначылася (як паведамляе БелаПАН, на 1 ліпеня знешні доўг дасягнуў 23 мільярдаў 171 мільёна долараў ЗША, што складае 45,5% ВУП; у разліку на душу насельніцтва валавы знешні доўг цяпер 2447 долараў). Калі прадаць тое-сёе з гаспадаркі, можа, што-небудзь і прыкрыецца.

Але міністр фінансаў Андрэй Харкавец, калі прымаўся бюджэт на наступны год, заявіў, што прыбыткі ад прыватызацыі аб'ектаў пойдуць на павелічэнне золатавалютных рэзерваў краіны. «Марнаваць прыбыткі ад прыватызацыі на бягучыя выдаткі бюджэту мы не маем намеру», — сказаў міністр. Таксама і Расія (важнейшы партнёр) падразае гандлёвыя крылы Беларусі, а наступствы фінансава-эканамічнага крызісу негатыўна ўплываюць на попыт на міжнародных рынках.

Апроч названых праблем, вымалёўваецца і рост пратэрмінаваных пазыкаў перад банкамі — па інфармацыі Нацбанка, яны дасягнулі 319 мільёнаў долараў. Запазычанасць насельніцтва складае 38 мільёнаў долараў, юрыдычных асобаў — 281 мільён долараў. Агульная сума праблемнай запазычанасці (пралангаванай і пратэрмінаванай) на 1 верасня дасягнула 844,5 мільярда рублёў, павялічыўшыся на 28,4% з пачатку года. Аб'ём запазычанасці па крэдытах і іншых актыўных аперацыях павялічыўся з пачатку года на 24% да 85,7 трыльёна рублёў. Нацыянальны банк Беларусі плануе стварыць спецыялізаванае фінансавае агенцтва, якое будзе займацца абслугоўваннем праблемных крэдытаў, што з'явіліся ў выніку рэалізацыі дзяржпраграм. Па меркаванню Пракаповіча, гэта дапамагло б падвысіць крэдытныя рэйтынгі беларускіх банкаў і павялічыць стабільнасць працы сістэмы.

Цікавы факт: у 2006 годзе Аляксандр Лукашэнка паставіў перад Нацыянальным банкам задачу да 2011 года сфармаваць золатавалютныя рэзервы ў памеры 32 тоны золата і 3 мільярда долараў (план выкананы). Тады кіраўнік дзяржавы пажартаваў: «Апошнім часам усё пытаюць, а колькі Лукашэнка прабудзе ва ўладзе? Мы з Пракаповічам будзем ва ўладзе, пакуль не створым залаты запас у 100 тон золата і золатавалютныя рэзервы ў 10 мільярдаў долараў». Яшчэ нямала часу і крэдытаў спатрэбіцца Беларусі, каб задуманае стала рэальным.

АКЦЫЯ

# «СЫХОДЗЬ!»



Генадзь КЕСНЕР

**Незарэгістраваныя Партыя «Беларуская хрысціянская дэмакратыя», Сацыял-дэмакратычная партыя (Народная грамада) і зарэгістраванае ў Чэхіі Міжнароднае моладзевае аб'яднанне «Малады фронт» на прэс-канферэнцыі 22 верасня абвясцілі пра пачатак падрыхтоўкі да масавай акцыі, якая мусіць адбыцца ў Мінску 24 лістапада.**

Па словах сустаршыні БХД Паўла Севярынца, гэта будзе ключавы дзень і ключавая акцыя падчас перадвыбарчай кампаніі 2010 года. Дзень 24 лістапада абраны па дзвюх прычынах.

«Першая заключаецца ў тым, што 24 лістапада — гэта наступны дзень пасля рэгістрацыі або нерэгістрацыі кандыдатаў у прэзідэнты на так званых прэзідэнцкіх выбарах, — адзначыў Павел Севярынец. — Па-другое, гэта гадавіна сумнавядомага рэферэндуму 1996 года, калі Лукашэнка змяніў Канстытуцыю, і фактычна з гэтага дня вядзе свой адлік аўтарытарны, недэмакратычны рэжым, не прызнаны цывілізаванымі краінамі свету. У гэты дзень мы збіраемся правесці масавую акцыю пад назвай «Сыходзь!». 24 лістапада мы заклікаем беларусаў на Кастрычніцкую плошчу і ўжо цяпер пачынаем адпаведную інфармацыйную кампанію».

Старшыня незарэгістраванай БСДП (Народная грамада) Мікалай Статкевіч адзначыў, што гэта прэзідэнцкая кампанія праходзіць у крыху незвычайнай сітуацыі. «Зараз пачынаецца збор подпісаў, і мы спадзяемся, што пасля гэтага этапу і да этапу рэгістрацыі мы ўсё ж здолеем выйсці на адзінага, каб не даць Лукашэнку самому вызначыць свайго канкурэнта, бо мы разумеем, па якіх крытэрах ён будзе выбіраць сабе сапернікаў».

Мікалай Статкевіч падкрэсліў, што калі сярод зарэгістраваных кандыдатаў не будзе прадстаўнікоў дэмакратычнай апазіцыі, то яго структура будзе заклікаць людзей да байкоту выбараў, хоць сам палітык не з'яўляецца прыхільнікам байкотаў электаральных кампаній.

Лідэр маладафронтаўцаў Зміцер Дашкевіч паведаміў, што яго арганізацыя будзе дамагацца няўдзелу дзейнага кіраўніка дзяржавы ў прэзідэнцкай кампаніі. «Калі ён будзе ўдзельнічаць, выбары губляюць сэнс, — перакананы Дашкевіч. — У такім выпадку, я спадзяюся, большая частка апазіцыі схіліцца да ідэі байкоту выбараў і арганізацыі Плошчы».

Патэнцыйны кандыдат у прэзідэнты ад БХД Віталь Рымашэўскі таксама пацвердзіў свой намер на арганізацыю Плошчы, а таксама на супрацоўніцтва ў гэтым накірунку з усімі іншымі прэтэндэнтамі на прэзідэнцкую пасаду. Віталь Рымашэўскі заклікаў усе дэмакратычныя сілы Беларусі падтрымаць акцыю 24 лістапада.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# МІНЮСТ СУПРАЦЬ БХД

**Міністэрства юстыцыі пакінула без разгляду заяву аб рэгістрацыі партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» (БХД).**

Як паведамляе сайт Мінюста, «у сувязі з тым, што ў прадстаўленых дакументах адсутнічае спіс членаў кіруючага органа партыі (Нацыянальнай Рады), наяўнасць якога прадугледжана артыкулам 15 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб палітычных партыях», заява аб рэгістрацыі партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» пакінутая без разгляду».

Як патлумачыў сустаршыня БХД Павел Севярынец, Мінюст «паспяшаўся са сваім паведамленнем». «Устаноўчы з'езд БХД прайшоў 12 верасня, дакументы на рэгістрацыю партыі мы абавязаны падаць на працягу месяца. Гэта значыць, для падачы ўсіх дакументаў у нас ёсць тэрмін да 12 кастрычніка. У гэты час мы можам перадаваць у Мінюст дакументы, якіх не хапае, выпраўляць выяўленыя памылкі, забіраць недакладныя дакументы — гэта значыць, рабіць усё, каб да 12 кастрычніка ў нас усё было ў парадку», — лічыць Севярынец.

Паводле яго слоў, ужо сёння спіс членаў кіруючага органа партыі быў перададзены ў Мінюст.

«Мы проста спяшаемся з падачай дакументаў, таму што ў канцы кастрычніка еўрапейскія структуры павінны вырашаць пытанне аб працягу санкцый у дачыненні да беларускіх чыноўнікаў. Адна з умоў зняцця санкцый — рэгістрацыя БХД. Таму дакументы ў Мінюст мы адносім часткамі, па меры іх гатоўнасці», — сказаў Севярынец.

Паводле БелаПАН

ДЫСПУТ

# РОЛЯ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

Генадзь КЕСНЕР

**Пяты дыспут памяці былога прэзідэнта ФРГ Йаханэса Рау «Роля арганізацый грамадзянскай супольнасці ў працэсе аб'яднання Германіі» адбыўся 21 верасня ў вялікай зале Мінскага Міжнароднага адукацыйнага цэнтра.**

Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Мінскі МАЦ імя Йаханэса Рау, Дортмундскі Міжнародны адукацыйны цэнтр і Фонд імя Фрыдрыха Эберта.

З прывітальнымі словамі да ўдзельнікаў форума звярнуліся намеснік міністра замежных спраў Беларусі Валеры Варанецкі, новы пасол Германіі ў Беларусі Крыстаф Вайль, прадстаўнік Фонду Эберта Аляксандр Петрачкоў, а таксама кіраўнік Дортмундскага Міжнароднага адукацыйнага цэнтра Мацііяс Цюмпель. У ролі «хэдлайнера» дыспуту быў віцэ-прэзідэнт нямецкага Бундэстагу Вольфганг Тырзэ, які і выступіў з асноўным дакладам.

«3 кастрычніка 1990 года ўпершыню адбылася рэвалюцыя без кровапраліцця, упершыню ў гісторыі чалавецтва адна суверэнная дзяржава мірна растварылася ў іншай. Калі б не было 3 кастрычніка 1990 года, і сёння б захавалася ваеннае і палітычнае супрацьстаянне паміж Усходам і Захадам… Йаханэс Рау не верыў, што аб'яднанне Германіі стане магчымым яшчэ пры яго жыцці, ён назваў тое, што здзейснілася, цудам. І гэты цуд адбыўся дзякуючы грамадзянскай мужнасці, у першую чаргу, жыхароў ГДР, якія на шматтысячных мітынгах пад пільным вокам Дзяржбяспекі спачатку скандавалі: «Мы — народ!», а потым: «Мы — адзіны народ!», — адзначыў, адкрываючы дыспут, беларускі дырэктар ММАЦ Віктар Балакіраў.

Па словах Вольфганга Тырзэ, Беларусь бачыць сябе часткай Еўропы і таму хоча палепшыць стасункі з Еўрапейскім саюзам.



«А мы з'яўляемся не толькі эканамічнай супольнасцю, але і каштоўнаснай, і з намі не так проста весці перамовы, як з бізнесменамі», — падкрэсліў віцэ-прэзідэнт нямецкага парламента.

Валеры Варанецкі, у сваю чаргу, адзначыў, што «на дзяржаўным узроўні ў Беларусі адбываецца паступовая эвалюцыя агульнага ўспрыняцця няўрадавых арганізацый як паўнавартасных партнёраў у вырашэнні задач, якія стаяць перад дзяржавай». «Са студзеня 2009 года працуе Грамадска-кансультацыйны савет пры Адміністрацыі прэзідэнта, які аб'ядноўвае прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў, партый і чыноўнікаў», — падкрэсліў высокі чыноўнік.

Аднак Варанецкі забыў сказаць, што ў Крымінальны кодэкс уведзены артыкул 193.1, які прадугледжвае адказнасць за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Што ўжо амаль ніхто не памятае, калі гэты ГКС збіраўся апошні раз і якія пытанні абмяркоўваў. Што ў Беларусі сёння практычна не магчыма зарэгістраваць не тое што палітычную партыю, але нават папросту няўрадавую арганізацыю (грамадскае аб'яднанне). Ужо ў дзясяты раз не зарэгістравалі праваабарончае аб'яднанне «Берасцейская вясна», сёлета зноў не атрымала дазволу на легальную дзейнасць Асамблея няўрадавых дэмакратычных арганізацый.

Таму, як адзначыў палітолаг Вячаслаў Пазняк, «агульны працэс дэмакратызацыі, дэмакратычных рэвалюцый у Еўропе — гэта той кантэкст, якога сёння няма ў Беларусі».

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# ВЫВУЧАЕМ АНГЛІЙСКУЮ МОВУ РАЗАМ З БЕЛАРУСКАЙ

Аляксей ХАДЫКА

**У кнігарні «Кніжны салон» на Калініна, 5 у Мінску прайшла прэзентацыя «Беларуска-англійскага і англа-беларускага размоўніка», падрыхтаванага і выдадзенага ТБМ імя Францішка Скарыны і праведзеная старшынёй арганізацыі Алегам Трусавым.**

Ініцыятарам выдання размоўніка была прысутная на сустрэчы Алена Анісім, адзін з яго аўтараў. Яна паведаміла, што выданне з'явілася дадатковым вынікам шматгадовай працы курсаў беларускай мовы ТБМ. Спачатку нарадзіўся беларускі размоўнік, які вырашана было «змясціць у сусветны моўны кантэкст» шляхам дадатку англамоўнай часткі сумеснай працай сяброў суполкі «Нашчадкі» пад метадычным кіраўніцтвам Уладзіміра Кошчанкі. Уладзімір Кошчанка звярнуў увагу на ўжытую аўтарскім калектывам дасканалую сучасную сістэму фанетычнай транскрыпцыі, якая дапамагае лепш засвойваць беларускае маўленне тым, хто пачынае вывучаць беларускую мову, звяртаючыся да яе праз англійскую.

Наклад першага выдання — 200 асобнікаў, але па атрыманні заўваг і прапаноў мяркуецца наступны палепшаны выпуск памерам 10 000 і болей экземпляраў для шырокага продажу. Таксама ў планах ТБМ двухбаковыя размоўнікі са шведскай, нямецкай, арабскай, японскай і кітайскай мовамі — мовамі тых краін, з якімі Беларусь развівае дынамічныя двухбаковыя адносіны.

Пачэсная госця прэзентацыі амбасадар Вялікабрытаніі ў Беларусі Размары Томас, адзначыўшы прыгажосць і мілагучнасць беларускай мовы, паабяцала прыкласці намаганні для яе засваення. Яна адзначыла таксама важнасць падтрымкі моў, якія знаходзяцца ў няпростым стане, як беларуская. На брытанскіх выспах зараз свядома падтрымліваецца развіццё ўсіх моў — двух варыянтаў у Шатландыі, а таксама моў Ірландыі, Уэльса (апошняя мова была амаль страчана) і англійскага варыянта французскай мовы.

Другая прэзентацыя размоўніка адбудзецца 28 верасня а 18 гадзіне ў дольнай зале Чырвонага касцёла Святых Сымона і Алены ў Мінску. Тамсама будуць прадстаўлены іншыя выданні ТБМ.

ПАМЯЦЬ

# СТРАЙКБОЛ У ГОНАР ФІЛІСТОВІЧА

Алесь ЗАРЭМБЮК

**У Варшаве адбылася страйкбольная гульня, прысвечаная памяці беларускага патрыёта Янкі Філістовіча.**

Мерапрыемства было арганізавана грамадскай арганізацыяй «Беларуская нацыянальная памяць».

У адзін з Варшаўскіх паркаў з'ехаліся беларусы, якія часова альбо стала пражываюць у Польшчы, былі і госці з Беларусі. Грамада падзялілася на дзве каманды. Адны выступілі ў ролі абаронцаў Філістовіча, а другія (каманда МГБ БССР) праводзілі аперацыю па яго арышту. Скончылася гульня тым, што Янка Філістовіч застаўся жывы і не трапіў у рукі МГБ БССР.

«Здаецца, што ты ў сапраўдных умовах і ад тваіх крокаў залежыць будучыня Беларусі і жыццё тваіх калегаў. Такое мерапрыемства — цудоўны спосаб ушанавання памяці славутага беларуса Янкі Філістовіча, а таксама актыўны адпачынак, які вучыць працы ў камандзе і выпрацоўцы стратэгіі і тактыкі групавых дзеянняў», — паведаміў «НЧ» адзін з удзельнікаў мерапрыемства Васіль Клімовіч.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# КРУГАВАЯ АБАРОНА

Сяргей САЛАЎЁЎ



Василий Федосенко

**Здаецца, улада вельмі напружылася з нагоды чутак пра тое, што будучыя прэзідэнцкія выбары могуць быць нікім не прызнаныя свабоднымі і дэмакратычнымі — ні Еўропай, ні Расіяй. Інакш з чаго б у краіне разгарнулася глабальная прапаганда, што з выбарамі ў нас «усё нармальна», і яны пройдуць «у адпаведнасці са стандартамі»? Здаецца, столькі інтэрв'ю напярэдадні прэзідэнцкай кампаніі кіраўніца Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына не давала ніколі. Хаця паўнавартасная перадвыбарчая кампанія яшчэ не пачалася.**

Ярмошына 21 верасня правяла анлайн-канферэнцыю ў інтэрнэт-газеце БелаПАН «Белорусские новости». Лідзіі Міхайлаўне прыйшлося літаральна адбівацца ад пытанняў пра тое, што ў Беларусі выбары даўно ўжо непразрыстыя, недэмакратычныя, праходзяць, фактычна, у інфармацыйным вакууме. І, нарэшце, давялося каментаваць заяву Аляксандра Лукашэнкі пра тое, што ў 2006 годзе выбары былі сфальсіфікаваныя.

Тут яна павінна была заняць кругавую абарону. Спасылаючыся на сацыялагічныя апытанні, Ярмошына заявіла, што больш за 70 працэнтаў насельніцтва давярае вынікам выбараў і ЦВК. Аднак, па-першае, яна не паведаміла, хто праводзіў гэтыя апытанні, па-другое, колькасць крытычных пытанняў на сайце www.naviny.by сведчыць якраз пра адваротнае.

Дзіўнае стаўленне спадарыня Ярмошына выказала і да магчымасці назіральнікаў паўнавартасна кантраляваць падлік галасоў. Паводле яе словаў, «назіральнікі ні ў адной краіне свету не надзеленыя правам падлічваць галасы». «Гэта робяць выбарчыя камісіі. Права назіральнікаў — толькі ажыццяўляць маніторынг за дадзенай працэдурай», — сказала яна.

Больш за тое, старшыня ЦВК лічыць, што «назіральнікі маюць права ажыццяўляць кантроль толькі за дзейнасцю выбарчай камісіі. Па-за працай камісіі назіральнікі свае функцыі не ажыццяўляюць».

Такім чынам, з функцый назіральнікаў спадарыня Ярмошына выключыла маніторынг агульнай сітуацыі ў краіне — ці праходзяць выбары ў «атмасферы страху», ці не. З функцый назіральнікаў выключаны сам маніторынг перадвыбарчай кампаніі: агітацыя кандыдатаў у прэзідэнты, правядзенне інфармацыйных сустрэч, пікетаў, мітынгаў і гэтак далей. Бо агітацыю ж ладзяць не выбарчыя камісіі? Акрамя таго, пытанне роўнасці ўсіх кандыдатаў падчас перадвыбарчай кампаніі таксама вынесена «за дужкі» функцый назіральнікаў.

Варта адзначыць, што выбары — гэта не падлік галасоў. Выбары — гэта працэс, які працягваецца пэўны прамежак часу. Выбары падзеленыя на этапы — рэгістрацыя ініцыятыўнай групы, збор подпісаў, рэгістрацыя кандыдата ў прэзідэнты, агітацыя, датэрміновае галасаванне і галасаванне непасрэдна ў дзень выбараў, падлік галасоў, абвяшчэнне вынікаў выбараў, абскарджванне гэтых вынікаў… Уся гэтая працэдура і заканчваецца інаўгурацыяй прэзідэнта. Назіральнік папросту не можа быць «прылеплены» да пэўнай выбарчай камісіі. У ацэнцы агульнай сітуацыі і ёсць сэнс назірання.

Ярмошына так і не патлумачыла, як будуць кантралявацца «датэрміновыя» і выяздныя скрыні для галасавання, заявіла, што датэрміновае галасаванне ніхто адмяняць не збіраецца, выключыла магчымасць уключэння ў склад кожнай участковай выбарчай камісіі прадстаўнікоў кандыдатаў на пасаду прэзідэнта, сказаўшы, што «на момант з'яўлення кандыдатаў у прэзідэнты ўчастковыя камісіі ўжо будуць створаныя», а больш позняе ўключэнне прадстаўнікоў кандыдатаў на пасаду прэзідэнта ва ўчастковыя выбаркамы выкліча істотнае павелічэнне выдаткаў на выбары, калі паўстане неабходнасць плаціць прадстаўнікам заработную плату, як і астатнім членам участковай камісіі.

Аргумент вельмі дзіўны, асабліва з улікам папярэдніх заяў самой Ярмошынай. Раней яна казала, што бюджэт выбарчай кампаніі разлічаны «з запасам» на 10 кандыдатаў у прэзідэнты і на магчымасць другога тура. Ужо зараз зразумела, што кандыдатаў у прэзідэнты будзе не больш пяці. Дык чаму б не пусціць зэканомленыя грошы на дэманстрацыю празрыстасці выбараў?

Кругавую абарону вакол касцёла святога Язэпа і кляштара бернардзінцаў у Мінску заняла беларуская міліцыя. Калі ў першы дзень акцыі, 16 верасня, міліцыянты затрымалі 20 хрысціян, якія пікетавалі касцёл з патрабаваннем аддаць комплекс вернікам, то ў наступныя тры дні было абвешчана часовае перамір'е. Людзі прыходзілі да касцёла, спявалі песні, ладзілі віктарыны, і ніхто іх не чапаў. Але ўжо 20 верасня перамір'е скончылася: былі затрыманыя 12 чалавек. 21 верасня — яшчэ шасцёра. Усе былі затрыманыя прэвентыўна, з мэтай сарваць акцыю.

Логіка міліцыянтаў не зусім зразумелая. Бо пікеты былі зусім бяскрыўдныя. Чаму віктарыну можна праводзіць на пляцоўцы ля дзіцячага садку сярод дашкалят, а ля касцёла — не? Чаму на лавачцы ля пад'езда можна спяваць пад гітару, а ля касцёла — не? Відавочна, што такія дзеянні міліцыі толькі напружваюць абстаноўку сярод вернікаў, асабліва калі ўлічыць, што ў ствараемую партыю БХД уваходзяць шмат вернікаў з розных хрысціянскіх канфесій. І ў кожнай канфесіі абмяркоўваюцца гэтыя затрыманні і праблема касцёла.

Улічваючы тое, што абаронцы касцёлу звярнуліся па дапамогу ў каталіцкую царкву і непасрэдна да Філарэта, такая «эскалацыя гвалту» выглядае вельмі недарэчнай. Пытанне, каму гэта выгадна? Няўжо мела рацыю Святлана Калінкіна, што «эскалацыя гвалту» выгадная тым, што імкнецца вярнуць Шэймана — маўляў, «пры ім такога не было»?

Але ж беларусам трэба рыхтавацца не толькі да выбараў. Мінскія медыкі не выключаюць магчымасці ўспышак захворванняў на ВРВІ і грып да пачатку эпідэмічнага сезону — ужо ў кастрычніку. Пра гэта заявіла загадчыца эпідэміялагічнага аддзела Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Алена Фісенка на брыфінгу 21 верасня.

«На сёння агульны лік захварэлых штодзень фіксуецца на адзнацы ад 4,5 да 5 тысяч выпадкаў», — сказала Фісенка. Паводле яе слоў, гэта на 30–40 працэнтаў больш, чым у аналагічным перыядзе мінулага года, і традыцыйна выходзячы з сярэдніх шматгадовых даных. Дыягназ «грып» пакуль клінічна не ўстаноўлены ні аднаму з хворых, аднак «моцна ідэнтыфікуюцца традыцыйныя рэспіраторныя вірусы».

Так што беларусам трэба не толькі рыхтавацца да выбараў, але і наспеў час есці часнок.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### АНАСТАСІЯ НОВІКАВА




Беларуска Анастасія Новікава заваявала срэбра па суме двуборства на чэмпіянаце свету па цяжкай атлетыцы. Спартоўка заняла другое месца ў вагавай катэгорыі да 58 кілаграмаў. Па суме двух практыкаванняў Анастасія Новікава паказала вынік 233 кілаграмы (рывок — 103 кг, штуршок — 130 кг).

Чэмпіёнкай свету стала кітаянка Дэн Вэй — 237 кілаграмаў (102+135). Бронза дасталася Ен Чун Мі з КНДР — 230 кілаграмаў (100+130).

«Яшчэ ні адзін медаль на міжнароднай арэне не даваўся мне з такой працай. Усё ж здабыць два піка формы за сезон надзвычай складана. Я сваю красавіцкую перамогу ў Мінску на чэмпіянаце Еўропы пераварваю дагэтуль, ды, відаць, так і не пераварыла. Жудасная стомленасць, — цытуе словы Новікавай газета «Прессбол». — Да галоўнага старту ў Лондане ў мяне ёсць час для працы над памылкамі. Я спакойна ўспрыняла б цяперашняе другое месца, калі б ведала, што праз два гады памяняю яго на першае». Гэта ўжо трэці срэбны медаль Анастасіі Новікавай на чэмпіянатах свету. Таксама Анастасія з'яўляецца бронзавай прызёркай Алімпіяды ў Пекіне, дзейснай рэкардсменкай Еўропы ў вагавых катэгорыях да 53 і да 58 кілаграмаў.

Сусветны форум у Турцыі — гэта першы этап адбору на лонданскую Алімпіяду–2012, другі этап — чэмпіянат свету 2011 года ў Парыжы. Па суме гэтых двух турніраў і будуць разыграныя пуцёўкі на наступныя Гульні. Максімальныя квоты атрымаюць шэсць мацнейшых мужчынскіх зборных (па шэсць чалавек) і дзевяць лепшых жаночых каманд (па чатыры спартсменкі).

### ІРЫНА ДАРАФЕЕВА



Любіміца палітычнай вярхушкі Беларусі Ірына Дарафеева засвяцілася ў кастынгу мюзікла «Блакітная камея» папулярнага расійскага кампазітара і прадзюсера Кіма Брэйтбурга. І ўвайшла ў склад галоўных герояў пастаноўкі. Ірына Дарафеева будзе выконваць ролю князёўны Тараканавай, апроч яе на гэтую ролю адабраныя актрыса Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра Ілона Казакевіч і студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Кацярына Муратава. Ролю графа Арлова выканае акцёр музычнага тэатра Дзмітрый Якубовіч. Яго дублёрамі будуць яшчэ два маладых артысты. «Дарафеева — гэта, хутчэй, выключэнне, — цытуе словы Брэйтбурга БелаПАН. — Мы ніколі не ставілі перад сабой задачу сабраць у спектаклі «зорак». Блізу паловы з 60 адабраных акцёраў — гэта людзі, якія прайшлі «народны кастынг», цягам трох дзён камісія прагледзела больш за 600 чалавек». Па словах Брэйтбурга, галоўная асаблівасць мюзіклу ў тым, што ён пабудаваны на рускім сюжэце, што бывае досыць рэдка. Часцей тэатры купляюць ліцэнзіі і ставяць імпартныя спектаклі.

Мюзікл будзе ставіцца на сцэне Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра, дзе, па словах кампазітара, раней не было такіх маштабных пастановак. Мінская прэм'ера «Блакітнай камеі» запланаваная на люты 2011 года.

У аснове сюжэту мюзіклу — гісторыя кахання князёўны Тараканавай, прэтэндэнткі на рускі пасад, і графа Арлова, фаварыта Кацярыны II.

### КАНСТАНЦІН ЖУКОЎСКІ



Гомельскага каардынатара аргкамітэта па стварэнні партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» Канстанціна Жукоўскага судзілі за дробнае хуліганства — нецэнзурную лаянку і непадпарадкаванне супрацоўнікам міліцыі. Перад затрыманнем, па словах актывіста, яго збілі супрацоўнікі аховы прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага. Жукоўскага затрымалі, калі той ехаў на этнаграфічнае свята «Покліч Палесся». Пратрымаўшы Жукоўскага пяць гадзінаў у мясцовым пункце міліцыі, яго асудзілі на трое сутак. Аднак па дарозе ў РАУС сувязь з Кастусём знікла, а праз некалькі гадзінаў стала вядома, што ён знаходзіцца ў хірургічным аддзяленні Петрыкаўскага шпіталю з чэрапна-мазгавой траўмай. Жукоўскі расказаў, што на яго напалі і збілі людзі з аховы Сяргея Сідорскага, які таксама наведаў свята ў Ляскавічах. Канстанцін Жукоўскі мяркуе, што тым самым ахова хацела пазбавіць высокіх чыноўнікаў ад магчымай сустрэчы з БХДшнікам.

ТРЭЦІ СЕКТАР



# ВЯЧАСЛАЎ СІЎЧЫК

Аляксандр ТАМКОВІЧ

**Першая палітычная галадоўка ў найноўшай гісторыі Беларусі звязана з імёнамі Вячаслава Сіўчыка і Юрыя Хадыкі. Яны трымалі яе вясной 1996 года на знак пратэсту супраць свайго незаконнага арышту. Увогуле ж, па падліках маці Вячаслава, затрымліваўся ён больш за 20 разоў і правёў за кратамі на Акрэсціна, калі скласці ўсе яго «суткі», больш за год свайго жыцця.**

## Шлях на «фронт»

Вячаслаў Сіўчык нарадзіўся 18 снежня 1962 года ў Мінску, аднак першыя дзіцячыя гады пражыў у Абхазіі, у Піцундзе, у дзеда з бабуляй, куды тыя завербаваліся на будаўніцтва курорта «сусветнага ўзроўню». Там і ў школу пайшоў. Але ўжо праз год вярнуўся да маці ў Мінск, дзе скончыў знакамітую 50-ю матэматычную школу і атрымаў атэстат аб сярэдняй адукацыі.

У класе быў адным з лепшых вучняў, але гуманітарныя навукі даваліся лягчэй за дакладныя, таму і выбар у 1979 годзе быў адназначны — геафак БДУ.

Пасля сканчэння БДУ Сіўчык зноў трапіў у Абхазію, дзе чатыры гады працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам, але потым вярнуўся ў Беларусь канчаткова. Замучыла настальгія.

## «Фронтаўскі» дэбют

Сваю групу падтрымкі Беларускага народнага фронту Вячаслаў Сіўчык стварыў у Савецкім раёне ў 1988 годзе. На другім з'ездзе БНФ быў першы раз абраны сябрам Сойму.

У пачатку 1996 года многія паспяшаліся пахаваць БНФ. Адзін з публіцыстаў нават напісаў, што «наступае новы час, і бел-чырвона-белых сцягоў на вуліцах мы больш не ўбачым». Рэальнасць аказалася зусім іншай. Святкаванне Дня Волі ў сакавіку 1996 года стала поўнай нечаканасцю і для ўлад, і для некаторых апазіцыянераў. Перш за ўсё таму, што тысячы людзей адважыліся выйсці на вуліцы.

Далей усё пайшло па знаёмаму зараз сцэнару. Была распачата крымінальная справа, якую следчыя дапоўнілі падзеямі чарговага «Чарнобыльскага шляху». Кіраўніцтва фронту трапіла пад рэпрэсіі. Пазьняк з Навумчыкам эміґравалі, Сіўчык з Хадыкам аказаліся за кратамі. Выпусцілі іх толькі пасля асабістай тэлефоннай просьбы тагачаснага расійскага прэзідэнта Барыса Ельцына.

Потым будзе шмат розных акцый супраціву, у тым ліку і неаднаразовае «перакрыццё» цэнтральнага сталічнага праспекта. Вячаслаў Сіўчык стане «хросным бацькам» стварэння «Маладога фронту», але яго імідж як аднаго з самых радыкальных і апантаных змагароў з існуючай уладай, на мой погляд, нарадзіўся менавіта ў 1996 годзе.

## Пачатак «другога фронту»

Акрамя «чыстай палітыкі», Вячаслаў Сіўчык займаўся і экалагічнымі праблемамі. Тым, што зараз адносяць да дзейнасці трэцяга сектара. Адбывалася гэта па лініі фонду «Дзецям Чарнобыля».

У часы перабудовы ўсе структуры, якія мелі якое-небудзь дачыненне да гэтай сферы, вырашалі, чым яны будуць займацца. У тым ліку і Міністэрства геалогіі, дзе Вячаслаў Сіўчык тады працаваў у вытворчым аб'яднанні «Беларусгеалогія». З яго ўдзелам пачаўся праект «Эколага-геалагічнае картграфаванне тэрыторыі БССР у маштабе 1:500 000».

Аналагаў падобных праектаў у былым Савецкім Саюзе не было, бо планавалася апісанне ўсіх вытворчасцяў і заводаў краіны. Кожнаму павінны былі даць свой экалагічны пашпарт, аднак СССР не стала, і праект «завіс».

Ёсць унёсак Вячаслава Сіўчыка і ў адкрыццё праўды пра чарнобыльскую трагедыю. Ён удзельнічаў у правядзенні маніторынгу па Чарнобылю. Шмат ездзіў па краіне і заўжды імкнуўся выкарыстоўваць атрыманую інфармацыю па прызначэнню.

У мінулым стагоддзі ўдалося дамагчыся прыняцця закону (аднаго з лепшых у СССР) аб мінімізацыі аварыі на ЧАЭС, у гэтым — на ім паставілі крыж. Таму я лічу, што пісьменніца Святлана Алексіевіч мае рацыю: варта пісаць працяг «Чарнобыльскай малітвы». «Праваслаўныя атэісты» маліцца не ўмеюць.

## A la guerre comme a la guerre...

У гэтай знакамітай французскай фразе — на вайне як на вайне — магчыма, і ёсць пэўнае перабольшванне, але тое, як змагаліся з Вячаславам Сіўчыкам, сапраўды, даволі часта нагадвала баявыя дзеянні. Толькі «страляні» не прадстаўнікі ўлады, а бліжэйшыя паплечнікі.

Як вядома, у 1999 годзе Віктар Ганчар, які быў на той момант намеснікам старшыні апальнага Вярхоўнага Савета 13 склікання, праводзіў так званыя альтэрнатыўныя прэзідэнцкія выбары. Калі з адносінамі да іх уладаў усё было зразумела, то ў апазіцыі на гэты конт не існуе адзінай думкі. Адны лічаць іх апраўданымі, другія — не.

Не буду займаць канкрэтныя бок, а спыню вашу ўвагу толькі на відавочным. Менавіта тыя выбары і прывялі да расколу БНФ. «Каталізатарам» стала ў тым ліку і тое, што Зянон Пазьняк, які спачатку сам жа пераканаў актывістаў БНФ увайсці ў выбарчыя камісіі Ганчара, потым паставіў пытанне наконт іх сяброўства ў арганізацыі.

Вячаслаў Сіўчык (на той момант намеснік старшыні партыі БНФ) быў катэгарычна супраць стварэння дзвюх палітычных партый і імкнуўся знайсці нейкі кампрамісны варыянт. Прапаноўваў зрабіць так, каб у Пазьняка заставалася партыя, а ў яго апанентаў — рух. Не адбылося. Мінюст незвычайна хутка зарэгістраваў дзве палітычныя партыі з аднолькавай назвай. Нават спачатку пад адным нумарам.

Сам Сіўчык апынуўся сярод тых, хто падтрымаў Вінцука Вячорку, аднак потым прынцыпова разышоўся з ім у поглядах. А ў снежні 2001 года, калі праходзіў чарговы справаздачна-выбарчы з'езд, стаў канкурэнтам Вячоркі на пасаду старшыні партыі. Прайграў, але не стаў рабіць з гэтага трагедыю.

Яе зрабілі іншыя, калі неўзабаве выключылі яго з партыі... «за раскол БНФ». Зноў-такі не хочацца агучваць нейкія высновы, але, на мой погляд, пастаянныя «выключэнні» іншадумцаў прыводзяць да таго, што адна з самых моцных калісьці апазіцыйных структур паступова ўсё больш маргіналізуецца. Такое ўражанне, што яны больш змагаюцца не з уладай, а паміж сабой...

## Жыццё пасля «фронту»

БНФ Вячаслаў Сіўчык аддаў 13 гадоў свайго жыцця, але яго грамадска-палітычная дзейнасць на гэтым не скончылася. Пасля выключэння Сіўчык прымаў актыўны ўдзел у палітычным жыцці не толькі роднай Беларусі, але і суседняй Украіны. Напрыклад, быў каардынатарам беларускай групы падчас Памаранчавай рэвалюцыі.

Пасля сумна вядомага разгрому намётавага гарадку на Кастрычніцкай плошчы пачаў сваю дзейнасць рух беларускай салідарнасці «Разам». Легалізаваць яго ўдалося толькі ў 2009 годзе. На ўстаноўчым сходзе Вячаслава Сіўчыка абралі старшынёй.

У 2007 годзе пачалася фактычная дзейнасць айчыннага «Мемарыяла». На 70-я ўгодкі трагічнай хвалі камуністычных рэпрэсій 1937-га быў створаны грамадскі аргкамітэт, які ўзначалілі акадэмік Р. Гарэцкі, пісьменнік В. Якавенка і гісторык І. Кузняцоў. У наступным жа годзе стварылі адпаведную секцыю. Натуральна, што «Разам» з самага пачатку апынулася ў эпіцэнтры гэтай дзейнасці, бо тая цалкам адпавядае і адной з галоўных мэт руху — барацьбе з этнацыдам беларускага народа.

Зробленае можна пералічваць даволі доўга. Звярну вашу ўвагу толькі на тое, што, на мой погляд, з'яўляецца найбольш значным у іх дзейнасці. Канешне, гэта знакамітыя паездкі ў Катынь, але не толькі яны. Пачынаючы са студзеня 2007 года (ужо чатыры гады запар) штомесяц 29 чысла ў Курапатах, а 29 кастрычніка па ўсёй краіне, адбываюцца акцыі ўшанавання памяці ахвяр камуністычных рэпрэсій. Чаму такая дата? Таму што ў ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 года толькі ў Мінску было знішчана больш за сто прадстаўнікоў беларускай эліты.

Пра Курапаты ёсць сэнс сказаць асобна. Адзінае, што ажыццявіла тут дзяржава, — устанавіла шыльду з надпісам, які гаворыць пра тое, што «рашэннем Саўміну БССР» там будзе пабудаваны мемарыял.

Было гэта больш як 20 гадоў таму... Саму шыльду грамадскасць ужо неаднаразова аднаўляла, а ўлады любымі спосабамі імкнуліся перашкодзіць тым, хто звяртаў увагу на сумныя старонкі нашай гісторыі і разбураў савецкія міфы.

Адзін з іх датычыцца партызанаў. Па афіцыйнай версіі, усе яны былі «белымі і пухнатымі». На самай жа справе гэта далёка не так. Дастаткова нагадаць вёску Дражна, якая месціцца каля Старых Дарогаў. У 1943 годзе на Вялікдзень савецкія партызаны спалілі там 37 хат і забілі 25 яе жыхароў толькі за тое, што з-за асабістага глупства не змаглі нічога зрабіць з размешчаным у вёсцы паліцэйскім батальёнам.

19 красавіка 2008 года актывісты «Мемарыялу» ўсталявалі там крыж Ефрасінні Полацкай. Літаральна на наступны дзень мясцовыя ўлады яго дэманталі, а праз пэўны час беларуская Феміда даволі жорстка пакарала некаторых з тых, хто меў непасрэднае дачыненне да акцыі. Так у «актыве» Вячаслава Сіўчыка з'явіліся «15 сутак за крыж».

Пакаранне, дарэчы, даволі сімвалічнае, бо крыж, які ён нясе па жыцці, многія зразумець не могуць.

АНАЛІЗ

# УСЕ МЯРКУЮЦЬ, А ЛУКАШЭНКА ВЫРАШАЕ

**Пасля абвастрэння беларуска-расійскіх адносінаў многія ўхапіліся за ідэю, што змены ўлады ў Беларусі адбудуцца пад патранажам Крамля. «Ці мае пад сабой грунт гэта ідэя?» — запыталася журналістка «НЧ» Вольга Хвоін у эксперта Рамана Якаўлеўскага.**

— Крэмль, як і Захад, нічога за беларусаў рабіць не будуць і не змогуць зрабіць. Дапамагчы могуць, але не больш. Што тычыцца электаральнай кампаніі, то я асабіста лічу, што гэта мерапрыемства пад назвай «выбары». Звярніце ўвагу, Аляксандр Лукашэнка ездзіць па Беларусі і раздае загады на некалькі гадоў наперад. То бок ён нават не думае пра сыход. Адзінае, што магчыма, гэта — другі тур выбараў. Але не думаю, што Лукашэнка тое дапусціць. Інтрыга толькі ў тым, колькі каму працэнтаў намалююць.

Дарэчы, старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына нагадала, што прадстаўнікі кандыдатаў не змогуць увайсці ў камісіі, якія займаюцца падлікам галасоў, бо розніца ў рэгістрацыі членаў камісій і кандыдатаў — 15 дзён. Вось так вынаходзяць для сябе вышэйшую матэматыку. Увогуле, што тычыцца выбараў і развіцця сітуацыі, то ўсе мяркуюць, а Лукашэнка вырашае. Гэта тычыцца і Масквы. Масква ўжо прызнае сваю памылку ў тым, што яна размаўляла толькі з Лукашэнкам, а трэба было шырэй, шукаць прарасійскі настроеных сярод наменклатуры. Тая параза, якую Крэмль у свой час пацярпеў ва Украіне, калі наслаў сваіх паліттэхнолагаў, мазгаведаў, сведчыць, што ў Расіі ёсць фізічная сіла, але бракуе інтэлектуальнай, аналітычнай, не хапае і аб'ектыўнай інфармацыі пра сітуацыі ў краіне.

Я згодны з Вінцуком Вячоркам, што гэтая перамога для першага прэзідэнта Беларусі можа стаць піравай. Калі кошт на газ будзе падняты да 250 долараў, то гэта пацягне за сабой рост цэн і гэтак далей. Дабрабыт, які базуецца на танных энерганосьбітах, хісткі, а гэта каталізатар да сацыяльнага выбуху. Калі гаварыць пра апазіцыю, то яна цяпер у нездавальняючым стане, максімальна раздробленая. Думаю, варта прыняць да ўвагі, што гады два таму гэты раздрай быў здзейснены досыць прафесійна.



— ***Такая колькасць кандыдатаў, якая ўжо існуе сёння, прывядзе да распылення галасоў, і другога туру не спатрэбіцца. І ўсё будзе на законных падставах.***

— Я б нагадаў, што ў 1937 годзе ўсіх расстрэльвалі па закону. Іншая справа, як гэта карэлявалася з правам. Заканадаўчая база ў Беларусі створаная для рэжыму, але ці адпавядае яна міжнародным стандартам, абавязальніцтвам? Напрыклад, былі заявы, што не існуе агульнапрынятых стандартаў выбараў АБСЕ, а наконт грамадзянскай супольнасці Аляксандр Рыгоравіч сказаў, што гэта розныя аб'яднанні кшталту філатэлістаў і рыбаловаў, а таксама мясцовыя саветы, пра рэальную функцыю якіх забыліся.

Адным з інструментаў перамены рукамі беларусаў можа быць варыянт, які сфармуляваў Пуцін: «Мы не будзем умешвацца. Беларусы самі разбяруцца». Я гэта ўспрымаю і так: бізнесменам беларускага паходжання, якія працуюць у Расіі, Крэмль фактычна дазволіў падтрымку сілаў, што могуць прывесці да перамен унутры нашай краіны. Я паважаю грамадзянскую пазіцыю шматлікіх кандыдатаў на пасаду прэзідэнта. Але ўсё, што адбываецца, разглядаю як палітычную батлейку. Не там ляжаць ключы. Без існай наменклатуры наўрад нешта адбудзецца. Бо не толькі ў Маскве ад Лукашэнкі стаміліся. Аляксандр Лукашэнка гаворыць пра лён і пытаецца ў чыноўнікаў, якая ў іх пасцельная бялізна, то што гэта за жарты? Прэм'ера Сідорскага я б не разглядаў як флагмана апазіцыйных настрояў у наменклатуры. Мяркую, што ў пераходны перыяд да свабодных выбараў можа аб'явіцца нехта з беглых генералаў, што апынуліся ў Маскве. Напрыклад, былы шэф КДБ Уладзімір Мацкевіч, які з'ехаў пасля скандалу са справаю зніклых апазіцыйных дзеячаў.

*P.S. Поўны варыянт аналізу палітычнай сітуацыі Раманам Якаўлеўскім чытайце ў наступным нумары*

ВЫБАРЫ–2010

# НА НІЗКІМ СТАРЦЕ

Вольга ХВОІН

**Брэнд мінулай прэзідэнцкай выбарчай кампаніі, праеўрапейскі і «адзіны», па ўласнаму жаданню выбыў з палітычнай гонкі. У шэрагах кандыдатаў у кандыдаты, на першы погляд, няма пустэчы. Але пры бліжэйшым разглядзе ўзнікае больш пытанняў, чым упэўненасці.**

## Расчараванне рамантыкаў

Аляксандр Мілінкевіч свае дакументы ў ЦВК не панясе. «Я падыходжу да кампаніі вельмі адказна, разумею сваю ролю ў палітычнай дзейнасці. Важна быць маральным і захоўваць твар. Менавіта тым, што я не іду на выбары, я падкрэсліваю гэта яшчэ раз. Не хачу ўдзельнічаць у спектаклі, дзе адзін рэжысёр, адзін сцэнарыст, адзін актор. Не хачу быць у ёй статыстам», — заявіў кіраўнік руху «За свабоду».

Палітык прызнаўся, што такое рашэнне далося яму няпроста, але ён запэўніў, што гэта не ёсць палітычнай смерцю, бо збіраецца працаваць на іншых кандыдатаў, якія стаяць на беларускіх, праеўрапейскіх пазіцыях, удзельнічаць у іх пікетах і сходах.

Мінулыя выбары натхнялі прыхільнікаў перамен масавымі акцыямі пратэсту, Плошчай, намётамі ў цэнтры сталіцы. Праўда, усё гэта было прафукана на раз. Аляксандр Мілінкевіч не выключае, што сёлета будзе другі дубль: «Мы ўсе разумеем, што калі няма выбараў, то Плошча — гэта працяг барацьбы за свабоду. Без вулічных акцый немагчыма ў аўтарытарнай краіне дамагацца свабоды. Але які будзе сцэнар Плошчы? Для нас вельмі важна, каб ён ствараўся ў Беларусі, не быў радыкальны. Мы ўсе прыхільнікі мірных спосабаў пратэсту. Будзем прымаць рашэнне па ходу кампаніі», — шматзначна паабяцаў палітык.



## Выбліск злева, выбліск справа

Аляксандр Мілінкевіч, Рыгор Кастусёў, Алег Новікаў, Алесь Міхалевіч, якія прадстаўляюць, адпаведна, Рух «За Свабоду», Партыю БНФ, Беларускую партыю «Зялёныя» ды Саюз «За мадэрнізацыю», падпісалі ў прысутнасці журналістаў пагадненне пра стварэнне «Беларускага выбару». Гэта палітычная кааліцыя будзе чарговай спробай яднання беларускіх грамадска-палітычных арганізацый, якія падзяляюць каштоўнасці незалежнасці, дэмакратыі і еўрапейскага выбару Беларусі. Мілінкевіч прызнаў, што папярэднія спробы прывесці апазіцыю да адзінага назоўніку (хаця многія бачылі ў гэтым памкненні ўнесці разлад), праваліліся.

Прэтэндэнт на пасаду прэзідэнта ад Аб'яднанай грамадзянскай партыі Яраслаў Раманчук поўны аптымізму і спадзяецца атрымаць у першым туры прэзідэнцкіх выбараў 30–35 працэнтаў галасоў выбаршчыкаў. Па словах прэтэндэнта, цяпер 95 працэнтаў свайго часу ён аддае на працу ўнутры краіны, і 5 працэнтаў на дзейнасць, якая скіраваная на лабіраванне ў міжнародных структурах, стварэнне міжнароднага іміджу. Яраслаў Раманчук расказаў, што падвысіць сваю пазнавальнасць ён плануе праз шматгранную інфармацыйную кампанію.

Яшчэ адзін прадстаўнік правых — Беларуская хрысціянская дэмакратыя — удзельнічаць у гешэфце пад назвай «Беларускі выбар» пакуль жадання не праявіў. Сустаршыня БХД і кандыдат у прэзідэнты ад гэтай партыі запэўнівае, што «зліву» пад іншых кандыдатаў не плануецца. Частка партыі БНФ і патэнцыйнага актыву Рыгора Костусева перайшла працаваць на Андрэя Саннікава.

Частка левых адмовілася ад удзелу ў прэзідэнцкай кампаніі з-за адсутнасці ў апазіцыі адзінай стратэгіі, адзінага кандыдата. Па інфармацыі БелаПАН, партыя «Справядлівы свет» пачынае кампанію «Справядлівыя выбары». «Мы накіруем свае рэсурсы на тое, каб сумесна з іншымі партыямі і грамадскімі арганізацыямі мабілізаваць актыўных і неабыякавых грамадзян, каб яны прынялі актыўны ўдзел у назіранні за выбарамі. Яны павінны самі прыняць удзел у кантролі за падлікам галасоў і спыненні спроб фальсіфікацыі выбараў», — патлумачыў лідэр партыі Сяргей Калякін. Разам з тым пленум партыі не забараніў яе чальцам працаваць у камандах іншых кандыдатаў у прэзідэнты.

## Справы замежныя. Фігуры цьмяныя

Тым часам у Польшчы з'явілася ініцыятыва з падтрымку лідэра кампаніі «Гавары праўду» Уладзіміра Някляева. Ліст з прапановай гуртавацца для працы на гэту фігуру разаслалі па электроннай пошце. Васіль Лепеш, які жыве ў Польшчы з 2007 года, расказаў, што цяпер ёсць мэта «падтрымаць кандыдата ў прэзідэнты, які мае найбольшыя шансы на перамогу; пакуль што такім для нас з'яўляецца Уладзімір Някляеў». Выбар палітыка аргументаваны тым, што акрамя Някляева ніхто з кандыдатаў не заявіў так гучна і ўпэўнена пра свой намер стаць прэзідэнтам на гэтых выбарах. «Ані ўласнага сайту, ані сур'ёзнай каманды ніхто больш не мае. Акрамя таго, так ці інакш кожны грамадзянін Беларусі сутыкаўся з творчасцю Някляева. Ягоныя песні спяваюць на вяселлях, а зала прыцiхае, калі ён чытае свае вершы. Менавіта такі чалавек мог бы аб'яднаць інтэлігенцыю і простых людзей», — гаворыць Васіль Лепеш. План працы ўжо падрыхтаваны: у першую чаргу дзейнасць будзе адбывацца каля беларуска-польскай мяжы, збор подпісаў, агітацыя, акцыі, накіраваныя на беларусаў, што перасякаюць мяжу. А гэта тысячы чалавек штодня.

У тыдзень падачы дакументаў у ЦВК на рэгістрацыю ініцыятыўных груп з'явілася кандыдатура з катэгорыі «цьмяных персонаў». Беспартыйны мінчанін Сяргей Іваноў абвясціў пра свой намер балатавацца ва ўласным блогу. Гэты кандыдат скончыў Тамбоўскую вышэйшую ваенную авіяцыйную інжынерную вучэльню. З 1994 па 2004 год праходзіў службу ў сілавых структурах Рэспублікі Беларусь. Звольніўся па ўласным жаданні. Падрабязнасці гэтага пункту біяграфіі не раскрываюцца. З 2004 года па 2009 год працаваў намеснікам дырэктара ў камерцыйнай арганізацыі. У праграме Іванова няма рэзкіх выпадаў на адрас Лукашэнкі, затое ёсць ідэі пабудовы грамадзянскай супольнасці, адраджэння «мовы тытульнай нацыі», рэформаў у палітычным, эканамічным жыцці.

Вялікая колькасць кандыдатаў зручная Лукашэнку. Галасы нязгодных распыляюцца, але большасць атрымае Аляксандр Рыгоравіч, прычым на законных умовах. То атрымліваецца, што раз'яднаная, шматаблічная апазіцыя разам з вядомым статыстам Гайдукевічам гуляе ў вароты рэжыму.

МЕРКАВАННЕ

# Радзім Гарэцкі: БЕЗ ФУНДАМЕНТАЛЬНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ НАВУКА ПАМІРАЕ

Вольга ХВОІН

**Навуковы асяродак — гэта іншасвет для большасці людзей. Падаецца, што навукоўцы — людзі, адораныя лёсам, абагрэтыя ўладай. Праўда, і навуковы свет далёкі ад дасканаласці. Чалавек можа пакласці жыццё і сілы на стварэнне ўласнага дзецішча, але атрымаць вынік, зусім не адпаведны сваім жаданням.**



Радзім Гарэцкі

*Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі — асоба знакавая і вядомая ў навуковых колах. Аўтарытэт гэтага чалавека, які многа зрабіў для айчыннай геалогіі, стаў прадаўжальнікам працы свайго бацькі, непахісны. Акадэмік мае паважаны ўзрост, але на працоўным месцы яго застаць не праблема. У 1977 годзе Радзім Гаўрылавіч быў абраны правадзейным членам АН БССР па спецыяльнасці «геалогія» і прызначаны дырэктарам Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР. Кіраваў інстытутам, які фактычна і стварыў, Гарэцкі на працягу 16 гадоў, аж да свайго абрання віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук Беларусі. Цяпер гэтага інстытута няма.*

— Пры Машэраве мы хацелі тут, ва Уруччы — і гэта было амаль узгоднена, — стварыць акадэмгарадок, з дамамі для навукоўцаў, універсітэтам. Мяркую, што было б вельмі добра, зручна для навукоўцаў. Але, калі развалíўся Саюз, усё пайшло інакш. Наш галоўны чыноўнік краіны калісьці, даруйце, выказаўся: «Толькі ўзяўся за яйкі, масла прапала». Вось ён узяўся і за навуку. Спачатку асцерагаўся, прыходзіў рэдка, а пасля асмялеў — бачыць, што акадэмікі, як і ўсе людзі, баязлівыя, і распачаў рэарганізацыю, якая і статуту Акадэміі навук супярэчыць. Кіраўніка Акадэміі навук заўжды абіралі навукоўцы, а ён пачаў прызначаць. Замест пасады прэзідэнта НАН была ўведзеная пасада старшыні, як у калгасе. Мы і паміж сабой так і жартуем «старшыня калгаса «Акадэмія навук». Галоўным кірункам стала прыкладная навука, каб нешта карыснае, практычнае гаспадарцы даваць. Усё гэта прывяло да таго, што быў прызначаны Міхаіл Мясніковіч. Ён добры чыноўнік, арганізатар, але ж не навуковец. Хаця і яго зразумець можна: паміж молатам і кавадлам. І там ціснуць, і мы тут пыхцім.

У час, калі я быў дырэктарам, у нас працавала блізу чатырохсот чалавек. І мы ўсе напрамкі навукі аб Зямлі закрывалі, вяліся фундаментальныя даследаванні, выдавецкая дзейнасць была шырокай. Але паціху ўсё прыкрылі. У нас былі агульныя працы з еўрапейскімі навукоўцамі, расійскімі. Гэта стала не цікава. Галоўнае — дзе зрабіць свідравіну, каб нафту атрымаць, і ўсё ў такім рэчышчы. Маўляў, мы бедная краіна, шукайце рэсурсы, бо нічога не маем. Але ж гэта няпраўда — ці не траціна бюджэту за кошт экспарту калійных соляў напаўняецца.

Каб прыкладная навука была шырокай, эфектыўнай, то геахімію, петралогію, вулканалогію, тэктоніку, стратаграфію скарацілі. Але без фундаментальных даследаванняў навука памірае. У развітых краінах на навуковую дзейнасць адлічваюць 4–6 працэнтаў ад ВУП. У нас гэты паказчык апусціўся да 0,8. Для навукі гэта капут. Бюджэтныя грошы нашага інстытута цяпер складаюць толькі 35–40 працэнтаў, астатняе самі зарабляем.

Калі Інстытут геахіміі і геафізікі ліквідавалі, то вырашылі супрацоўнікаў, якія засталіся, перадаць у Беларускі геолага-разведачны інстытут, які займаўся пошукам карысных выкапняў. А рэшту — чалавек дваццаць — пакінулі ў Інстытуце прыродакарыстання. Будынак нашага інстытута, які ўзводзілі пад маім кантролем, які мы дараблялі, даводзілі да ладу, аддалі ў падпарадкаванне Мінпрыроды. Чаму было не пакінуць у нашай уласнасці ды не здаваць яго ў арэнду? За гэтыя б грошы мы маглі жыць...

*Радзім Гаўрылавіч расказвае гісторыі ці не пра кожную рэч будынку, у якім працуюць навукоўцы. Кім былі падораныя пано, што ўпрыгожваюць лесвічныя пляцоўкі, як набывалі жырандолю ў фае, як сварыліся чыноўнікі за вітражнае шкло — маўляў, «царкву арганізавалі, а не інстытут».*

*Апроч Інстытута геахіміі і геафізікі была і ёсць яшчэ адна ідэя ў акадэміка: музей геалогіі, музей валуноў. Апошні, да слова, яшчэ хацеў стварыць бацька Радзіма Гарэцкага акадэмік Акадэміі навук Беларусі Гаўрыла Іванавіч Гарэцкі. Ён жа быў ініцыятарам* вывучэння ледавіковых валуноў напрыканцы 1970-х гадоў. Калі стваралі калгасы, то валуны, каб яны не заміналі сельскагаспадарчым працам, падрывалі. Але ж валуны ў Беларусі — не проста камяні. Яшчэ на пачатку мінулага стагоддзя да іх хадзілі маліцца, ім пакланяліся, насілі *ахвяраванні, прасілі дапамогі. Валуны неслі сакральную, культурніцкую функцыю. Да пачатку будаўніцтва Эксперыментальнай базы ва Уруччы ў 1982 годзе было прывезена больш за 2 000 валуноў. У 1989 годзе база была абвешчана дзяржаўным геалагічным помнікам прыроды. Сюды з усёй тэрыторыі Беларусі звезеныя камяні, якія найбольш характэрныя для кожнага раёна, з'яўляюцца эталоннымі прыроднымі аб'ектамі.*

— Ідэя стварыць геалагічны музей таксама сышла ў нябыт. Пэўны час старшынёй Савета міністраў быў спадар Кавалёў, ён пабачыў наш музей валуноў ды пачаў абурацца: «Што вы тут камянёў навалілі, мы б тут дамы пабудавалі. Каб за тыдзень усё вывезлі!» А да гэтага тут было балота, смецце, звалка. Прыехалі людзі з ЦК, намеснік старшыні Савета міністраў. Мы тлумачылі ім свае задумы, урэшце адваявалі тэрыторыю. Хаця пагражалі мяне з партыі выключыць і ледзь не з пасады дырэктара выгнаць.

Музей валуноў мы «прабілі» яшчэ ў савецкі час, ідэю падтрымаў былы кіраўнік Акадэміі навук Мікалай Барысевіч. Ён нават удзельнічаў ва ўстаноўцы першага валуна, які мы прывезлі з Аксакаўшчыны пад Мінскам. Ідэя была глабальная: не проста зрабіць карту Беларусі, навазіць валуноў, але і пабудаваць геалагічны музей з аглядной пляцоўкай, стварыць антураж ледавіковага перыяду. Гэта былі б цікавыя для студэнтаў, школьнікаў аб'екты. Але фінансаванне скончылася, а на адным энтузіязме многа не створыш. Мы доўга дамагаліся, каб Музей валуноў узялі на баланс хаця б гарадскія ўлады ды глядзелі за парадкам у ім.

Увогуле, раней у Інстытуце геахіміі і геафізікі быў шэраг навукоўцаў, якія займаліся вывучэннем камянёў Беларусі. Адзін з нашых супрацоўнікаў — Эдвард Ляўкоў — у 1992 годзе выдаў кнігу «Маўклівыя сведкі мінуўшчыны», дзе сабрана многа матэрыялу пра валуны Беларусі, іх культурнае значэнне, геалагічную гісторыю. У 1993 годзе калектыў аўтараў-навукоўцаў выдаў кнігу «Ледавіковыя валуны Беларусі: Эксперыментальная база вывучэння валуноў». За савецкім часам атрымаць статус музея было складана, працэдура патрабавала ўзгаднення праз Маскву, і навукоўцы вырашылі абыйсці бюракратычныя працэдуры ды назвалі музей валуноў ва Уруччы «эксперыментальнай базай».

Цяпер наш невялікі калектыў у Інстытуце прыродакарыстання збольшага займаецца экспертнымі ацэнкамі розных праектаў, нам для разгляду прыносяць бясконцыя авантурныя прапановы. От нядаўна ацэньвалі ідэю расіян, якія прапанавалі зрабіць свідравіну на сем кіламетраў пад Гродна і атрымаць фантаны нафты. Гэта, канешне, глупства чыстай вады, да таго ж надта затратнае. Наша начальства з энтузіязмам глядзіць на падобныя праекты, а мы ім рацыянальна спрабуем патлумачыць бесперспектыўнасць такіх ідэй.

Таксама мы рабілі экспертную ацэнку пляцоўкі пад будаўніцтва атамнай станцыі. З геалагічнага боку ўсе чатыры пляцоўкі, якія распрацоўвалі, падыходзяць. Але рашэнне будаваць станцыю збольшага палітычнае, бо лічу немэтазгодным будаўніцтва на Астравеччыне. І Нарач побач, і Паазер'е. Калі б зрабілі добрую рэкрэацыйную інфраструктуру, то маглі б атрымліваць нямала прыбытку, а як пабудуюць АЭС, то хто туды паедзе адпачываць?

Размовы пра хібнасць ідэі рэарганізаваць наш інстытут перыядычна ўздымаюцца. Былы старшыня Прэзідыўма НАН Беларусі Міхаіл Мясніковіч на агульным сходзе Акадэміі нават прызнаў, што разгон Інстытута геахіміі і геафізікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі быў памылкай. Але разваліць прасцей, чым аднавіць. Многія спецыялісты пазвальняліся, маладых кадраў няма, большасць — людзі сталага веку. Калі малады спецыяліст прыйдзе да нас, то заробак яго будзе чатырыста тысяч, а калі пойдзе на вытворчасць, то заробіць паўтара мільёна рублёў і больш. Так і атрымліваецца, што пакруцяцца маладыя — і збягаюць ад нас. У галіновым часопісе «Літасфера» не так даўно быў надрукаваны артыкул «Праблемы геалагічнага вывучэння нетраў Беларусі», у ім мы апісалі ўсе недахопы нашай працы. Цяпер на нас чыноўнікі лаюцца, бо праўду ніхто не любіць.

**Без фундаментальных даследаванняў навука памірае. У развітых краінах на навуковую дзейнасць адлічваюць 4–6 працэнтаў ад ВУП. У нас гэты паказчык апусціўся да 0,8**



Парк камянёў пры Інстытуце геалогіі

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 27 ВЕРАСНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.20** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.40, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.45** Слова Мітрапаліта Філарэта.
**09.05** Серыял «Ганначка» (Расія).
**10.00** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**11.00** Серыял «Апошні кардон» (Расія).
**12.10** Сямейная камедыя «Хільдэгардэ».
**13.45** «OFF STAGE LIFE».
**14.05** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм «Лічбавыя наркотыкі».
**15.55** Меладраматычны серыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу» (Расія).
**16.45** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.45** Серыял «Апошні кардон» (Расія).
**18.50, 01.20** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна».
**19.55** Серыял «Ганначка» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.55** Адмысловы рэпартаж АТН «Печкі-лавачкі».
**22.10** Серыял «Апостал» (Расія).
**23.35** Крымінальны трылер «Ідэальнае рабаванне» (Вялікабрытанія).
**01.25** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10, 01.15** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Жыць здорава!».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Шальны анёл». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Дзікі маладняк».
**16.45** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: Ток-шоў «Выбар».
**22.10** Прэм'ера. «Галасы».
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Галасы». Працяг.
**00.25** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.25** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень». І
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Фантастычныя гісторыі».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Мінчшына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Фільм «Жага». Расія, 2006 г.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «Каралі вуліц». ЗША, 2008 г.

### ЛАД

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака».
**09.05** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.05** Джэймс Бонд - Агент 007. Баявік (Вялікабрытанія).
**12.05** Пра мастацтва.
**12.30** Школа рамонту.
**13.35** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.30** Пазакласная гадзіна.
**14.40** Тэлебарометр.
**15.00** Простыя практыкаванні (Расія).
**15.35** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.25** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака».
**17.30** Жаночая ліга.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Камедыя «Сем старых і адна дзяўчына» (СССР).
**20.45** Калыханка.
**21.05** Тэлебарометр.
**21.10** Беларуская часіна.
**22.15** Прэм'ера. Камедыйны серыял «Інтэрны» (Расія).
**22.55** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.25** Авертайм.
**23.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**00.50** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.25** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.25** «Фатальны трыкутнік. Ісаак Бабель». Дакументальны фільм.
**12.15** Рамантычная камедыя «Вялікае каханне».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.10** «Пакой смеху».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.25** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**20.25** Тэлесерыял «Земскі доктар». Расія.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Тэлесерыял «Восеньскі дэтэктыў».
**23.50** «Нічога асабістага».
**00.05** Навіны - Беларусь.
**00.15** «Весткі.ru».
**00.30** «Каралева тыграў. Маргарыта Назарава». Дакументальны фільм.

### НТВ

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Мама ў вялікім горадзе».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**13.00** Сёння.
**13.30** Гістарычны серыял «Спадары прысяжныя».
**15.10** «Цуд-людзі».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Баявік «Марскія д'яблы».
**21.40** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.30** Сёння.
**23.55** «Сумленны панядзелак».
**00.45** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** Тэніс. Турнір WTA (Японія). Дзень 1.
**11.00** Тэніс. Турнір WTA (Японія). Дзень 1.
**14.45** Супербайк. Чэмпіянат свету. Імола (Італія). Заезд 2.
**15.45** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. + 105 кг. Анталія (Турцыя).
**16.45** Снукер. Адкрыты чэмпіянат свету. Глазга (Вялікабрытанія). Фінал.
**18.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Жанчыны. Трынідад і Табага. Фінал.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**21.15** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. + 105 кг. Анталія (Турцыя).
**21.50** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**01.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. + 105 кг. Анталія (Турцыя).
**01.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Мікалай Радзівіл Чорны».
**07.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**07.55** ПраСвет.
**08.20** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Смак Ямайкі».
**08.45** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**09.05** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.20** Басанож па свеце: «Горад у джунглях».
**09.45** Дакументальная гадзіна: «Крызіс у раі», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**10.45, 17.35** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 13 серыя.
**11.30** Фільматэка майстроў: «Падарожжа ў прэрыі», маст. фільм, 2006 г., ЗША.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Тры шалёныя нулі», тэлесерыял.
**18.20** Госць «Белсату».
**18.40** Невядомая Беларусь: «Як пошуг маланкі», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**19.10** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.25** Калыханка для самых маленькіх.
**19.35** Еўропа сёння.
**20.00** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «З выцягнутымі рукамі», дак. фільм, Польшча: ч. 1.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**21.45** Фільматэка майстроў: «Падарожжа ў прэрыі», маст. фільм, 2006 г., ЗША.
**23.30** Аб'ектыў.

## 28 ВЕРАСНЯ, АЎТОРАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.05** Серыял «Ганначка» (Расія).
**10.00** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.55** Серыял «Апошні кардон» (Расія).
**12.10** Прэм'ера. Меладрама «Важкая падстава для забойства» (Украіна). 1-я серыя.
**13.45** Адмысловы рэпартаж АТН «Печкі-лавачкі».
**14.05** «Эпоха».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Здароўе.
**15.55** Меладраматычны серыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу» (Расія).
**16.45** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.45** Серыял «Апошні кардон» (Расія).
**18.50, 23.55** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Сфера інтэрасаў».
**19.55** Серыял «Ганначка» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Чэлсі»-»Марсэль». Прамая трансляцыя.
**00.05** Дзень спорту.
**00.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд.
**01.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Аякс»-»Мілан».

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10, 00.55** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.15** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Шальны анёл». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Уцёкі».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Уцёкі».
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Несакрэтныя матэрыялы».
**00.05** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.10** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінчшына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм «Жага». Расія, 2006 г.
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** Прэм'ера. «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял.
**15.40** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Мінчшына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Жорсткі бізнэс». Серыял.
**21.25** Прэм'ера! «Пяць хвілін».
**21.30** «Вялікі горад».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** Прэм'ера! Фінальны турнір тэлевізійнай гульні «Брэйн рынг».
**23.55** Прэм'ера! «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

### ЛАД

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны» (Расія).
**08.35** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака».
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**11.35** Авертайм.
**12.10** Камедыя «Сем старых і адна дзяўчына» (СССР).
**13.35** «Запал па культуры».
**14.15** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**15.15** Пазакласная гадзіна.
**15.30** Простыя практыкаванні (Расія).
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.55** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака».
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Камедыя «Жаніцьба Бальзамінава».
**20.50** Калыханка.
**21.10** Тэлебарометр.
**21.15** Беларуская часіна.
**22.20** Камедыйны серыял «Інтэрны» (Расія).
**23.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.35** «Спорт-кадр».
**00.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Непаўналетнія забойцы. Хто вінаваты?» Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Нічога асабістага».
**11.40** «Кулагін і партнёры».
**12.10** Тэлесерыял «Земскі доктар». Расія.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.05** «Формула кахання». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.25** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**20.25** Тэлесерыял «Земскі доктар». Расія.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Тэлесерыял «Восеньскі дэтэктыў».
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі.ru».
**00.15** «Лебядзіная песня Яўгенія Мартынава». Дакументальны фільм.

### НТВ

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.45** «Следства вялі…».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Кватэрнае пытанне».
**11.20** «Жаночы погляд».
**12.05** Дэтэктыўны серыял «Угро».
**13.00** Сёння.
**13.30** Гістарычны серыял «Спадары прысяжныя».
**15.10** «Жывуць жа людзі!».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.25** Футбол. Ліга Чэмпіёнаў УЕФА. Спартак (Масква)-Жыліна (Славакія).
**21.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.25** Сёння.
**23.50** «Савецкая ўлада».
**00.35** «Асаблівa небяспечны!».

### EUROSPORT

**09.35** Тэніс. Турнір WTA (Японія). Дзень 2.
**11.00** Тэніс. Турнір WTA (Японія). Дзень 2.
**14.45** Снукер. Адкрыты чэмпіянат свету. Глазга (Вялікабрытанія). Фінал.
**16.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**17.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**19.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. + 105 кг. Анталія (Турцыя).
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**21.00** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі WBO. Германія.
**23.00** Конны спорт. Сусветныя конныя гульні. Камандныя спаборніцтвы. Выездка. Фінал. Кентукі (ЗША).
**01.30** Супербайк. Чэмпіянат свету. Імола (Італія). Заезд 2.
**02.15** Матаспартыўны часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.50** Госць «Белсату».
**08.05** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**08.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «З выцягнутымі рукамі», дак. фільм, 2006 г., Польшча: ч. 1.
**09.25** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**09.40** Невядомая Беларусь: «Як пошуг маланкі», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**10.10** «Тры шалёныя нулі», тэлесерыял: 10 серыя.
**10.40** «Тата», маст. фільм, 1995 г., Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Тры шалёныя нулі», тэлесерыял.
**17.35** «Кансультацыі ў ружовым садзе», серыял: 4 серыя.
**18.25** «Бульбаны», мультсерыял: «Сельскагаспадарчая праца».
**18.30** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.45** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**19.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Мікалай Радзівіл Чорны».
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Праект «Будучыня».
**20.05** ПраСвет.
**20.35** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.45** Хто ёсць кім?: Вольга Іпатава.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Асабісты капітал.
**21.40** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: 4 серыя: «У пошуках Гандзі».
**22.35** Рэпартэр (публіцыстычна-інфармацыйная праграма).
**23.00** «Доктар Марцін», серыял: 4 серыя.
**23.45** Аб'ектыў.

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №9 (47) (верасень)

www.litbel.org www. novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


Анонс


«САЮЗ»: новыя выданні і старыя клопаты літжыцця ........ с. 2
«ПАЭЗІЯ»: новыя вершы Сяргея ЗАКОННІКАВА ........ с. 3
«ПРОЗА»: «Пляванне ў столь» Яна ЗБАЖЫНЫ ........ с. 4–5
«ПАЭЗІЯ»: вершы Уладзіміра ПАЎЛАВА ........ с. 6
«КРЭЎНАСЦЬ»: эсэ Алены ЛІТВІНОЙ (МАЦЯШ) і прысвячэнні Маі ЛЬВОВІЧ ........ с. 7
«ЧЫТАЛЬНЯ»: старонкі новай аповесці Артура КЛІНАВА «Шалом» ........ с. 8–9
«ПАЭЗІЯ»: «Украінскі гасцінец» (Д.ПАЎЛЫЧКА, Г.КІРПА, А.СЕНАТОВІЧ, Н.ПАЗНЯК) ........ с. 10
«ПАЭЗІЯ»: пераклады «завейнага» Паўло ВОЛЬВАЧА і «ваярскага» Восіпа МАКАВЕЯ ........ с. 11
«ІНТЭРВ'Ю»: Святлана АЛЕКСІЕВІЧ пра сябе і час ........ с. 12
«РАЗВІТАННЕ»: абразкі Вячаслава ДУБІНКІ ........ с. 13
«ШКАЛЯРЫЙ»: новыя гістарычныя аповеды для дзяцей ад Уладзіміра АРЛОВА ........ с. 14–15
«ЗАПІСЫ»: славенскія вандроўкі Ніла ГІЛЕВІЧА ........ 16


ВЕРШЫ



# ПАЦЕРКІ БОЖАЙ МАЦІ

НІЛ ГІЛЕВІЧ

## Пасланне мяккага знака

*Акадэміку І.І.З.*

*Шаноўны пане акадэмік!*
*Ты мусіш ведаць, што пісьмо*
*Пасьля працяглых эпідэмій*
*Аздараўляецца само.*

*Згадайма страшны трыццаць трэці:*
*Калі ствараўся ў нас эдэм,*
*Я быў прысуджаны да сьмерці,*
*Як «урэдзіцель» і «нацдэм».*

*Аднак жа выжыў. Убярогся.*
*Жывучы братка беларус!*
*Як беларус і ў працу ўпрогся.*
*Таму — цяпер мяне не руш!*

*Ці ты пярэваратнем стаўся*
*І ў адрачэнні чуеш смак,*
*Што перад Богам не збаяўся*
*Падняць руку на Мяккі Знак?*

*Я ж не вараг, не самазванец —*
*Я пераняты з Божых губ.*
*Я той у мове, з кім не зманіць*
*Ніводзін, мне падлеглы, гук.*

*Ты ж бачыш, як я тут дарэчы,*
*Як я патрэбен тут, дзе ёсьць.*
*Нашто ж бяздумна так калечыш*
*Крывіцкай мовы прыгажосьць?*

*Ёй без мяне нішто няўцешна:*
*І свет не сьвет, і снег не сьнег,*
*І песня ўжо не наша песьня,*
*І смех ужо не наскі сьмех.*

*Тойсамы ў слове зьмест нібыта,*
*Агульны сэнс таксама той.*
*А дзе душа? Душа забіта.*
*Бо я і быў яго душой.*

**2009–2010**

## Эпоха і народ

*Чым пачыналася эпоха,*
*Тым і слядуе ўласны ход:*
*За катастрофай — катастрофа,*
*Па закалоце — закалот.*

*А што народ наш паспаліты?*
*Як жыў? Як дуж? Што цягне ў рот?*
*Скажу адно: таленавіты*
*Да непрыстойнасці народ!*

**2010**

***

*Браты! Пачуйце! Каб бясслаўна*
*Сябе навек не загубіць —*
*У нас адзінаю дзяржаўнай*
*Павінна наша мова быць!*

*Не разумееце? А што ж тут*
*Не ясна? Што тут разумець?*
*Калі народ не знае кошту*
*Свайго жыцця — народу смерць.*

**2010**

## Пацеркі Божай Маці

*Пустаплясы на «сцішочным» выгане,*
*Запісныя выскалякі ў слове,*
*Зразумеўшы, што ім сёння выгадна —*
*На трагічным душ людскіх разломе, —*
*Выскубаюць, падбіраюць пацепкі,*
*Каб уволю мець пітва з закускай…*

*А на шыі Божай Маці пацеркі —*
*З самацветаў мовы беларускай.*

**2010, жнівень**

## Амаль Рубаі

*«Сябры маіх сяброў — мае сябры», —*
*Вяшчае мудрасць з даўняе пары.*
*Ах, мудрацы! А мой найподлы вораг —*
*Так-так! Ну-ну! — ён чый сябрук стары?*

**2010**

## Санет філолагам

***Да 70-годдзя філфака БДУ***

*На вашу долю выпаў Божы дар —*
*Любіць і адчуваць і ведаць Слова,*
*І разумець, што ўсё жыве часова*
*Пад ласкай сонца і няласкай хмар,*

*Адно Яно — на ўвесь зямны абшар*
*Людской душы апека і ахова —*
*Не памірае! — як бы лёс сурова*
*Ні насылаў за ўдарам зноў удар.*

*Запомнім жа, сябры: няма нічога*
*Свяцей за Слова вешчае ад Бога.*
*Сярод няпраўдаў, крыўдаў і нягод*
*У ім — праўдзівым, добрым, чыстым, светлым,*
*У ім — нятленным, вечным, запаветным*
*Наш Паратунак, наш святы Зыход.*

**3.12.2009**

## Рабіць дабро, дарыць святло!

***Песня валанцёра***

*Я — валанцёр. Маё прызванне —*
*Рабіць дабро, дарыць святло,*
*Цяплом душы дзяліцца з вамі,*
*Туліць бяздольных пад крыло.*

*У чалавечай грамадзе*
*Я не цямрэц — мяне вядзе,*
*Мне свеціць зорка валанцёра.*
*Бяздушна я не абыду*
*Таго, хто трапіў у бяду,*
*Каго ў жыцці спасцігла гора.*

*Я — валанцёр. Дэвіз мой ясны:*
*«Не запазніся памагчы!»*
*Мне боль чужы — як мой уласны*
*Сардэчны прыступ уначы.*

*У чалавечай грамадзе*
*Я не цямрэц — мяне вядзе,*
*Мне свеціць зорка валанцёра.*
*Бяздушна я не абыду*
*Таго, хто трапіў у бяду,*
*Каго ў жыцці спасцігла гора.*

*Я — валанцёр. Мне з ласкі Божай*
*Дастаўся гэты дар любві,*
*Каб насупор злабе варожай*
*Я дбаў пра згоду між людзьмі.*

*У чалавечай грамадзе*
*Няслава-ганьба не ўспадзе*
*На чэсць і гонар валанцёра.*
*Бяздушна я не абыду*
*Таго, хто трапіў у бяду,*
*Каго ў жыцці спасцігла гора.*

***

*І я жыву…*
*Жыву таму, што знаю:*
*Усе мае грахі перад табой*
*Перамагла і на парозе раю*
*Не ўспомніла пра іх твая любоў.*

**1 ліпеня 2010 г.**

**30 верасня народны паэт Беларусі Ніл Сымонавіч Гілевіч святкуе свой дзень народзінаў. Сакратарыят Саюза беларускіх пісьменнікаў, рэдакцыя «Новага часу» і літдадатак «Літаратурная Беларусь» віншуюць свайго пашанотнага сябра ды сталага аўтара і жадаюць здароўя, душэўнага спакою і спраўджвання яго галоўнай чалавечай мары: пажыць у беларускай Беларусі!**

**Нататкі Н.С.Гілевіча чытайце на стр. 24 (16).**

▸ АФІЦЫЙНА

# ЗАЯВА

## РАДЫ ГРАМАДСКАГА АБ'ЯДНАННЯ «САЮЗ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ»



Photo.ByMedia.Net

**У газеце «Народная воля»за 7–9 верасня г.г. апублікаваны артыкул «Мільянеры-жабракі, або Дзіўнае існаванне Саюза беларускіх пісьменнікаў» Эрнэста Ялугіна, Віктара Хурсіка і Алеся Данільчыка. Выкладзеныя меркаванні аўтараў, якія свой публічны акт назвалі «дэмакратычным учынкам», маюць фальсіфікацыйны характар і накіраваныя на дыскрэдытацыю старэйшай творчай арганізацыі Беларусі і яе кіраўніцтва.**

Аўтары артыкула, згадваючы колішняе жыццё пісьменнікаў-«мільянераў», усю віну і адказнасць за сучаснае «жабрацкае» становішча літаратараў ускладаюць на цяперашняга кіраўніка Саюза беларускіх пісьменнікаў Алеся Пашкевіча, абвінавачваючы яго і ў «здачы» Дома літаратара, і ў адсутнасці ў нашай творчай арганізацыі сваіх літаратурных часопісаў, і ў ліквідацыі Беллітфонда, які ён, нібыта, «парушаючы і статутныя нормы, і элементарную інтэлігенцкую прыстойнасць», узначаліў.

Рада Саюза беларускіх пісьменнікаў мусіць нагадаць аўтарам «выкрывальніцкага» артыкула і ўведзеным у зман чытачам «Народнай волі» аб тым, што і Дом літаратара ў цэнтры Мінска, і суседні будынак пісьменніцкай паліклінікі, і Дом творчасці «Іслач», і літаратурныя часопісы «Полымя», «Маладосць», «Нёман», «Крыніца», «Беларусь», і штотыднёвік «Літаратура і мастацтва», заснавальнікам якіх дзесяцігоддзі было нашае аб'яднанне, за апошнія пятнаццаць гадоў у Саюза беларускіх пісьменнікаў (як і саму яго назву: «Саюз пісьменнікаў Беларусі») адабрала дзяржава. Адабрала сваімі распараджэннямі і судамі, прычым большасць з гэтых ганебных падзей здарылася да таго, як СБП узначаліў Алесь Пашкевіч. Аб гэтым сведчыць хроніка, якую даносілі да грамадства ў першую чаргу незалежныя выданні, у тым ліку і «Народная воля».

Тым не менш, апынуўшыся ў найскладаных умовах, калі Вярхоўны суд нават разглядаў позву Міністэрства юстыцыі аб ліквідацыі Саюза беларускіх пісьменнікаў, калі міністр адукацыі распаўсюдзіў распараджэнне аб забароне выступленняў яго членаў у школах і вну і калі чыноўніцкай сваволяй за членства ў прафесійнай творчай арганізацыі беларускіх пісьменнікаў загадвалася звальняць з працы, — наш Саюз выстаяў. Больш за тое, ён стварыў свой перыядычны друкаваны орган — незалежны дадатак «Літаратурная Беларусь» да штотыднёвіка «Новы час», заснаваў і выдае сваю кніжную серыю, толькі за апошнія два гады змог правесці каля паўтары тысячы сустрэч пісьменнікаў з чытачамі амаль ва ўсіх рэгіёнах краіны. Ён умацаваў творчыя кантакты з пісьменніцкімі саюзамі Еўропы, стаў членам Еўрапейскай Пісьменніцкай Рады, Міжнароднай асацыяцыі пісьменніцкіх саюзаў «Слова без межаў» і Балтыйскай пісьменніцкай асацыяцыі.

Менавіта цяперашняе кіраўніцтва наладзіла перарваныя стасункі з праваправаемнікамі Саюза пісьменнікаў СССР і Літфонда СССР (Міжнародная супольнасць пісьменніцкіх саюзаў (МСПС) і Міжнародны літаратурны фонд). Больш за тое — старэйшына савецкай літаратуры Сяргей Міхалкоў не раз выступаў з лістамі-зваротамі да кіраўніцтва краіны ў падтрымку «апальнага» Саюза беларускіх пісьменнікаў. Дзякуючы Міжнароднаму літфонду Беллітфонд меў матэрыяльную падтрымку беларускіх літаратараў. Былі прафінансаваныя выданні кнігі народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава «Парадоксы жыцця / Парадоксы жизни» і, часткова, адзін з тамоў яго Поўнага збору твораў. І толькі тады, калі новы старшыня МСПС і Міжнароднага літфонда Іван Пераверзін, абраны пасля зыходу Сяргея Міхалкова, заплюшчыў вочы на незаконны пераслед беларускіх літаратараў і ўзяў удзел у заснаванні ў Мінску так званага Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, нават не праінфармаваўшы аб сваіх намерах аднаго з сузаснавальнікаў — Саюз беларускіх пісьменнікаў, кантакты з ім перапыніліся. Так было ў сапраўднасці, а не так, як напісалі аўтары публікацыі: «Сваволле, самаўпэўненасць старшыні СБП не атрымалі і не атрымліваюць належнай крытычнай ацэнкі з боку рады. Гэта падштурхоўвае яго да здрады інтарэсам арганізацыі. З-за яго асабістых амбіцый страчана традыцыйнае супрацоўніцтва з пісьменніцкімі арганізацыямі ў Маскве — Міжнародным літаратурным фондам і Міжнароднай супольнасцю пісьменніцкіх саюзаў».

Дарэчы, пра «сваволле і самаўпэўненасць». Алеся Пашкевіча абвінавачваюць у «пераварoце, учыненым змоўшчыкамі» — у абранні падчас мінулага з'езда СБП на пасаду старшыні Беллітфонда. Мусім нагадаць, што падобнае — адначасовае правядзенне з'ездаў СБП і Беллітфонда — практыкавалася і ў мінулыя часы, паколькі члены гэтых арганізацый — адны і тыя ж асобы. Мы не можам зразумець, з якіх крыніц чэрпалі аўтары артыкула інфармацыю аб тым, што «Рада не прыняла рашэнне аб сумяшчальніцтве. Адмоўна наконт сумяшчэння пасад выказалася таксама большасць членаў праўлення Беллітфонду», а сам з'езд пісьменнікаў, маўляў, быў «нязвычна нервовы, скамечаны, хутчэй падобны на дылетанцкі палітычны мітынг», падчас якога старэйшыны літаратуры з месца раілі «не гарачыцца». Нагадаем, што па статуце Беллітфонда старшыня мог быць абраным і на пасяджэнні Праўлення. Тым не менш, Алесь Пашкевіч вынес гэтае пытанне на вырашэнне ўсёй грамады, якой і быў дэмакратычна абраны старшынём Праўлення Беллітфонда. Вось толькі ці змогуць аўтары артыкула адказаць, што падштурхнула былога,«аддана працаваўшага» старшыню Літфонда пайсці пасля гэтага ў Мінюст з заявай-пасквілем? Вынікам стала праверка Міністэрства юстыцыі. Насуперак чаканням «дабразычліўцаў» абранне Алеся Пашкевіча на пасаду было прызнана правамоцным.

Зрэшты, функцыі старшыні Праўлення Беллітфонда па статуце — прадстаўнічыя. Ён не меў права банкаўскага подпісу. Рэальнай адміністрацыйнай уладай быў надзелены дырэктар Беллітфонда, на той час — Віктар Хурсік, адзін з аўтараў «выкрывальніцкага» артыкула, які на згаданым з'ездзе наабяцаў пісьменнікам залатыя горы, а сам праз месяц сыйшоў, пакінуўшы разграбаць «канюшні» іншым. Кур'ёзнасць сітуацыі і ў тым, што ягоным наступнікам на дырэктарскай пасадзе стаў трэці «падпісант» артыкула — Алесь Данільчык, пры якім Беллітфонд быў ліквідаваны і з аўкцыёну быў прададзены санаторый-прафілакторый пісьменнікаў «Іслач». А сёння яны ж, звальваючы ўсе магчымыя і немагчымыя грахі на Алеся Пашкевіча, нахабна пытаюць: «А дзе ж атрыманыя за продаж санаторыя грошы?».

Грошы — на рахунку ліквідацыйнай камісіі на чале з намеснікам старшыні Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па маёмасці. Высвятленне іх лёсу — нашыя агульныя клопат і задача. Прасцей, вядома, шукаць іх у чужой кішэні. Так, за сваю працу на пасадзе старшыні праўлення Беллітфонда, паводле загада дырэктара, Алесь Пашкевіч атрымаў — праз паўтары гады нявыплаты — заробак. Аб тым «са смакам» паведамляюць аўтары «Дзіўнага існавання…». Але чаму яны не згадалі і аб тым, што заробкі атрымалі і каля двух дзясяткаў супрацоўнікаў Беллітфонда — за ўсе мінулыя гады, а сярод іх — і былыя дырэктары Беллітфонда, аўтары артыкула Віктар Хурсік і Алесь Данільчык?! Пры гэтым сакратарыят Саюза беларускіх пісьменнікаў (старшыня і намеснікі) ад часу абрання ў 2002 годзе працуе на грамадскіх пачатках і аніякіх грашовых выплат не атрымліваў.

Мусім праінфармаваць, што агучаныя ў артыкуле «Мільянеры-жабракі, або Дзіўнае існаванне Саюза беларускіх пісьменнікаў» «факты» пасля адпаведнага звароту старшыні Рэвізійнай камісіі Васіля Якавенкі былі разгледжаныя на мінулым пасяджэнні нашай Рады, на якой старшыня Алесь Пашкевіч па кожнай з «прэтэнзій» даў падрабязную інфармацыю і быў падтрыманы сябрамі Рады.

Недарэчнымі выглядаюць і закіды адносна стварэння мемарыяльнага пакоя Максіма Танка і годнага захавання карцін, кніг і фотапартрэтаў у Доме літаратара, бо той Дом і адпаведна маёмасць у ім не належаць нашаму аб'яднанню.

І пра апошні «злачынны крок» старшыні нашага Саюза (які, зрэшты, не мае дачынення да дзейнасці Саюза беларускіх пісьменнікаў) — «прысвойванне» сродкаў на выданне кнігі пра Барыса Кіта. Удакладняем: згаданыя ў артыкуле сродкі фундатар вырашыў патраціць на выданне юбілейнага альбома ў гонар славутага беларуса. Кніга ўкладаецца і неўзабаве выйдзе ў свет.

Зразумела, у нялёгкіх умовах працы кіраўніцтву Саюза беларускіх пісьменнікаў не ўсё ўдаецца зрабіць і ажыццявіць. Тым не менш, Рада заяўляе аб сваёй падтрымцы дзейнасці старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў Алеся Пашкевіча. У з'яўленні артыкула «Мільянеры-жабракі, або Дзіўнае існаванне Саюза беларускіх пісьменнікаў» мы бачым сплanаваную спробу дыскрэдытацыі Рады і дзейнасці найстарэйшай творчай арганізацыі, свайго роду сімвала беларушчыны і нацыянальнага мастацкага слова — Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Застаецца адкрытым пытанне: каму насамрэч быў патрэбны згаданы артыкул, каму гэта выгадна?

**Прынятая 14 верасня 2010 года**

**Ніл Гілевіч,** народны паэт Беларусі
**Эдуард Акулін,** намеснік старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў
**Уладзімір Арлоў**
**Лявон Баршчэўскі**
**Генадзь Бураўкін,** лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі
**Анатоль Вярцінскі,** лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі
**Леанід Дранько-Майсюк**
**Генрых Далідовіч,** лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі
**Сяргей Законнікаў,** лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі
**Васіль Зуёнак,** лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі
**Віктар Казько,** лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі
**Анатоль Кудравец,** лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі
**Уладзімір Някляеў,** лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі
**Барыс Пятровіч (Сачанка),** намеснік старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў
**Міхась Скобла,** намеснік старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў
**Кастусь Цвірка**

## ▼ ЛІТДРУК

**Выйшлі ў свет чарговыя незалежныя літаратурныя часопісы — жнівеньскі «Дзеяслоў» (№47) і восеньскі «Верасень» (№2).**




«Дзеяслоў» знаёміць з раманам Л.Рублеўскай «Сутарэнні Ромула», аповесцю Л.Дранько-Майсюка, апавяданнямі П.Анціпава і А.Упалы, вершамі І.Кулікова, В.Жуковіча, Д.Ліс і драмай У.Някляева, а таксама — паэзіяй і ліставаннем




Л.Геніюш ды наробкам электроннага часопіса перакладной літаратуры «ПрайдзіСвет».

У «Верасні» — паэзія і проза маладых (А.Кузьміч, А.Емяльянаў, В.Кустава, Н.Грышчук, В.Воранаў, К.Глухоўская і іншыя), творчасць старэйшых Н.Гілевіча, В.Зуёнка, У.Някляева, эсэістыка, крытыка і… невядомыя пародыі А.Сыса.

Шукайце выданні ў кнігарнях і ў прыватных распаўсюднікаў!

ВЕРШЫ

# З НОВАЙ КНІГІ «ШАЛЁНАЯ КУЛЯ»

Сяргей ЗАКОННІКАЎ

Неаднаразова па запрашэнні грамадскай ініцыятывы Германіі «Беларуска-нямецкія сустрэчы» выступаў з літаратурнымі лекцыямі (творчасць Васіля Быкава, Уладзіміра Караткевіча) у Гэльмштэце. Горад, яго ваколіцы вельмі падабаюцца, хоць у гэтай гасціннай краіне быў часта, бачыў шмат цудоўных, непаўторных мясцін.

Раніцай звычайна вітаўся з сонейкам у выдатным лесапарку, дзе, згодна волі мясцовых жыхароў, не дазваляюцца ніякія высечкі, забаронена любое ўмяшальніцтва, усё да апошняй драбніцы застаецца некранутым. Дарослыя і дзеці назіраюць сапраўдную прыроду, жывуць з ёй у згодзе, шануюць, берагуць расліны і дрэвы, птушак і звяроў. Сёлета сустрэў тут цікаўнага, прыгожага, задаволенага жыццём барсука. Гэта была прыемная нечаканка, бо не бачыў такога знаёмца ажно з маленства, праведзенага на Вушаччыне…

Чым далей вандрую па жыцці, па планеце, тым больш абвострана адчуваю еднасць не толькі з роднымі людзьмі, з мілай сэрцу Беларуссю, але і з вялікім светам. Гэта не высокія словы, а стан душы. Усё, што закранае яе і дома, і ў далёкіх краях, прыходзіць у вершы.

**Аўтар**




## Цёмны горад

*Падалося: у горадзе выюць ваўкі, —*
*Гэтак злосна скуголіць за шыбамі вецер.*
*Прадзімае наскрозь ён надзеі куткі,*
*Што яшчэ засталіся ў расхрыстаным свеце.*

*Прыпыняю радкоў разняволены рух,*
*Бо душа на паперу глядзіць, як сляпая.*
*Уладарна на лямпай асветлены круг*
*Цёмны горад, як хіжая здань, наступае.*

*Чорным полымем злізвае кроплі святла*
*Дыктатура цынічнага, шчыльнага змроку.*
*Разам з ёй у кватэру трывога прыйшла*
*І на вершы мае пазірае звысоку.*

*Рабскі час плодзіць статкі нямых і глухіх,*
*Нават сны заганяе ў ванітнае стойла…*
*Цёмны горад сціскае ў абдымках сваіх,*
*Не дае ён ні жыць, ні памерці прыстойна.*

## Беларускі палігон

*На беларускім палігоне —*
*Як у апошнюю вайну.*
*Штодзень нячысцікі ў пагонах*
*Таўкуць тутэйшых у спіну.*

*Не дачакацца дапамогі —*
*Той з клюшняй, гэты з капытом.*
*А прыпячэ — прыкрыцца могуць*
*Людзьмі, нібы жывым шчытом.*

*Маўчыць народ.*
*Душу і цела*
*Спавіў намёртва страху дым.*
*А ўсіх няскораных і смелых*
*Гайня знішчае па адным.*

*Ды родны грунт я не пакіну,*
*Дзе слёз — як росаў на траве,*
*Бо веру, што мая краіна*
*Мільённа выдыхне: «Жыве!..»*

*То праўда крыўду ў кут пагоніць,*
*То гвалт зноў засцiць свет сабой…*
*На беларускім палігоне*
*Грукоча невучэбны бой.*

## Ні слова!

*Тут хлусаў тусоўка правіць,*
*Тут сэнсу хістаецца цвердзь.*
*Пакуль не пануе праўда —*
*Ні слова пра смерць!*

*За слова на бой суровы*
*Выходзьце — і ратнік, і смерд.*
*Пакуль не паўстала мова —*
*Ні слова пра смерць!*

*Надзея залечыць раны,*
*Не страшна і новыя меч.*
*Пакуль сцяг і герб забраны —*
*Ні слова пра смерць!*

*АМАП грозны крок паволіць,*
*Сціхае бравурная медзь…*
*Пакуль не займелі волю —*
*Ні слова пра смерць!*

## Устаньце!

***Калі мы не ўстанем самі —***
***Не падыме нас ніхто.***
***Уладзімір Караткевіч***

*Само жыццё — свабодзе радня,*
*Нельга ісці, згінаючы выю.*
*Мёртвых нам не ўдасца падняць…*
*Устаньце, жывыя!*

## Дождж са снегам

*Праплывае па долі маёй*
*Лёгкі цень нечаканае хмаркі…*
*Дождж са снегам над веснай зямлёй —*
*У анёла з нячысцікам сварка.*

*Змалку ветраны дзень я люблю,*
*А з табою — найбольш і адчайна.*
*На ляту мілы позірк лаўлю,*
*Як акрайчык галодная чайка.*

*З незнаёмай трывогай гляджу*
*На дзівацтва нястомнай прыроды:*
*Як сплятаюцца пальцы дажджу*
*З сівізной снегавой назаўсёды.*

*Хутка сэрца ў забойчым жыцці*
*Не стрывае шалёнага бегу.*
*Гэта вечнасць у вочы ляціць…*
*Гэта ты, гэта я —*
*Дождж са снегам.*

## Вёска Святая Воля

*Тут нештачка за назвамі*
*Схавана і замылена.*
*Як зведаць, што выказвае*
*Гуллівае Шуміліна?*

*Святочных вербаў коцікі*
*Святлеюць несурочана.*
*Пра чый жа лёс маркоціцца*
*Вясновае Сіроціна?*

*Кастры і бульба сопкая…*
*А што там больш убачыцца,*
*Дзе гнецца ў крук над соткамі*
*Цярплівая Гарбаціца?*

*А ў гэтай вёсцы здолеў я*
*Адчуць між ліп і ясеняў,*
*Што за Святою Воляю*
*Высокі сэнс праяснены.*

## Лёгкі хлеб

*Лёгкім хлебам паэзію лічаць, стараюцца*
*«Ад сахі і станка» праравацца да слова…*
*Ды метафары ўсё ж мазалём*
*не ствараюцца,*
*Нельга рыфмы спарадкаваць, быццам дровы.*

*Развітаюся раптам я з пэўнымі лямкамі,*
*Усміхнуся змене былых дэкарацый…*
*Ты чаму надарвалася, сэрца сялянскае,*
*На такой не мужыцкай, а «панскай працы»?*

## Мая сасна

*Інфаркт валіць люд, як лес, у нахлёст…*
*Я ўдзячны лёсу, што столькі агораў…*
*Мяне дабівае не сталы ўзрост,*
*А глупства, якое душыць за горла.*

*Я так стаміўся, што проста засну,*
*З куточка вуснаў прасочыцца сліна…*
*А покуль хочацца бачыць сасну,*
*Якая стане маёй дамавінай.*

## Кроплі

*Яна — загадка, як ні глядзі,*
*Ці хмельнай душой,*
*Ці вачыма цвярозымі,*
*А вывад напрошваецца адзін:*
*Жанчына —*
*Аб'ект не для нашага розуму.*

***

*Гэта мара спеліцца цішком,*
*Ды паэт не стане хэнчыць аспрэчваць,*
*Хоча хоць адным сваім радком*
*Зачапіцца за жыццё навечна.*

***

*Лебяда паднялася над доляю зрэбнай,*
*Як на твары маршчыністым шчэць.*
*Я прыняў тое, што ненавіджу патрэбна,*
*Каб паціху ад дум вар'яцець…*

***

*У краі суцэльных зняверцаў*
*Стаілася рабская ціш…*
*Тут нават сваёю смерцю*
*Свабоду не пракрычыш.*

***

*Я любіў жыццё: зары святло,*
*Прыпар дня і вечары з бясёдаю…*
*А было яно ці не было —*
*Я цяпер і сам ужо не ведаю.*

***

*Не пішацца…*
*Паперы згроб*
*І кінуў у касцёр таропка.*
*Пацалаваў свой лёс у лоб…*
*На тым і кропка.*

***

*А наогул — на долю жаліцца грэх,*
*Столькі ўвішных людзей шчыруе наўкола…*
*Нават месяц у небе бліщчыць, як лямех,*
*Адшліфаваны касмічным падзолам.*

## Шалёная Куля

*Я ў свеце жыву, дзе з крывавых падзей*
*Гісторыю ткалі заўжды псіхапаты.*
*Вайна не шкадуе ніколі людзей —*
*Шалёная куля пільнуе салдата.*

*А мне давялося пісаць на разрыў,*
*Мець раны нягойныя нават без бою.*
*Шалёную Кулю я сэрцам злавіў,*
*Да кроплі сцякаю нясцерпнай любоўю.*

*Імчыцца, выпісвае вечнасці круг*
*У космасе чорным, наскрозь нелюдзімым*
*Планета, якую вандроўны мой дух*
*Давёў да памераў малое радзімы.*

*У свеце,*
*Дзе гвалт душы кволыя гне,*
*Дзе бляклась сцягоў,*
*Дзе прадажныя словы,*
*Зноў страх за людзей раздзірае мяне,*
*І толькі любоў застаецца замовай.*

*Стаю на каленях ля родных магіл,*
*Тут грозна ў вушах вецер памяці свішча.*
*Ці хопіць зямлянам сумлення і сіл,*
*Каб сцішыць дурных пустадомкаў*
*ігрышча?*

*І я, адыходзячы ў край нежывых,*
*Спытаюся так, каб унукі не ўчулі:*
*«Куды ты нясешся на злом галавы,*
*Планета няўдзячных —*
*Шалёная Куля?»*

АПОВЕД

# ПЛЯВАННЕ Ў СТОЛЬ

Ян ЗБАЖЫНА



## I

Бацька ляжаў на канапе і пляваў у столь. Гэта было адзінае канкрэтнае выйсце пад час немагчымасці пахмяліцца. Канкрэтыка ўвогуле была характэрнаю рысаю бацькі, таму ўся рухомая маёмасць без фанабэрыяў сыйшла да ветру, а студню без вядра ніхто не зажадаў і дарма. А паколькі на павер у нашай вёсцы давалі толькі абяцанкі, то хоць на пень брашы, хоць на калоду тукай, а хвораму чалавеку толькі і заставалася адно пляванне.

Сэнс плявання ў столь, на першы погляд, быў зусім нескладаным: плюй сабе дагары і ўсё. На самай справе гэтая працэдура патрабавала значна большага ад чалавека, чым гульня ў шкляныя перлы. Знаўцаў класічнае ёгі пляванне вабіла сваёй адцуранасцю. Да таго ж бацька пляваў красамоўна, з уласціваю толькі яму хісцю, але ехаць да Індыі не згаджаўся, бо свядома баяўся слана, які без дай прычыны можа затаптаць добрага чалавека на падпітку.

Значна лепш было б бачыць само пляванне ў столь, але кожны, згодна з маім тлумачэннем, можа паспрабаваць уласна.

Гэтую разнастайнасць плявання варта ўмоўна падзяліць на два этапы: дагары і ўніз.

Першы этап вымагае дакладнага вакамеру і добрай напругі лёгкіх, а таксама пэўнага запасу вадкасці. З апошнім у бацьку перашкоды не было. Увесь час ён нешта адрыгваў, а выпалены самасадам дыхацельны ланцуг перапаўняўся іржаваю слізззю. Вакамеру было ўдвая больш: прыцэльваючыся, стары абавязкова заплюшчваў левае вока. А лёгкімі, якія выдзьмувалі трохпавярховую лаянку, заасобіўся б кожны бягун.

Пасля харкання вадкасць павінна была не толькі дасягнуць столі, але зрабіць гэта з асаблівай далікатнасцю, не размарскаючыся па паверхні, а ледзь-ледзь зачапіцца за яе. Праз нейкую хвіліну пухір, завісаючы ў падстоллі на ўласнай ножцы, пачынаў павольны рух да долу, аж пакуль не адрываўся канчаткова і, згодна спадара Ньютана, набіраў хуткасць.

Гэта якраз і распачынала другую дзею відовішча. Калі першая характарызуецца спрактыкаванасцю і майстэрствам, то другая — больш спрытам і вымагае маланкавае рэакцыі. Сэнс яе ў тым, каб перад набраўшым хуткасць пухіром як мага пазней зрабіць віраж галавою — і вадкасць трапляла не ў твар, а на ўвагнутасць ад галавы. Найбольш віртуозным лічыцца яшчэ і пляснуць у гэты момант у далоні. І чым бліжэй да носа гэта ўсё адбывалася, тым болей адрэналіну выпырсквалася ў кроў. Зразумела, адрэналін — гэта не стакан сівухі, але лепш, чым нічога…

Гэтай ёгі ад бацькі запазычыў і наркалагічны дыспансер. Лекары толькі ўвялі сваю методыку. Бацька распавядаў, што там нікога не вымушалі пляваць у столь; на галаву звязанага па руках і нагах хворага медыкі метадычна кідалі пудовую гіру. Эфект быў надзвычайны. Глузданутасць і белая гарачка знікалі ўжо пасля пятага кідка, дазваляючы эканоміць на леках, што інвестыравала грошы на пазычанкі. Пішуць, што ўжо да дажынак гэткім макарам будуць лячыць яшчэ і кілу…

## II

Фанерка на акне, што служыла заместа шкла, адсунулася ўбок, і ў хату ўвапхнулася галава старое Пляткарчыхі. Ад нечаканасці левае вока бацькі расплюшчылася, і ў гэты ж момант правае вока было цалкам зашпаклявана пакінутай па-за ўвагай вадкасцю.

— Усё блашчыцаў давіш, Збадун Збадуновіч ды Збадуна, — не вітаючыся адрохкала старая, — так і пахаванне прахэркаеш, відаць, і не ведаеш, што яшчэ давідна Пахмялко ўсім загадаў доўга пахмяляцца. Ужо і сталы з шынка-чытальні пазносілі. Хутка народ з могілак паспяшаецца. Вячэра за камплектуючыя будзе. Сам таварыш прадсядацель Глумак Ялдонавіч так загадаў і падпісаў.

Але бацька апошніх слоў Пляткарчыхі не чуў. Ды і навошта? Па-вайсковаму спраўна, не робячы непатрэбных рухаў, Збадун ссунуў ногі з ложка адразу ў апоркі. Але правая сустрэла маснічыну. Рукі ў гэты час падхапілі з падгалоўя абсурмехдук[1] і прасоўваліся ў дзіркі. Паколькі правая нага не намацала апорка, бацька вызваліў напалову ўціснутую ў дзірку левую руку і запусціў яе пад ложак. Памацаўшы, ён выцягнуў адтуль ката Не Прападу, які неўзабаве, храснуўшы хрыбетнікам аб вушак, пацягнуў свой азадак зноў пад ложак. Нарэшце апорак быў знойдзены, і бацька, кінуўшы абсурмехдук, не марудзячы сігануў у акно. Закружляла матылём адарваная фанерка, зарохкала збітая з ног старая Пляткарчыха, а бацька, выціраючы вока, імчаў па галашчоку да дашчатніка Пахмялка.

Услед, вохкаючы і заўзята зычучы кепства на яго галаву, закульгала Пляткарчыха.

Часу было блізка паўдня.

## III

Упэўніўшыся, што бацька гізаваў па вызначанаму раней кірунку, я дастаў скрадзены ў яго недапалак і ў прадчуванні доўгачаканай асалоды запаліў сярнічку, але закурыць не паспеў.

Рыпнула дзвярная клямка, і ў хату ўваліўся мой аднакласнік Дай Дапаліць.

— Дапаліць давай, — выхопліваючы мой недапалак, ашчэрыўся ён.

Дзень, відаць, вывіхнуўся такі, што ніхто не вітаўся.

Дай Дапаліць хоць і вучыўся са мною ў шостай класе, але быў старэйшы за мяне на тры гады і на весну збіраўся ў войска, а да астрогу дарогу наканавалі яму з маленсва.

— Тэма ёсць, — выдзьмуваючы дымок, сплюнуў скрозь зубы аднакласнік, — збаўтнеш каму, сам ведаеш, пеўня ў хату пушчу і дзверы падапру.

Я ведаў. Ведала і ўся вёска. Бо Дай Дапаліць перакрывілі яшчэ і Пажарнікам. Хаты і гумны настаўнікаў, упаўнаважанага зведалі пеўніка Дай Дапаліць.

Тэма была і сапраўды таямнічаю, для Пажарніка крымінальнаю. Бо менавіта ён, спакусіўшыся на грошы Пахмялка, спрычыніўся да адплыцця апошняга ў вечнае пахмелле. З другога боку, гэтая тэма — абяцала заможнасць… на некалькі дзён, і мне пачалі мроіцца пакуначкі цыгарак, адкаркаваныя пляшкі цывільнай і настаўніцы, дэкальтаваныя ад верху да самага нізу.

Справы адно і было, як зайсці ў хату Пахмялка і забраць з патайніка грошы. Дзе быў патайнік, Дай Дапаліць вывіжаваў і комін у Пахмялка наўмысна раней часу зачыніў, а сам уцёк. Той учадзеў, і сам таму віною. Бо нявартa было нікому хваліцца, што ты трактар за некалькі чырвонцаў як звычайнае металічнае ламачча ў другсыравіну здаў…

Пайсці на хаўтуры Дай Дапаліць не адважваўся, таму на мяне і быў ускладзены гонар даверу быць памагатым, а па-мястэчковаму — падзельнікам.

Тым часам жалобшчыкі на чале з дабрачынным айцом Прыйду Першым пасля пахавання грувасціліся на панадворку нябожчыка, дзе ў хаце за сталом ужо сядзеў участковы Ужо Тут. Якраз у гэты момант бацька і змяшаўся з пахавальнай працэсіяй.

## IV

За сталы садзіліся згодна з выпрацаваным за гады этыкетам. На чале — уласна Злыднік, па правы бок ад яго — Ужо Тут, а аб левую руку — Прыйду Першым. Раней было наадварот. Прыйду Першым быў перасаджаны па левую руку пасля таго, як сваёй правай рукой пачаў збіраць і кесарава. Этыкет не вызначаў месцы для астатніх жалобшчыкаў. Звычайна сямейнікі на могілкі не хадзілі, каб паспець ускочыць за сталы раней астатніх…

Па даўняй традыцыі, колькасць выпітага за ўхмяленне душы нябожчыка абмяжоўвалася лічбаю тры. Кожны пасля памінальнае вячэры, калі быў у стане нешта ўспомніць, дзяліў выпітае на тры. Атрымлівалася зрэдку тры куляўкі, а звычайна тры шклянкі, тры пляшкі, тры дзіцячыя вядзерцы. У грамах ніхто не лічыў.

За губы цягнуць да чаркі было нахабствам. Кожны з вялікай любові і светлай памяці да нябожчыка паспяваў зрабіць гэта значна часцей, чым якаясь там агітацыя. Малітва дабрачыннага, добрае слова начальніка і калегаў, а таксама незлічоных сяброў і радні па кудзелі ў сваёй аснове складаліся з выклічнікаў, узмоцненых пабуджальнымі дзеясловамі, што пакрысе пераходзіла ў каго ў сон, у каго ў лаянку.

Не знайшоўшы іншай зачэпкі трапіць у хату нябожчыка, я вырашыў зрабіць гэта праз клопат аб здароўі бацькі: для вока прынёс абсурмехдук. Праўда, уся вёска ведала, што мой бацька можа спаць у адных шкарпэтках на снезе, пад снегам і без яго і ні разу не чыхнуць…

## V

Пад час майго прышкандыбання чаркаванне ішло ва ўсю іванаўскую. Зацягнулі і любімую жалобную песню аб размаляваных караблях нейкага Сценькі. Відаць, гэты Сценька быў не з нашае вёскі, бо вады ў нашай сажалцы — курыцы напіцца. Душы нябожчыкаў, як сцвярджаў айцец Прыйду Першым, перавозіць не нейкі там драпежнік Сценька, а Харон, і не на караблях, а ў звычайным чоўне, што ніякім чынам не бянтэжыла маіх аднавяскоўцаў, якія без усялякіх прабачэнняў не ашчаджалі сяброўскія ўнёскі дабрачыннаму, які пагаджаўся ўзяць на сябе абавязакі стырнавога на пераправе, ні ў царкве ні па-за ёю.

Бацьку нельга было ні з кім зблытаць. Ён сапраўды нагадваў індыйскага гуру. Аскетычны яго выгляд яскрава даводзіў, што ён з дзяцінства не піў нават матчынага малака, а толькі спіртаўтрымоўваючую вадкасць. Можа, гэта і супярэчыць канонам класічнае ёгі, затое ён быў здольны закусваць, схапіўшы ротам аднаго паветра, або толькі панюхаўшы шкарпэтку, якую насіў з сабой заўжды, калі не на назе, то за каўняром.

Не паспеў бацька кульнуць, як я адразу кінуў яму абсурмехдук.

— Занюхай! — бзікнуў я як мага мацней, і ўсё застолле раптам заўважыла мяне і паглядзела на дырэктара школы Адзнаку За Грошы, якому мы былі вінаватыя яшчэ за пятую класу.

— Збадунчык, аддай Адзнаку За Грошы абсурмехдук, хай твой малы нарэшце ў сёмую класу пяройдзе, — прысуквалася Пляткарчыха. — Бачыш, ён у цябе такі перхацісты і так вылюдзеў, што ўжо і паповым вокам на сталы глядзіць.

Але ў нашай сям’і не было звычкі што-небудзь і некаму даваць: навучаныя з дзяцінства бессвядома казаць «дай», мы астаўпела не выкарыстоўвалі «на».

Вопытная Пляткарчыха без усялякага розуму змікіціла, што нешта не тое сказала, і аператыўна паспрабавала рэабілітавацца.

— А што датычыць нашага сённяшняга віноўніка пачосткі, то, як казаў мой найдаражэйшы зяць Што Узяць, адныя людзі паміраюць са спазненнем, другія — заўчасна, і мала хто ў свой час. І вынікам гэтаму тое, што пэўнае спыненне жыццёвага працэсу павінна быць для пахмялкоўскай рухаючай моцы надзвычайным палягчэннем: таму, мусіць, гэтым тлумачыцца і выраз на яго твары — задавальнёна-апахмялёны. З гэтага ўсім нам няхай будзе высnова: смерць, якой мы баімся, па сутнасці, не ёсць зло, а вечнае пахмелле.

Сама таго не жадаючы, Пляткарчыха з думак Ніцшэ і Шапэнгаўра склала сілагізм (няхай сабе і самы просты): памерці сваечасова — добра; Пахмялко памёр своечасова; Пахмялко памёр добра.

Своечасовасць смерці Пахмялка была відавочнаю, — зранку ў сенцах стаяў навараны і ўжо астылы студзень. Пасля пахмелля вяскоўцы ім і закусілі: не трэба было чакаць аж да жалобнага суткавання.

Перавёўшы пасля чаркі дыханне, Не Абміну прапанаваў палагодзіць зямлю: наліць яшчэ раз і выпіць за тое, каб у кожнага (на добры выпадак!) заўжды быў навараны студзень.

— А ведаеце, — не дайшоўшы яшчэ да розуму пасля чаркі, слова выхапіў добры сусед Пахмялка Хутчэй Налі, — што па сваіх вантробах чалавек мае найвялікшае падабенства да свіноты, але без ног гавяды з адных свіных ног студзень будзе не моцны, а з адных чалавечых — застыне, вось вам і розніца.

— Ну, як там па вантробах, не ведаю, — узяў разам з чаркаю слова ў свае рукі прадсядацель, — а вось па паводзінах і ў парсюкоў назіраецца свінства, але толькі ў адамашненых: у дзікай прыродзе яны паводзяць сябе больш чынна. Што датычыць людажэрства, — Злыднік строга зірнуў на Хутчэй Налі, — то яно у нашай вёсцы зліквідаванае яшчэ залетась, на свяце зазімак[2], калі мы ўсе разам выпадкова з’елі апошняга канібала, аб гэтым яшчэ ў нашай раёнцы «Вольны папіхач»[3] было намалявана, а тое, што вяскоўцы час ад часу знікаюць, то гэта эНэЛА іх крадзе, бо іншае быдла мы, як ведаеце, самі з’елі.

— Так, так! — апрытомнеўшы, загавеўся душою Прыду Першым, які не любіў гуманоідаў за тое, што апошнія ніколі не запрашалі яго здзяйсняць таемствы.

Пашукаўшы пад пільным позіркам сялянаў нешта за пазухай і ў кішэнях і не знайшоўшы, служка ўскочыў на стол.

— Дзе, пакажыце мне, гэты іншаземны розум, хто гуманоід, — развар’явана рыкаў ён, угледаючыся ў азызлыя твары жалобшчыкаў, — я яго!

Але, не ўбачыўшы на грызлах сялянаў акрамя ліхвярства нават звычайнага розуму, усю сваю крыўду скіраваў адразу на нейкую Атму, аблаяўшы разам і сусветны розум. Пасля чаго Прыду Першым супакоіўся, саскочыў на лаву, выпіў чарку і апусціўся на сваё месца, але відэлец трымаў, які неўзабаве на вачах усіх

нейкім чынам ператвырыўся ў абцугі. Ды тое ж і не дзіва.

Пляткарчыха па вялікім сакрэце паведамляла, што яна, спакусіўшы пахмеллем нячысціка, выцікавіла ў яго, што Прыду Першым заклаў яму большую частку свае душы, пакінуўшы ва ўласнае карыстанне адно дзве пятыя неўміручасці. І пэўна ж, ад няпоўнай душы благачынны не даліваў у чаркі парафіянам аж тры пятыя прылучэння.

Рука дабрачыннага з абцугамі сама сабою ўзнялася пад столь і пачала нешта намацваць у космасе. Ад гэтых тыканняў застольнікаў апанаваў страх і пачало калашмаціць, быццам яны да гэтага часу не пахмяліліся, аж жах як!

А што здольна было напалохаць іх болей, чым сусветны розум? Аповедам бацькі, які здольны быў плюнуць сам сабе ў вочы, што абавязкова аддасць пазычанае, аб двухвостых таптунах яны ні ў якім выглядзе не давалі веры, — пад хвасты гарэлку не зальеш і ўсё на гэтым. А страшыліся яны болей за ўсё міжгалактычнага галактажэрства і найперш драпежніцы Туманнасці Андрамеды[4]. Не, не за маёмасць хваляваліся яны сваю і не шкода было ім жыцця суседа, калі над багнаю слаўся туман, падпаўзаючы аж да самых хатаў. Пляткарчыха з вопыта суседніх узаемапаглынаючых галактыкаў VV13, 21, 33, 34, 115, 115, 117, 224, 226 і VV 227 ведала[5], — працяглым пахмеллем гэта аніяк не скончыцца. Галактыкатрус будзе такім вар'яцкім, што не толькі да роту не ўдасца данесці ані кроплі, але і праглынутае вынітуецца. Гэта вам не нейкія там сланы, гэта –грандыёзная катаклізма.

Тым часам я дастаў грошы з нябожчыкавага падпечча і ўжо збіраўся незаўважна падмазаць пяты. Толькі Заўжды Разам было напляваць на Туманнасць Андрамеды. У яго на прыкмеце былі такія гушчары, аб якіх ні ў адным закуточку космасу нат і не здагадваліся. Перагнуўшыся цераз стол, ён выхапіў поўны кубак гарэлкі ў Пляткарчыхі і амаль гвалтам уліў мне ў рот, а потым адшкадаваў прама з пляшкі і сабе. Ад такой нечаканасці і нахабства застолле прыціхла, толькі Пляткарчыха загаласіла на ўвесь голас. Вяскоўцы пачалі ліхаманкава куляць кілішкі. Заўжды Разам яшчэ палохаліся ў нашай вёсцы. І недарма: ён першы стварыў у раёне лясную гарызанталь супрацьпаветранай абароны «Пластун-1». Ні з ракеты, ні з самалёта, ні нават з лятаючай талеркі нельга было высачыць ачмурэлых аднавяскоўцаў пад елкамі.

У адрозненне ад Пляткарчыхі Заўжды Разам уяўляў сабою непісьменны патрыятызм і анучы ў вадзе не сушыў, а таму пераказваў толькі з пачутага ад Вышэйшага Лежня і рабіў гэта вельмі і вельмі дакладна. Благую памяць ён кампенсаваў прамілямі спірта ў крыві, таму яго логіка была дужа лагічнай, а сілагізмы больш складанымі і паскорана набіралі нечаканыя абароты. Але ніколі не было такога, каб яго не зразумелі застольнікі.

— Гэта здарылася яшчэ да нас, — быццам апраўдваючы сябе і застольны сход, праміляваў сваю памяць Заўжды Разам, — калі краманьёнцы з'елі неандэртальцаў, апраўдваючыся перад эвалюцыяй тым, што апошнія быццам бы тупіковая галіна ў ёй. Не! і яшчэ раз не.

— Не-е-е-гг-э-э, — падхапілі застольнікі свае ёмістасці.

Кульнуў сваю і грамадскі арганізатар:

— Але краманьёнцы памыліліся, за што зараз і нясуць эвалюцыйнае пакаранне. Тады не ўсе неандэртальцы сталі харчаваннем. Невялікая частка іх выратавалася, схаваўшыся ў нашай дрыгве. Краманьёнцы, якія не рызыкнулі лезці ў дрыгву, пакінулі іх у спакоі. Вось як недахоп розуму і страх ратуе. І як сведчыць сённяшні дзень, гэтая, так перакрыўленая «тупіковая галіна», не толькі выжыла, але і добра плодзіцца ў нашай мясцовасці. Гэтая галіна нават без шкоды для здароўя харчуецца белымі паганкамі, але і практычна выціснула альбо ўзяла пад кантроль не тупіковую галіну эвалюцыі, — іранічна перавёў дыханне чаркаю Заўжды Разам. — І найгалоўнейшы доказ, — вочы прамоўцы адарваліся ад пляшкі і ўталопіліся на каляровым фотаздымку пад столлю, — хто цяпер вышэй за ўсіх, як не наш зямляк?!

А мне тым часам заблажыла. Прадсядацель, паклаўшы зіркачы на лоб і ўбачыўшы, што каля дваццаці адсоткаў хаўтурнікаў маюць па некалькі і болей чарак, спахапнуўся і перайшоў да галасавання. Гэтым як заўжды распачыналася штоlate разовая разборка па спрадвечным пытанні сялянаў, хто з іх зробленыя, а хто недаробленыя на паўпальца. Сам палец ніякіх эмоцый не выклікаў.

## VI

Мне, як непаўнагадоваму, было на гэта напляваць. Прыхаваўшы сабе асобна жменю грошай, я пацягнуў ногі да свае хаты, дзе ад няма чаго рабіць Дай Дапаліць ушчэнт замардаваў Не Прападу, і той як ёсць прапаў[6].

Потым мы з сябрам хадзілі некалькі разоў «на кропку» па гарэлку, гулялі ў карты і паміналі Не Прападу, а яшчэ потым Дай Дапаліць некуды знік, прысабечыўшы маю долю.

Нараніцу праз акно разам з мокрым снегам даляцелі лаянка і бразгат. Уадначас у хаце запахла анучамі. Здзічэла завыла і адразу ж спалохана сціхла хітрая сучка Выкусі — апошні прадстаўнік сабачага народу на вёсцы, якой хоць і адарвалі хвост, але яе футрам дагэтуль ніхто не падбіў абсурмехдук, а мяса не завезлі ў Барабанкавічы[7].

— «А каго там ліха нясе на досвітку самым?» — злосна цвыркануў сам сабе пад нос я, высоўваючыся ў вакно.

Праўда, ніякае ліха нікога не несла. Ішлі самі і як бервяно пад гукі дуды і гармоніка кацілі бацьку, што самым нахабным чынам парушала адну з вольнасцяў хартыі местачковых сялянаў: права на іх свабоду ўласнага розуму, яго абарону і недатыкальнасць. Згодна з яго першым і апошнім артыкулам, кожны селянін меў права спаць і канаць там, дзе ўпадзе.

Бацьку прывалаклі тыя нешматлікія хаўтурнікі, у чыіх вачах чарка яшчэ не зайшла за чарку і арганізм патрабаваў тэрмінова аглаблёвай дагонкі з мяккім пераходам яе ў пахмелле.

Калі Прыду Першым зайшоў на надворак, па ім ужо соваўся




Ужо Тут. Зразумела, не абмінуў бацькаву хату і Не Абміну.

Каб я ўмеў лічыць, то ўбачыў бы, што іх было ў колькі разоў меней, чым учора. Бацька быў толькі заманкаю, каб выцыганіць з мяне гарэлкі. Яшчэ ноччу Плётчыха ўсім, хто быў пры памяці, давяла, што мы з сябрам абышлі ўсе пажыўныя месцы[8], вось і вырашылі прыйсці ў адведкі, а для годнасці прыцягнулі ў падарунак бацьку.

На чале з Ужо Тут ранішнія госці ўчынілі ў хаце і на падворкуператрус. Не знайшоўшы і кроплі апоін, яны, пакінуўшы пад плотам палымянага агітатара за родную вёску З Таварышамі, скапечана скіравалі свой лёс у аглаблёвы дзень. І каб надаць сабе моцы духа і шпаркасці сваім нагам прайсці да канца годна гэты дзень, амаль у адзін голас заспявалі аглаблёвую:

*— Белае войска, чорны барон*
*Зноў нам готовяць царскі трон.*
*Но ад тайгі да брытанскіх марэй*
*Красная армія ўсіх сільней…*

— Дойчан зальдатэн вунд афіцыран… — падпявалі ім з-пад плоту.

## Прадэпілог

Хто і куды перавозіў у гэты час душу Пахмялка, было ўсім напляваць. А бацька прачнуўся, калі добра развіднела, на ганку і адразу хацеў харкнуць. Але не было куды. Над ім ляжала голае неба, якое таксама было з бадуна — шэрым і ліпучым, і само смэркала спацелым снегам.

## Эпілог

Ужо да прыцемак вяскоўцам абрыдла каторы раз плявузгаць адзін аднаму аб таямнічым наездзе на хату Пахмялка. Не паспела адміністрацыя вёскі з яе актывам пайсці праводзіць Збадуна, як у хату Пахмялка ўваліліся нейкія пачвары і адразу ж утварылі вэрхал. Відаць і насамрэч яны былі страшэнныя, бо, убачыўшы толькі свае заквэцаныя адлюстраванні ў вылізаных да люстранога глянца талерках, раз'юшыліся і ўчынілі пагром, білі посуд і трушчылі сталы і лавы, і між іншым, няхай сабе і не зусім знарок, патаўклі захаўтурыўшыхся.

Пляткарчыха, якая была пры памяці, але не сыйшла з астатнімі, адразу інстынктыўна спалохалася няпрошаных візітантаў, заплюшчыла вочы і схавала галаву пад стол, прытварыўшыся п'янаю. Таму на ўласныя вочы і не здолела як след класіфікаваць драпежнікаў. Адно заклала ў памяць, што былі сярод іх і маладзёны, якія, паквапіўшыся на яе крыху больш за бадлераўскі ўзрост, спрабавалі задраць абсурмехдук. Але за выключную набожнасць Пляткарчыхі, а можа і з рэўнасці, яе гонар абараніў сам Зеўс, нейкім цудам падклаўшы пад яе спадніцу поўныя пляшкі гарэлкі, што і адцягнула ўвагу гвалтадзейнікаў ад патэнцыйнае ахвяры.

Прыду Першым і Ужо Тут адпаведна сваім пасадам знялі падазронасць з нячысцікаў і «тыднёвікаў», пераклаўшы ўсю віну на прадсядацеля. Як і большасць вяскоўцаў, яны лічылі недаравальным падчас жалобнага застолля згадванне Злыднікам гуманоідаў.

Пляткарчыха яшчэ з тыдзень загалялася і паказвала ўсім жадаючым і не шматлікія крывападцёкі і сінякі. Але хто ёй сплоціць за падраны абсурмехдук і зробіць сатысфакцыю[9], усім на вёсцы было напляваць.

## Заўвагі аўтара

1 *Абсурмехдук* — мясцовы дыялект, назва мужчынскай і жаночай, дэмісізоннай, штодзённай і святочнай вопраткі, выробленай з мяха праразаннем дзірак для галавы і рук. Абсурдмехдукаваць — жыць шырока на халяву; абсурдмехдукі (скарочана дукі) — да часу апісаных падзеяў, назва жыхарства, якая карыстаецца абсурмехдукамі, адсюль і неафіцыйная назва краіны — Абсурдмехдукія, Дукія (карыстальнікам абсурдмехдукаў было на ўсё гэта напляваць).

2 *Зазімкі* — найвялікшае зімовае землерабочае маргінальнае (рухомае) свята, кульмінацыя штогадовага адпачынку, звычайна прыпадала на пачатак зімы, час, калі яшчэ не дапілі і не дазакусілі тое, што засталося ад дажынак, а ўжо атрымалі дзяржпазыку на сяўбо; доўжылася аж да свята дазімак (кітайпазыкі).

3 *«Вольны папіхач»* — гарадская і раённая аб'яднаная газета, заснаваная 22 верасня 1939 года пад назвай «Пик коммунизма», за часамі перабудовы перайначана ў «Ваш край», з 1 жніўня 2014 года выдаецца як «Вольны папіхач».

4 *Туманнасць Андрамеды* — звышгіганцкая спіральная галактыка, пазначана пад нумарам M31 згодна каталогу Месс'е і пад нумарам NGC224 па Новым агульным каталогу, знаходзіцца на паўночным небе і ў ясную бязмесячную ноч бачна ў сузор'і Андрамеды неўзброеным вокам як слабая плямка. У цэнтры гэтае галактыкі знаходзіцца выток моцнага рэнгенаўскага выпраменьвання, які атаясамліваецца з чорнаю дзіркаю вагаю мільён ці болей масаў Сонца. Драпежніца вельмі хутка рухаецца ў наш бок. Адны навукоўцы сцвярджаюць, што яна зжарэ Зямлю праз пяць мільярдаў гадоў, другія — што значна раней — гадоў так праз мільярды тры. Пляткарчыха ўпэўненая, што гэта можа адбыцца ў кожную хвіліну. Шмат хто верыць, што менавіта з яе і прылятаюць на разведку талеркі-людажэркі. Пляткарчыха лічыць, што гэта толькі гіпотэза, хаця і па навуковаму добра абгрунтаваная пэўным колам аднавяскоўцаў.

5 І сапраўды, Пляткарчыха мае рацыю, — гэтыя ўзаемадзеючыя галактыкі існуюць; калі хочаш даведацца пра іх больш падрабязна, папытай у яе кніжку Татэоса Агекяна «Зоркі, галактыкі, метагалактыка», выдадзеную ў Маскве ў выдавецтве «Навука» ў 1981 годзе і разгарні яе на старонцы 193, а лепей за ўсё перасцеражыся і набудзь у Прыду Першым цудадзейны абярог ад усіх драпежных галактыкаў.

6 Як стала вядома пазней, кот Не Прападу нейкім чынам выжыў, падаўся ў лес і ўшчэнт здзічэў, цяпер палюе на сяброў «Пластун-1», і ўжо некалькі чалавек падпільнаваў і задраў нават пад елкамі. Аб'яўлены ворагам сялянаў пад першым нумарам, за яго футра і мяса абяцанае дужае пахмеле з дагонкаю (дагонка — выпіць пакуль ужо не ўлезе).

7 *Барабанкавічы* — падчас апісаных падзеяў, буйное пераваланае месца на вялікім валочым шляху ад Дзьмухавец-Венесуэльскі да інтэграцыі; першапачатковая назва — Балванавічы; упершыню згадваюцца ў 1243 годзе ў Едрытттваюгоцкім летапісе, згодна яму, мангола-татары хацелі ўзяць Балванавічы ў аблогу, але даведаўшыся пра яго сутнасць, нават не звярнуўшы ўвагі на адсутнасць абарончых збудаванняў, кінуўшы вайсковы рыштунак, палон і нарабаванае, тры дні не злазячы з коней уцякалі. Гэта спрычынілася да таго, што землі Беларусі практычна былі не кранутыя татарамі.

8 *Пажыўнае месца (кропка)* — паўсюдна распаўсюджаныя і агульнавядомыя забароненыя месцы продажу і распіцця спіртаўтрымоўваючай вадкасці.

9 Налівай за знявагу!

**Друкуецца ў рэдакцыйным скароце**

ВЕРШЫ

# ТРАВА ПАД КАСОЮ

Уладзімір ПАЎЛАЎ


Фота «Ь»

***

*Малю Хрыста: хутчэй іх прыбяры,*
*Што з ідалам люцыпара ў хаўрусе.*
*Як дзеўкаю, гандлююць Беларуссю —*
*Хто больш заплоціць, той яе й бяры.*

*Хіба мог колас дужым акрыяць*
*За пяць гадоў пасля двухсот нявολі?*
*Пагнала бура той павеў у полі,*
*Што й вострым слыхам сёння не чуваць.*

*Наадварот, запрэглася гайня.*
*З задышных зяпаў языкамі вісне.*
*Напагатоў ірваць, як гіцаль свісне,*
*Найперш таго, хто сват альбо радня.*

*Кусай свайго, чужы баяўся каб,*
*Каб у табе цівун не памыліўся,*
*Адступніцтва твайго каб не памысліў,*
*Убачыў каб, што ты — аддаены раб.*

## Мы вольна дыхаць толькі пачалі

*Пакуль вяршуе над законам права*
*Мацнейшага ва ўласным будане,*
*Ніхто нахабу не прамовіць «не»,*
*Нікому не заступніца дзяржава.*

*Да кожнага звяртаюся ласкава:*
*Мае грахі пералічаць пры мне.*
*Скажыце, а ці смачна ў чыгуне*
*Чужая непасоленая страва?*

*Мы вольна дыхаць толькі пачалі,*
*Абкрадзеныя, як зірнуць, кругом.*
*Аж зноў гайня ірвецца да зямлі*

*Да нашае, засопшыся, бягом.*
*Да нашае стадолы і раллі…*
*А мо на скрут, мо галавы на злом?!*

***

*У снах буду сніцца*
*Роднаму мне люду.*
*Упаду сініцай*
*Перад грудай бруду.*

*Распрастаю крылы,*
*Ціњкну на ўсю змогу:*
*Бойся, краю мілы,*
*У любві падлогу.*

*Бойся фарысея*
*Болей, як чужынца.*
*Сам нячысты сеяў*
*Гэтага злачынца.*

*Ён нібыта наскі,*
*З нашага парога.*
*Ды не мае ласкі*
*Да людзей і Бога.*

*Да зямлі тым болей —*
*Не чужой, а роднай.*
*Жыў за край без болю —*
*Стаў авечкай зброднай.*

## Ці змагу

*Пад шкамутамі зрынутага сцяга,*
*Пад звёнамі зашчоўкнутых акоў*
*Жыві, зямля, і адраджайся зноў.*
*Табе мая хвала, мая адвага.*

*Ці я змагу тваё асіліць блага,*
*Перарадзіць нявольніцкую кроў*
*Дачок тваіх адданых і сыноў? —*
*Была такой ад малалецтва прага.*

*Цяпер жыцця рашаюць у пад'ездзе*
*Не нейкія бандзюгі там «ізвне».*
*І іх шукаць не трэба дзесьці, недзе.*

*Яны на службе, ўсе яны свае…*
*А да каго ўжо «варанок» там едзе?*
*О мілы Божа, дай мацунку мне!*

## Выкапень

*Вылез невук з цёмнага падпечча,*
*Буламі фальшывымі абкладзен.*
*Зайздрасці і помслівасці складзен,*
*Выкапень з кастроў сярэдняевечча.*

*Між сяброў — ні родных, ні стрыечных —*
*У фаворы блюдаліз і блазен.*
*Не дабрацца ані ў якім разе*
*Да майстроў крывавых спраў заплечных.*

*Тыя, што часінаю ліхою*
*Знаюцца з крывёю, як з лафою,*
*Ходзяць у давераных малойцах.*

*Можна вышук сама менш патроіць —*
*Нізавошта не знайсці забойцаў.*
*Ўсе яны ў абласцы, як героі.*

***

*Да сонца і Бога, лапцюжнік, не лезь,*
*Бо права не маеш, хоць сам разадзеты.*
*Блішчыш і свіцішся з іголачкі ўвесь*
*І ўпэўнены, што завалодаў паўсвету.*

*О не, не даруецца тое царку,*
*Якою б ні строіўся ціхай авечкай.*
*Раней не пускаў прыхаджан у царкву,*
*А сёння стаіць з велікоднаю свечкай.*

*Не сорамна перад іконай яму*
*І крыжам чало асяняць пры народзе.*
*Ён моліцца богу свайму аднаму*
*З маленства, як помніць — уласнай выгодзе.*

*Ад здзеку такога сумленне крычыць,*
*Малое імкнецца схавацца за маму.*
*Варожа глядзіць і зацята маўчыць*
*Адзіна лапцюжнік гэтакі ж самы.*

**5.7.2005**

***

*Тыя ж ліпы, тыя клёны, тыя вязы,*
*Што і дваццаць, што і трыццаць*
*год назад.*
*Тыя ж ліпы, тыя клёны, тыя вязы,*
*Той жа быццам бы, ды выцвілы пагляд.*

*Нібы доўжыцца ўсё звыклае нязменна —*
*Пасля ночы наступае светлы дзень.*
*Ды прыпомніць, дайце рады, паіменна*
*Не магу, то прамільгнуўся, нібы цень.*

*Хто магутны быў, як волат, а хто хілы,*
*Ды па кожным з іх прайшоўся градабой.*
*Паўтарaецца адвечнае: магілы*
*Вечнаю заростаюць травой.*

**27.6.2005**

## Свечка, патухаючы, трапеча

*Ці так жыць ты думаў, чалавеча?..*
*Чорны воран крылы не складае,*
*Мёртвае пятлі віткі звужае.*
*Ваўкадаў на ланцугу якоча.*

*Гордым духам прыгінае плечы.*
*Болю з крыўдай сэрца не ўмяшчае.*
*Бомж спажывы ў сметніцы шукае.*
*Свечка, патухаючы, трапеча.*

*Плачуць асірочаныя гоні.*
*Пазбіваны капыты ў «Пагоні».*
*Мёртвым бляскам серабрыцца поўнік.*

*Кастуся з Тадэвушам не клічам.*
*Запраданца за месію лічым.*
*На сваёй зямлі сябе не помнім.*

## Раней і цяпер

*Былі дзяржаўныя структуры —*
*Жылося лепш літаратуры.*
*Цяпер жа з кнігай цёмны лес —*
*То дэтэктыўшчына, то секс.*

## Пра аб'яўленне вайны

*Ніхто вайны цяпер не аб'яўляе,*
*А неспадзеўкі з-за вугла страляе.*

*Калі ідзеш кагосьці забіваць,*
*Нашто яму пра гэта аб'яўляць?*

*Бо навіну як толькі паймуць,*
*То першага цябе заб'юць.*

*Як мы далёка абскакалі*
*Часы кала і булавы,*
*Калі і ворагу казалі:*
*«Іду на Вы!»*

***

*Можа ўскрыкнуць немата.*
*Як сабрат сабрата губіць,*
*Роўны роўнага не любіць,*
*Нібы кот ката.*

## Зямля

*Таму, хто ў суседа зямлю захапіў,*
*Адліся крывёю слязіна чужая.*
*Апошняю стань, баразна межавая,*
*Таму, хто ў суседа зямлю захапіў.*

*Няхай ён сваё з-пад сябе спажывае,*
*Не гнюсіць таго, што я потам скрапіў.*
*Таму, хто ў суседа зямлю захапіў,*
*Адліся крывёю, слязіна чужая.*

## Павучанне

*Падданых павучаў правіцель жыць.*
*Казаў, нібыта гладзіў па галоўцы:*
*«За ўсё, нябогі, трэба ўсім плаціць,*
*Бясплатны толькі сыр у мышалоўцы».*

*На прыпар брацца, ці дажджу крапіць —*
*Не меншылася ўпэўненасць прамоўцы.*
*Відаць, што і тады, калі ён спіць,*
*То не інакш як з недзе чутым слоўцам.*

*З вядомага не стройце навіну.*
*Пераляжаў пагоду не адну*
*Паміж вянцоў усохлы пласт імшыны.*

*У невуцтве не выпінайся, сір,*
*Бо плоціцца за той бясплатны сыр,*
*Каб ведаў, а жыццём, хоць і мышыным.*

## Да малітвы

*Ці птушка спявае за нетрай густою,*
*Ці цісне мароз да апошняй слязы,*
*Перахрысціцеся на абразы —*
*Трава пад касою, трава пад касою.*

*Не скажа ніхто: я жыцця вам патрою,*
*А вы толькі выганьце чорта з лазы.*
*І ў год бегемота, слана ці казы —*
*Трава пад касою, трава пад касою.*

*Дык што ж то за ідал, і што за праява?*
*Управы не знае, хоць дзе ні шукай!*
*А гэта стаптанае нашае права,*

*А гэта дашчэнту парушаны гай,*
*А гэта нячасная наша дзяржава,*
*Наш выміраючы край.*

ПРЫЗНАННЕ

# АДЛЯТАЕ Ў ВЫРАЙ РОЙ…

Алена ЛІТВІНА (МАЦЯШ)

**Дзень Яе нараджэння, ды ўжо без Яе. Затым другія ўгодкі з дня Яе смерці... Адчуванне нейкай суцэльнай ірэальнасці. Пуста. Глуха. Моташна. Не хочацца нікога пускаць у свой смутак. І плакаць не магу. О, гэтая мацяшоўская ашчаднасць, стрыманасць! Як пісала Ніна: «Ды няма ў нас такой завядзёнкі…». І вось забілася я ў сваю ракавіну — ракавіну свайго маўчання. Боль, які не адпускае, ды, пэўна, ужо і не адпусціць, хоць і прыціхае з часам і яшчэ пераліваецца нечакана для самой сябе на ўласныя вершы. (Дзякуй «Літаратурнай Беларусі», якая надрукавала некаторыя з іх разам з нарысам Анатоля Вярцінскага «Сёстры Ніны Мацяш» .)**

Сыход сястры ў іншасвет спарадзіў столькі шчырых водгукаў-спачуванняў, што мне часам здавалася: Ніна прыадкрывае вечка сваёй «схованкі», каб паспагадаць, паратаваць маё сэрца ад нясцерпнага болю, ад разрыву, паняньваць мяне, як некалі ў нашым з ёй мінулым. Мне так не хапае яе ўсмешкі, яе спачування, яе развагі. І яшчэ мучыць усведамленне, што пры жыцці не дазваляла сабе «слабасці» пашкадаваць як след яе самую (паралюш на яе, гэтую самую мацяшоўскую ашчаднасць), што, здаецца, ніколі не гаварыла ёй на поўны голас, як я Яе люблю і шкадую, як захапляюся Ёй, як дзіўлюся яе мужнасцю так жыць, яе мудрасцю (якая ж я дурненькая ў параўнанні з ёй), яе разважлівасцю (усё раскладзе па сваіх палічках), яе ўменню абнадзеіць і падтрымаць, яе тонкай душэўнасці і вышталцонаму, шляхетнаму, як у маці (хоць і мужычка), густу і ў рэшце



Алена Літвіна з сястрой Нінай. Пачатак 80-х. З сямейнага архіву.

рэшт — яе таленту. З другога боку, я лічыла лішнім ускладаць на яе кволыя плечы свае асабістыя болькі і турботы, старалася ўсяляк ахоўваць яе спакой. Як толькі не абзывала мяне за гэта: «казярожыцай» (мой знак задыяка — Казярог), «сухім вожыкам», «скарынкаю». Але, праўда, і «апіркаю», бо ведала, што захіну пры любых акалічнасцях, адгукнуся па першым званку, дапамагу па першай просьбе. Пра гэта нам і гаварыць не трэба было — само сабой разумелася. А яна так мала ад мяне хацела. Так мала. І як цяпер жыць, памятаючы пра гэта? Як забыць яе сумныя вочы і развітальнае: "Ты — лепшая?" Я ж вочы адвяла, не прыгарнула, не дала выйсця свайму пачуццю. «Кожны сам сабе капае студню, кожнага свой плуг вядзе»…

Яе развітальныя позіркі і словы… Яны даюць мне падставу сведчыць, што адметная велічнасць яе жыцця яшчэ і ў тым, што Яна, усведамляючы, пэўна, хуткаплыннасць і часовасць зямнога, не пераставала адчуваць сябе часцінкай Вечнасці і не жахалася перспектывы хуткага скону. Яе, здаецца мне, не прыгнятала жорсткая непазбежнасць смерці. Больш за тое, у апошнія свае дні так многа і так шчодра выказвала яна і ласку, і пяшчоту, і шкадаванне, і спагаду, так старалася ўсё дарабіць, давыканаць, даспавядацца, надарыць дарэшты ўсіх нас святлом сваёй душы.

Жыццё без Ніны пражыла так, быццам праседзела ў пустой цёмнай зале на сеансе чорна-белага кіно: вакол людзі — а пуста, свеціць сонца — а цяпла няма, светла — а ноч, дыхаеш — а не выдыхаецца. Праўда, зрэдку спахопліваюся: чаго гэта я так? Ніна ж і ў сваім жыцці, і ў вершах сваіх паказвала прыклад мужнасці і цярпення, «умення жыць не ў спаняверцы». Яна ж і пісала:

*Даецца жыццё нам. Каб радасць з адчаем*
*Вучыліся мы прыміраць.*

І яшчэ сказала, быццам пакідала нам наказ:
*Ёсць адзінае выйсце — жыць!*

Быццам загадзя давала сілы не зрывацца ў прорву безнявер'я і самоты.

У нашай ніўскай старане ёсць звычай: каб са смерцю блізкіх табе не ўпасці ў грэх адчаю і смутку, бяруць шчопаць пясочку з магілы і насыпаюць табе за каўнер. Так было не раз і са мною, калі закрывала вочы і маці, і бацьку, і сёстрам. А цяпер вось як апошняя з роду, ці, як бы сказала Ніна, апошняя ў нашым радавым спісе Эрэтэку, сыплю шчопаць за шчопаццю салёны ад нявыплаканых слёз пясок у радкі сваіх вершаў…

Да дня нараджэння сястры напісаўся верш «Пчаліны рой». Чаму такая назва, такая тэма? У бацькі была пасека. І сталася так, што свой пчаліны клопат ён перадаў менавіта мне, найменшай, якая да здранцвення, да смерці баялася пчол. Баялася, але калі вясною 2007 года пасека гінула, а бацька быў ужо зусім слабы, то мы з Колем узяліся яе аднаўляць: паставілі ў лесе лавушкі і заманілі ў іх некалькі раёў. Бацька яшчэ паспеў парадавацца. А за дзень да яго смерці прысніўся сон: усе чыста пчолы падняліся з вулляў услед за маткай і растварыліся ў небе. З трывогаю, памятаю, расказала сон Ніне.

Ну а зараз вось, можа, не столькі напісаўся, колькі прысніўся гэты верш…

*Ці бачыў хто,*
*як вулей — родны дом свой —*
*збіраецца пакінуць рой?*
*Шчэ зночы матка самавітая*
*рыхтуе-дзеліць дружную сям'ю:*
*каму застацца тут і тут,*
*а каму час збірацца да адлёту.*
*Немітуслівa ціхім поўднем*
*з вузкай шчыліны лятка*
*шыбуюць пчолы.*
*З радасным гудзеннем*
*шырокі робяць круг*
*над расквітнелым садам,*
*над родным домам, нівай урадлівай.*
*Развітваюцца.*
*Апошняй, нібы капітан,*
*з прышвартаванага ў лагуне ціхай карабля*
*ўзлятае сама матка…*
*Не ўсцеражэш!*
*Ці можна ўсцерагчы таго,*
*каму няўхільна мосціць Лёс*
*сваю сцяжынку — кладку*
*ад берага да берага. І ўсё.*
*Узаўецца ў неба рой*
*і адляціць навекі,*
*каб ніколі не вярнуцца*
*да роднага парога.*
*І толькі тыя, хто не паспеў,*
*спазніўся памаліцца,*
*зноў вернуцца назад,*
*бо рана ім у гэтую дарогу.*
*Ўсё так, як бацечку майго*
*і ўвесь наш дзявочы род збалелы —*
*Марыю, Ганну, Ніну —*
*забрала маці ў снах маіх прарочых*
*спякотным жніўнем,*
*майскім разнатраўем,*
*шалёным ліставеем.*
*Толькі пакінула апошняй з роду*
*адвечны клопат свой радзінны.*
*З пчалінаю сям'ёю парадзелай*
*нястомна поўніць горкаю пыльцою —*
*пчаліным хлебам — ладзіць соты,*
*збіраць у Вырай новы рой.*

# ПРЫСВЯЧЭННІ

Мая ЛЬВОВІЧ

**Мая Львовіч нарадзілася ў 1933 годзе ў Адэсе, куды з Гомеля пераехалі яе бацькі. З 1938 года жыве ў Харкаве. Піша на ўкраінскай і беларускай мовах, на нямецкай і на іўрыце. Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў.**

«З яе перакладаў на ўкраінскую (ад Максіма Багдановіча да Ніны Мацяш) можна скласці цэлую анталогію», — пісаў Адам Мальдзіс. І адзначаў: «У апошні час імя Маі Львовіч знікла нават са старонак беларускага перыядычнага друку. З самаадданымі сябрамі-суайчыннікамі так не паступаюць».

## Ніне Мацяш

*Ты памерла.*
*Ты за хмару зайшла,*
*Друг мой, мая душа.*
*Ты памерла,*
*І прыцямнела*
*Неба,*
*І пацямнела зямля.*
*А сёння, а сённейка*
*Прасветлінка для мяне:*
*Прабіўся прамень*
*Сонейка.*
*І пішу, як калісь,*
*І пішу табе ліст.*
*І прашу, каб знайшоў ён*
*Маю Мацяшоўну.*

3.VIII.2010

## Сяргею Панізьніку

*Таварышу, верш да цябе вярнуўся.*
*Куды б вандроўны вецер ні паслаў,*
*«Не жыў бы ў сэрцы сум па Беларусі,*
*Я б Украіну роднаю назваў».*
*Удзячна, што сказаў ты словы шчырыя*
*І што на вецер ты не кінуў слоў.*
*Далёка жыў ты ад сваёй Айчыны –*
*Вяртаўся да Айчыны зноў і зноў.*
*Дзеля сяброўства. Каб іржа не ўкрыла.*
*Жыве. Завеі злыя не бяруць.*
*Таварышу, у сэрцы родная Ўкраіна*
*І родная у сэрцы Беларусь.*

1977

* * *

*Хто б дакараў… Не замінaлі быць сабой.*
*І дзякуй вам, што не чынілі зла.*
*Ды родам, кажаце, Максімава любоў –*
*З любові, што сказаць калісь магла*
*Наконт тубыльскай беларускай мовы:*
*На формы небагатая, на словы…*
*Сказаць пра песню, дзе напеў*
*за змест бяднейшы,*
*А пра душу сказаць: няма душы*
*ніжэйшай…*
*Вось як усё і коратка, і проста.*
*А што Міцкевіч, ваш зямляк і цёзка?*
*А Каліноўскі, ахвяра Кастусь:*
*Што смерцю ён сказаў пра Беларусь?*
*А што жыццём нядоўгім, маладым*
*Пра Беларусь сказаў вам сын Максім?*
*Пі, ён сказаў, з жывога жарала.*
*Ён у крыніцу верыў светла, шчыра.*
*І тая — у нашчадках прарасла.*
*Ягоная, не ваша, да Айчыны*
*Любоў.*

1989

## Літва

***Беларусь, Койданава.***
***Ганне і Міколку С.***

*І сын на Поле йдзе, і сын –*
*На Поле бою ў Воршу.*
*І сын (хіба ён не Ліцьвін?)*
*На ноч ідзе да вогнішча.*
*Сын лепіць вершніка: жывы!*
*Жывы і конь ягоны.*
*Сын лепіць варту для Літвы –*
*Літоўскую Пагоню.*
*Жыве Літва! Паўстала зноў*
*Тваім маленькім сынам.*
*Расце сынок, расце сынок –*
*Ён вырасце Ліцьвінам.*

8.II.2000

* * *

***Мова — месячык і сонца.***
***Сяргей Панізьнік***

*Мова наша — ясны зоры.*
*Мова наша — ясны месячык.*
*Свеціць нам яна. Ды нейчае*
*Не заграбае прасторы.*
*Не ўпалюе шчэ кагосьці,*
*Ласкаю не прысабечыць.*
*На парозе мовы — вечнасці*
*Вартаю стаіць кагорта.*
*Вернікі-адзінамоўцы*
*Нам свае падставяць плечы,*
*Каб гарэлі зоры… месячык…*
*Зоры, месячык і Сонца.*

IX.1997

* * *

***Сяргею Панізьніку, сябру 70-х гадоў,***
***горкіх і цёплых***

*Ці памятаеш позні свой прыезд?*
*Асенні каралішчавіцкі лес…*
*Так горка веру страціць, каб даверыцца*
*Зялёнаму, адно яму, адно…*
*Было яшчэ нядаўна, ці даўно,*
*Ці так даўно, што болей не паўторыцца…*
*Хацелася б да памяці прымерыцца.*

29.5.1997

* * *

***С. П.***

*Ты з Бабруйска даслаў пісьмо мне.*
*У Бабруйску бабры былі.*
*Ці йшчэ ёсць у Бабруйску бабры?*
*Ці й да гэтае да пары*
*Захавалі бабры — мову?*
*Мову сваю бабруйскую.*
*Беларускую.*

12.VII.2003

## Сябрам

*Даўно не вясна,*
*А ластаўкай прыб'юся*
*Я да твайго акна,*
*Беларусь мая.*
*Позьняя ўжо восень.*
*У перадзім'і*
*Сэрца маё просіць,*
*Просіць*
*Хоць бы промня*
*З Радзімы.*

26.VII.2010

ФРАГМЕНТЫ

# КРУПНІК

## З АПОВЕСЦІ «ШАЛОМ»

Артур КЛІНАЎ

**«Уцякаць! Уцякаць! Уцякаць! Уцякаць без аглядкі! Хутчэй адсюль, хутчэй — на ўсход! Дахаты! Шнэль, зараз жа руш! Ад'язджай! Ну чаму? Чаму стаім? Ужо хвіліну як павінны былі ад'ехаць! Дзе германскі парадак? Поўны бардак на чыгунцы! Шнэль, шнэль — дадому! На ўсход! Хутчэй бегчы! Бегчы, не азіраючыся! Бегчы, бегчы, бегчы!»**

«Цьху ты, чорт! Нарэшце рушылі! Давай! Давай! Хутчэй разганяйся! Рухай цыліндрамі, поршнямі, коламі! Набірай хуткасць! Гані! Ляці без аглядкі — хутчэй на ўсход! Едзем... Едзем... Ужо едзем! Ужо не дагоняць! Халера бяры, гэта параноя! Параноя, як яна ёсць! Прыступ. Скаты, сукі, падлы! Параноя. Супакойся! Ужо не дагоняць! Ты ў бяспецы! Ты ўжо едзеш. Але яшчэ ёсць мяжа! Могуць чакаць там! Франкфурт. Франкфурт-на-Одры. А калі там? Чорт вазьмі! Рана я зняў паранджу! Ідыёт! Як жа я не падумаў? Навошта пайшоў у прыбіральню і зняў паранджу? Засунуў яе ў заплечнік. Можа, зноў апрануць? Не. Тут няёмка. Людзі глядзяць. Пайсці ў прыбіральню? І вярнуцца на сваё месца ўжо ў паранджы? Крэтынізм! Навошта ты зняў паранджу? Але хутка будзе мяжа. Праверка пашпартоў. Як растлумачыць памежнікам, што я ў паранджы? Сказаць, што араб? Мусульманін? Гей-мусульманін? Пасіўны гей-мусульманін? Мусульманскі пэдэраст? З беларускім пашпартам? Ды яшчэ і ў прускім шаломе! Крэтын! Ідыёт!»

Андрэ сядзеў у купэ цягніка, што хвіліну назад крануўся з перона «Берлін-Остбанхоф» і набіраў хуткасць у напрамку Варшавы. Ніколі яшчэ ён не пакідаў горад у такім замяшанні духу. Думкі кароткімі, як простакутныя штампы, сказамі адбіваліся ў мазгах. За вокнамі праплываў шэры дзень. Восень ужо ўзяла сваё, і горад развітваўся з Андрэ пахмурнай неакрэсленасцю, гатовай разрадзіцца доўгім нудным дажджом.

«Не, у паранджы нельга! Гэта выкліча падазрэнні. Нельга прыцягваць увагу. Трэба быць непрыкметным. Але як быць непрыкметным у прускім шаломе? Можа зняць? Заткніся! Хутчэй, хутчэй на ўсход! Бегчы! Ляцець! Уцякаць!»

«Якая ідыёцкая штука — жыццё! Яшчэ ўчора ты будаваў на яго планы, але раптам пстрык — усё перакульваецца — і ты бяжыш, бяжыш, бяжыш у невядомае. Раніцай тваё жыццё было ўладкаваным, усё ў ім цякло плаўна, запраграмавана на колькі гадоў наперад, а ўдзень усё бурыцца. І ты ўжо злачынца. І ты не разумееш, чаму яно не папярэджвае цябе, а выбівае зэдлік з-пад ног рэзка, раптоўна. І быццам планы ты будаваў, а ўжо вісіш на ніточцы лёсу, і ступакі тваіх ног калышацца над зямлёй, як ківач Фуко...»

«Чорт вазьмі, чаму гэтыя два палякі, што сядзяць насупраць, так дзіўна пазіраюць на мяне? Ну вядома. Яны думаюць, што я вар'ят. Яны бачылі, як я зайшоў у купэ ў паранджы, а затым вышаў у прыбіральню і вярнуўся ўжо без яе. Але можа гэта прыйшоў другі чалавек... А той першы проста пераблытаў купэ. Яны ж не бачылі твару. Яго хавала сетка. Не, яны заўважылі шпіль шалому. Ён тырчаў з чорнага балахона. Так, гэтая парачка ведае, што гэта я. Ну і хрэн з імі! Якое гэта цяпер мае значэнне? Яны мне не пагражаюць. Галоўнае, каб тыя, іншыя не пазналі мяне. Халера, які агромністы горад. Усё едзем... едзем... едзем... і ніяк не можам выехаць з-яго!»

«Так, палякі паглядаюць на мяне з асцярогай. Думаюць, я буйны. Трэба супакоіцца. У мяне грымаса на твары. Усміхніся ім. Пакажы, што ты прыязна настроены. Што ты не прывід імперыі. Вось так. Усмешку павесялей. Божа! Яны спалохаліся яшчэ больш! Зубы! Канечне, зубы. Трэба змыць гэтую чортаву фарбу з зубоў. Прама цяпер устаць, пайсці ў прыбіральню і змыць. Потым вярнуцца і ўсміхнуцца ім яшчэ раз. Трэба паразмаўляць з імі. Зняць напругу. Што б такое сказаць?»

— Панове едуць да Варшавы?

— Так. А пан?

— Таксама да Варшавы.

«Чорт, нешта размова не клеіцца! У купэ зноў напруга. Трэба зараз жа пайсці ў туалет і змыць гэтую фарбу. Хутка Одра. Памежнікам таксама не спадабаюцца мае зубы. Бяззубы і ў шаломе. Падазрона. Пачнуць правяраць, рыцца ў заплечніку. Знойдуць паранджу і бот. Падумаюць, што я ісламскі тэрарыст. Знімуць з цягніка да высвятлення. Трэба пазбавіцца ад паранджы. Выкінуць яе ў акно. І туды ж бот. А калі яшчэ спатрэбіцца? Калі ў Варшаве ў іх таксама свае людзі? Ды й шкада. Паранджу мне дала Інгрыд. Адзіны падарунак, які ад яе застаўся. А бот мне не прышыюць. Так, але ён адзін. Падазрона... Нічога. У горшым выпадку адкруцяць абцас, каб спраўдзіць, што там я хаваю. Шкада, з Інгрыд мабыць ужо ніколі не пабачымся. Яна нават не змагла праводзіць мяне на вакзал. Гэта было рызыкоўна. Разам нас маглі вылічыць. Толькі абняла мяне ў Тахелесе перад дзвярыма на вуліцу. Пацалавала, накрыла твар чорнай сеткай і сказала: «Бывай!».

Узяўшы заплечнік, Андрэ вышаў з купэ. Нервова азірнуўся па баках і пайшоў у прыбіральню. Зубы адмываліся з цяжкасцю. Хведар фарбаваў іх нітраэмаллю, таму неабходны быў ацэтон, альбо заставалася чакаць, пакуль фарба сама злезе з часам. Ён паспрабаваў пакалупаць зубы дзесяцьцэнтавай манетай. Дзе-нідзе фарба паддалася, таму ў цэлым грымаса змянілася на нешта незразумелае, падобнае ці то на зубную прыкаду, ці то на карыесна-парадантозную цвіль.



«Прасцей зноў пафарбаваць іх белай фарбай. Ну, Хведар, дзякуй. Не здагадаўся кінуць у заплечнік цюбік бялілаў. Добра, зраблю гэта ў Варшаве. А пакуль буду сур'ёзным. Паспрабую на мяжы без патрэбы зубоў не скаліць».

Андрэ вярнуўся ў купэ. Спадарожнікі моўчкі сядзелі і чыталі. Узяўшы нейкую газету, ён зрабіў выгляд, што таксама чытае.

«Так, гэта слушная ідэя! Як я адразу не дадумаўся? Усе шпіёны ў фільмах прыкрываюцца газетамі. На мяжы ўткнуся ў яе і зраблю выгляд, што мне ўсё пофіг. Трэба толькі вышэй трымаць, каб шпіль не тырчаў. Някепска было б яшчэ дзве дзіркі для вачэй зрабіць, каб бачыць, што вакол адбываецца. Так, добрая думка!»

Ён дастаў з заплечніка сцізорык і, прарэзаўшы дзве дзіркі для вачэй, зноў паднёс газету да твару. Скрозь свежазробленыя вочкі Андрэ ўбачыў, як два паны насупраць нeяк здзіўлена пераглянуліся між сабой і з трывогай зірнулі на яго. «Чорт, заўважылі!» — раздражнёна падумаў Андрэ і нечакана спытаў:

— Панове, ці няма ў вас часам цюбіка бялілаў? А то зубы лушчацца, няблага б падмаляваць!

«Яны мяркуюць, што я псіх. Трэба падыграць — хай так лічаць. Для канспірацыі гэта нават лепей».

Панове зноў моўчкі пераглянуліся і, адказаўшы: няма, — утаропіліся ў свае газеты.

«Пад'язджаем. Гэта ўжо Франкфурт. Хутка будзе вакзал і праверка дакументаў. А калі ўсё ж такі паведамілі? Уяўляю, як памежнікі ўзрадуюцца, убачыўшы мяне ў купэ. Выклічуць паліцыю — і бывай, Фатэрлянд. Надоўга. А калі не паведамілі, але самі чакаюць на пероне? Зойдуць у цягнік і пойдуць шукаць па вагонах. Зазірнуць у купэ і — О! Ба! Якая сустрэча! Вось ты дзе, наш дарагі! А мы цябе даўно чакаем! Усе ногі збегалі! Ну добра, і што яны зробяць? Пачнуць калашмаціць проста ў вагоне? Пры сведках? Уяўляю, як перапалохаюцца гэтыя палякі. Не, усё ж, мусіць, паспрабуюць выцягнуць на перон. Трэба папярэдзіць паноў, каб у такім разе неадкладна выклікалі паліцыю. Тады ўжо лепш у паліцыю. Як бы гэта ім растлумачыць? Яны і так лічаць мяне ненармальным. Падумаюць, што гэта бязглуздзіца. Гэта і ёсць бязглуздзіца — паранаідальная бязглуздзіца! Параноя, маць вашу, параноя! Супакойся! Чытай газету!»

— Пшэпрашам, вы не маглі б, калі раптам мяне пачнуць выцягваць з вагона, выклікаць паліцыю?

— Пану хтосьці пагражае?

— Ды не, з чаго вы ўзялі? Я так, на ўсялякі выпадак. Люблю падстрахавацца ад любой нечаканасці.

— Добра, пан, выклічам паліцыю.

«Ну вось, ужо вакзал. Спыняемся. Пакуль спакойна. Гэтыя людзі на пероне не падобныя да іх. Так, пару пажылых бюргераў. Гэта студэнты. Можа, яны на тым канцы платформы? Ну не, іх людзі былі б усюды. Можа, усё ж, паведамілі? Ідуць памежнікі. Заходзяць у вагон. Вось яны ўжо правяраюць першыя купэ. Набліжаюцца. Падыходзяць да нашага. Ну, божачкі, пранясі!»

Дзверы купэ з шумам адчыніліся і па той бок газеты пачулася:

— Пашпартны кантроль! Дакументы, калі ласка!

Андрэ адкінуў газетку і працягнуў пашпарт. Малады памежнік крыху збянтэжыўся ад нечаканасці, затым узяў пашпарт і пачаў яго з асаблівай уважлівасцю вывучаць. Ён доўга гартаў старонкі, разглядаў візу, спраўджваў штэмпелі, час ад часу з цікавасцю паглядаючы на гаспадара дакумента. Андрэ замёр у напружаным чаканні. Ён адчуваў, як вены на скронях пад шаломам набрынялі, і маленькія кроплі поту, гатовыя скаціцца па твары, выступілі на іх.

«Ну... ну, даражэнькі! Не цягні. Давай, вырашайся. А... А? А! Вось малайчына! Ура! Фу, пранесла!»

Памежнік узяў штэмпэль і гучна пляснуў у пашпарт пячатку выезду.

— Бітэ!

«Ну, дзякуй богу! Пранесла! Значыць, не паведамілі. Яшчэ некалькі хвілінаў чакання — і я ў бяспецы. Галоўнае, каб цяпер гэтыя не з'явіліся. Ну давай жа! Адпраўляйся. Колькі можна стаяць? На пероне пакуль усё ціха. Ну, давай жа! Руш! Паехалі! На гадзінніку ўжо час! Ну не! Няма германскага парадку! Фу ты, чорт! Ну, нарэшце! Паехалі! Цяпер я ў бяспецы. Зараз будуць правяраць дакументы палякі. Але ім усё роўна. Ура! Ешчэ Польска не згінела! Я амаль дома!»

Цягнік паскараўся і ляцеў на ўсход. За вокнамі прамінулі прадмесці Франкфурта, металічныя канструкцыі моста праз Одру, утульныя хаткі, палі з цыліндрамі прыбранай саломы, дарогі, пераезды. Толькі цяпер Андрэ адчуў, як стаміўся за апошнія суткі. Напружанне змянілася млявасцю, і яго пачало цягнуць у сон. Адкінуўшы ўжо непатрэбную яму шпіёнскую газету, ён забіўся ў кут і задрамаў. Праз сон ён чуў, як заходзіла польская страж гранічна, пыталася пашпарт, ён нешта адказаў, амаль не расплюшчваючы вачэй, а затым сон цалкам авалодаў ім...

Ён прачнуўся ад рэзкага пляску дзвярэй. З трывогай зірнуў у акно. Цягнік стаяў на пероне вялікай станцыі. Каля вагона мітусіліся нейкія людзі. «Халера, рэзкія гукі пачалі палохаць мяне. Нервы зусім расхісталіся. Мусіць, гэта Познань», — падумаў Андрэ і агледзеўся ў купэ. Побач сядзела пажылая пані, мабыць, яна ўвайшла на гэтай станцыі. Два ранейшыя спадарожнікі ўжо не чыталі газетаў. Мабыць, адчуўшы, што іх дзіўны візаві не ўяўляе пагрозы, яны таксама расслабіліся і цяпер драмалі кожны ў сваім закутку.

Спаць ужо не хацелася. Выцягнуўшы з заплечніка малень-

кую пляшку, Андрэ зрабіў пару глыткоў. Трывога пакрысе стала адпаўзаць, і ён прыгадаў апошні мірны вечар у Берліне, калі яны з есаулам вялі душэўныя размовы пра Хведара Міхайлавіча, пра вайну і мір, мастацтва, звышчалавека, Раскольнікава, старую працэнтшчыцу і Ніцшэ. Тады яны ўсё ж дамовіліся пра будучую канцэсію. Ідэя здавалася надта прывабнай, каб проста так выпусціць яе на вецер. Вырашылі, што Андрэ вернецца ў Магілёў, а праз нейкі час прыедзе назад у Берлін са свежай візай. Пачатак новых гастроляў канцэсіянеры запланавалі на пачатак вясны. А да таго часу Хведар падбярэ трупу, адшукае на флюмарктах неабходную амуніцыю, прыкупіць патрэбную колькасць прускіх шаломаў, зладзіць павозкі ды ўтрасе шмат іншых пытанняў.

У той жа дзень з раніцы яны далі прадстаўленне на подступах да Выспы Музеяў. Як і раней, усё прайшло ныдрэнна. Канцэсіянеры зноў сабралі неблагую касу. Публіка з цікаўнасцю слухала расповеды Андрэ пра падступную змову Антанты, зверствы імперыялістаў, прадажнасць тылавых інтэндантаў, пацукоў, што заселі ў штабе, жахі Чарнобыля, балотных ваўкалакаў, сінюю вадарасць ды гістарычны разгром іхняга палка пад Псковам у дзень 23 лютага, які потым шмат гадоў адзначаўся за Бугам як Дзень Чырвонай Арміі. Кляўся, што не вінаваты ў смерці Афеліі, што Паloній сам недарэчна падвярнуўся яму пад руку. Зноў нёс ахінею пра Аўстэрліц, Напалеона, Ватэрлоо. Казаў, што асабіста быў знаёмы з Розай Люксембург, Кларай Цэткін, кайзерам Вільгельмам, бачыў у Разліве Леніна, быў таемным сувязным між германскім штабам і бальшавікамі і ў сувязі з гэтым паводле службовых абавязкаў неаднаразова піў гарэлку з Камо, Арджанікідзе, Феліксам Дзяржынскім і нават з самім Іванам Васілевічам Чапаевым.

Некалькі разоў да яго падыходзіла паліцыя, але, пабачыўшы такое неардынарнае шоў, не ведала, што рабіць. У такі момант з'яўляўся Хведар і тлумачыў, што яны артысты. А гэта ёсць ні што іншае, як вулічны перформанс, які дае іх трупа, што ненадоўга спынілася ў Берліне, перад тэатральным фэстывалем у Авіньёне. Толькі аднойчы, калі Андрэ ужо зусім, набраўшыся нахабства, забраўся на прыступкі Домскага сабора ды пачаў з жарсцю прапаведаваць цікаўным турыстам нешта пра Страшны Суд, пра тое, што яны немінуча адкажуць за нячуласць і скваласць, падышоў паліцыянт і папрасіў яго прыбраць сраку з гэтай шыкоўнай паперці, перамясціўшы яе ў якое-небудзь меней прэстыжнае месца.

У наступны дзень была субота, і з нагоды шабату Андрэ вырашыў папрацаваць толькі да трох, а потым пайсці ды нарэшце купіць гэтыя чортавыя боты для цешчы. Бліжэй да вечара, здаўшы Хведару павозку і драўляную руку, ён разам з Інгрыд выправіўся па крамах пашукаць нешта адпаведнае. У адным шматпавярховым шопе яны знайшлі патрэбную пару, і фасбіндэраўскі анёлак нават прымерыў яе на сябе. Пабачыўшы, як крылы анёлка раптам ураслі ў зямлю двума чорнымі высокімі абцасамі, крыху зніякавеўшы, Андрэ хуценька сцягнуў з Інгрыд боты і пабег з імі да касы.

«Халера, а так добра ўсё пачыналася! Дзіўная рэч — жыццё. Увечары ты сядзіш за сталом у цёплай кампаніі і разважаеш пра старую, якой табе, дзякуй Богу, не трэба забіваць для сцвярджэння ўласнай годнасці, а ўжо праз дзень лёс пасылае табе менавіта гэту старую, якая сама кідаецца пад сякеру. Ты ўцякаеш ад яе, спрабуеш унікнуць гвалту, але яна ўпарта бяжыць табе напярэймы, чапляецца за ногі, б'е па шчоках, упіваецца ў руку, патрабе, каб ты схапіў тапарышча і апусціў цяжкое лязо ёй на галаву!»

Старая вынырнула з цемры, калі Андрэ задаволены, у цудоўным настроі вяртаўся з Інгрыд з крамы, трымаючы ў руках вялізарную скрынку з толькі што набытымі прыўкраснымі дарагімі ботамі. Мінаючы сквер паміж вуліцай Араніенбургер і Музейнай выспай, ён нечакана пачуў, як хтосьці за спінай паклікаў яго:

— Гэй, чувак! Пачакай!

Ён павярнуўся і ўбачыў тую самую — ідыёцкую, непазбежную старую. На выгляд ёй было гадоў васямнаццаць: даўгалягая, каротка стрыжаная, у цяжкім скураным паліто, падобным да таго, што было на Андрэ. Побач стаяла яшчэ адна «бабулька» — ніжэйшая, нашмат таўсцейшая, у плямістых вайсковых нагавіцах з чаравікамі на шнуроўцы. У гэтай «бабкі» галава была цалкам паголеная, толькі на макаўцы мелася выспачка кароткіх валасоў у форме свастыкі, падобнай ці то да лішая, ці то да вялікай брыдкай радзімай плямы, парослай шэрым мохам.

«Во дзярмо! Толькі гэтых прыдуркаў нам бракавала! — падумаў Андрэ.

Абедзьве «старыя» былі відавочна чымсьці абдзяўбаныя і тарашчыліся на яго поглядам, які не прадвяшчаў нічога добрага.

— Дай на піва! — нарэшце прагундосіла першая.

Андрэ крыху падумаў, палез у кішэнь і выцягнуў два эўра. У яго яшчэ заставалася надзея, што можна пазбегнуць размовы з «калчаногай і крывою» невялікімі грашыма. Але адкупіцца ад непрыемнасцяў малой крывёй відавочна не выпадала.

— Што так мала? Давай, гані бабос! Я бачыў, як ты сёння разводзіў лахоў каля Домскага сабору.

Андрэ пачынаў нецярплівець:

— Я ў шабат фашам больш за два эўра на піва не падаю!

— А! Дык ты яшчэ й жыд! Хаха! Глядзі, Тобі, які вясёлы жыд трапіўся: ён нам у суботу больш за два шэкелі не падае!

— Гэй ты, засранец! Валі адсюль! — раптам умяшалася ў гутарку Інгрыд.

— Хто засранец? Я засранец? А ну-ка, Тобі, увалі гэтай сучцы!

— Гэй-гэй, хлопцы! Спакайней! — Андрэ стаў на шляху тоўстага Тобі, які ўжо папёр з кулакамі на Інгрыд.

— Ды што з імі размаўляць? Валіць іх казлоў трэба! — закіпеў таўстун і вырачыў на Андрэ свае маленькія нацыянал-сацыялістычныя вочкі.

— Здымай шалом! — прамовіў даўгалыгі, — вам марамоям нельга датыкацца да святыняў.

Андрэ ўжо зразумеў, што мардабою пазбегнуць не атрымаецца, зрабіў крок назад і пракрычаў:

— А не пайшоў бы ты, Адольфік, са сваім тоўстым Борманам у дупу?

Тое, што здарылася далей, відавочна: «старыя» наляцелі на Андрэ як два злосныя, намуштраваныя на людзей сабакі. Адзін учапіўся ў шалом, другі пачаў калашмаціць яго кулакамі. Утварылася каша. Андрэ кінуў скрынку з ботамі і адной рукой стаў адмахвацца ад нападнікаў, другой спрабаваў утрымаць на галаве шалом, які вось-вось быў готовы саслізнуць з яе. Інгрыд, падхапіўшы бот, што вываліўся са скрынкі, стала хвастаць ім «бабулек» па свіных лычах. Калі б не яна, шалом хутчэй за ўсё пакінуў бы галаву Андрэ. Але «старым» даводзілася адмахвацца яшчэ і ад цешчынага бота, што запавольваў іх набліжэнне да мэты.

Нарэшце яны павалілі Андрэ на зямлю і прыняліся лупцаваць яго нагамі. У нейкі момант Інгрыд з усяго размаху заехала абцасам тоўстаму па воку. Той зароў ад болю і кінуўся на яе. Андрэ скарыстаўся гэтай секундай і, зрабіўшы рэзкі рух, паспрабаваў ускочыць, але якраз даўгалыгі нахіліўся над ім — і ў наступную секунду Андрэ адчуў, што шпіль шалома ўвайшоў у нешта мяккае, быццам чэлес у жаночае цела.

Падскочыўшы на ногі, ён убачыў, што Адольфік ляжыць на зямлі і храпе крывёю, якая льецца ў яго проста з горла. Наканечнік шалома патрапіў яму дакладна ў рот, пратыкнуўшы ў ім нейкія мяккія тканкі. Борман звар'яцелымі вачыма вылупіўся на даўгалыгага і ў паніцы залямантаваў:

— Забілі!!!

Андрэ, яшчэ толкам не зразумеўшы, што адбылося, са словамі: «Што, гніда! І ты хочаш?!» — падаўся на тоўстага. Той у жаху адскочыў і, мільгаючы чэрапам з касматай свастыкай, імгненна нырнуў у цемру.

— Капец! Толькі гэтага не хапала! Трэба змывацца! Патэлефануй у хуткую — можа яшчэ адкачаюць! — Андрэ шпульнуў у скрыню цешчын бот, і яны кінуліся бегчы ў напрамку Хаакішэ Маркет. На вуліцы Інгрыд папрасіла ў выпадковага мінака тэлефон і, паведаміўшы пра месца здарэння, выклікала хуткую дапамогу.

Далей усё адбывалася, як у нейкім кашмарным сне. Яны дабеглі нервовым трушком да Хаакішэ Маркет, падняліся на прыпынак у-бану і селі ў першы-лепшы цягнік. Праехаўшы адну станцыю, выйшлі на Фрыдрыхштрасэ і рушылі ў напрамку Унтэр-дэн-Ліндэн. Адшукалі на бульвары вольную лаву, нарэшце прыселі і, запаліўшы, моўчкі сталі асэнсоўваць тое, што здарылася. Адчыніўшы скрынку, Андрэ пабачыў у ёй толькі адзін цешчын бот.

— Чорт! Чорт! Чорт! Яшчэ і гэта! Прыдуркі!

— Урэшце рэшт, гэта быў напад. Калі ён нават і скапытіцца, цябе апраўдаюць, — прамовіла Інгрыд, зацягваючы другую цыгарэту ад яшчэ недапаленай першай.

— Можа, ён выжыве, — з надзеяй і нясцерпным жаданнем, каб менавіта так і адбылося, адказаў Андрэ. Думка, што ён забіў чалавека, няхай нават гэта была старая са свастыкай на лобе, не ўкладвалася ў галаве. Ён не быў здольны гэтага ўцяміць. Усё, што здарылася, здавалася нерэальным трызненнем, тым, што магло стацца з кім заўгодна, але не з ім. Прызнаць гэтую думку значыла прызнаць іншую рэальнасць, іншае жыццё, у якое ты раптоўна ўвайшоў хвіліну таму. Увайшоў рэзка і нечакана, быццам немавед чаму выскачыў на прыпынку метро і забег у цягнік, які рушыць у процілеглым кірунку.

І цяпер, седзячы на бульвары Унтэр-дэн-Ліндэн сярод шматлюднага і абыякавага натоўпу, Андрэ жадаў толькі аднаго: саскочыць на найбліжэйшым пероне і вярнуцца ў ранейшы вагон. Але магчымасць рушыць у папярэднім кірунку цяпер залежала толькі ад таго чалавека, якога пад завыванні сірэны хуткая дапамога везла ў гэтыя хвіліны па вуліцах вечаровага Берліна да ўжо накрытага аперацыйнага стала пад вялікай неонавай лямпай. На якім ён, як свежы ласунак, будзе з'едзены іншай ведамай старой, ці ёй давядзецца яшчэ пачакаць, здаволіўшы свой голад кімсьці другім.

— Пазней трэба будзе праз ваніць шпіталі — даведацца, што з ім, — вымавіў Андрэ, і з прыкрасцю дадаў: — Вось крэтынізм!

Ён дастаў са скрынкі адзіны бот, скамечыў картон і кінуў у сметніцу. Хацеў было адправіць туды і бот, але перадумаў і паклаў яго ў заплечнік.

— Навошта табе адзін бот?

— Адвязу цешчы. Чортава цешча! І тут мяне дастала. Праз яе абцасы мы патрапілі ў гэтую гісторыю. Дарэчы, уліка ў скверы засталася.

— Ідыёт! Галоўная ўліка на тваёй на галаве! Можа, ты яе такі здымеш? — Інгрыд амаль з мальбой у вачах паглядзела на Андрэ.

Ён крыху памаўчаў, затым палез у сметніцу, куды толькі што выкінуў скрынку, выцягнуў паперу, якая абгортвала боты, і сцёр ёю кроў са шпіля шалома. Потым кінуў паперу назад, выцягнуў з заплечніка пляшку, зрабіў вялікі глыток, рэзка ўзняўся і прамовіў:

— Не здыму! Пайшлі ў Тахелес!

…Калі Інгрыд вярнулася ў майстэрню, то заспела яе ў поўнай гатоўнасці да доўгай аблогі. Шафа была прысунутая да дзвярэй так, што яна ледзь праціснулася ў пакой. Узмацнялі барыкаду фрагменты былых інсталяцыяў — металічныя скрыні, стары манітор, друкарка, валізкі, падрамнікі з рэшткамі сунічных палёў і нават манекен чалавека, праўда, без галавы. На стале ляжалі прылады да бою — сямісвечнік, супрацьпяхотная граната, газавы балончык, некалькі слоікаў з хатнім варэннем — перадача Хведару ад маці — бутэлька ацэтона, сякера, дзве мыліцы і драўляная рука звышчалавека.

Ледзь толькі Інгрыд увайшла ў пакой, Андрэ кінуўся да яе з пытаннем у вачах. На што яна паведаміла дзве навіны: першая — гэты прыдурак, дзякуй богу, жывы, у цяжкім стане знаходзіцца ў шпіталі, але жыць будзе. Другая была горшай — фашы абвесцілі Андрэ вайну. Інгрыд звязалася са старым прыяцелем, які калісьці быў блізкі да іх, і папрасіла канфідэнцыйна распытаць пра сітуацыю. Высвілася, увесь асіны рой страшна абураны гэткім пачварным злачынствам. Аднак асаблівае шаленства выклікаў сам цынічны спосаб нападу — зверскі мінет, зроблены іх правадыру нейкім габрэем шляхам увядзення ў рот пікі прускага шалома. Адным словам, усе фашы ў шоку і маюць намер знайсці ваўкалака ды пакараць яго судом лінча.

Пры такіх раскладах заставацца Андрэ ў Берліне відавочна нельга. Трэба як мага хутчэй знікнуць з горада. Параіўшыся, канцэсіянеры вырашылі раніцай адправіць Інгрыд да арабаў па паранджу, а Хведар тым часам зганяе па квіток да Варшавы…

…Падняўшыся з лавы, Андрэ спусціўся ў падземны пераход да пункта абмену валют. Грошы ўжо сканчваліся. Прыкінуўшы, у што абыдзецца дарога да Менска, ён падумаў, што яшчэ можа дазволіць сабе бутэльку крупніку для абагрэву замёрзлага цела. Як толькі заспаны касір адлічыў патрэбную суму, ён паплёўся па доўгіх, пустых у гэты час падземных лабірынтах Варшаўскага вакзала да начной крамы. У невялікім памяшканні Андрэ звярнуўся да гандляра, што нудзіўся ў крэсле ля прылаўка:

— Бутэльку крупніку і пачак «Мальбара».

Не ўздымаючыся з крэсла, той выдаў неабходнае і, адлічыўшы рэшту, з нейкай абыякавасцю паглядзеў на Андрэ:

— Пан, мусіць, з Нямеччыны?

— Не, з Беларусі.

— Ааа… Тады зразумела, — загадкава вымавіў прадавец.

— Што зразумела?

— Калі б пан быў з Нямеччыны, я не раіў бы яму ў гэты час ацірацца ў такім уборы ў раёне вакзала.

Падзякаваўшы за параду, Андрэ пакінуў краму і пустыннымі лабірынтамі адправіўся назад. Вяртацца на ранейшае месца яму не хацелася. Ён выйшаў на вуліцу перапаліць. Брат-блізнюк зноў стаяў перад ім, праўда, без пышнага асвятлення, што ўпрыгожвала яго ўвечары. Зараз ён навісаў над вакзалам змрочным гатычным саборам, з кантрафорсаў і пінакляў якога на Андрэ панура пазіралі грыфоны, аспіды, базылеўсы, аднарогі і іншыя дэманы.

Паветра радзімы з вечара таксама істотна пахаладнела. Яно было па-ранейшаму лёгкім і свежым, але з кожным удыхам Андрэ адчуваў, як маленькія калючыя ільдзінкі пранікалі ў ягоныя лёгкія. Адкаркаваўшы бутэльку, ён зрабіў глыток з рыльца. Салодкая, цяжкая вадкасць пацякла па жылах, растопліваючы на сваім шляху невялікія ледзяныя таросы, што паспелі ўтварыцца ў яго арганізме за апошнія гадзіны.

— Пшэпрашам бардзо, ці можа пан даць пеньдзесёнт грошай на гарбату? А то зімна зусім стала!

Андрэ хацеў па звычцы адправіць жабрака куды падалей, але падумаўшы, сказаў:

— Грошай няма, а пяцьдзесят грамаў магу наліць! Але толькі ў тваю шклянку! А то ведаю я вас! Падчэпіш тут яшчэ якіх пранцаў!

Бяздомны тут жа выцягнуў з кішэні пластыкавы кубак і, відаць, ужо збіраўся крыху затрымацца ды пагаманіць з таямнічым госцем. Але Андрэ, паглядзеўшы на вялікі гадзіннік на вежы сабора, што паказваў чатыры шаснаццаць, з сумам прамовіў:

— Ідзі, дзед! Дай пабыць аднаму. Хачу надыхацца мядовым паветрам радзімы!

## ГАСЦІНЕЦ

*«Не жыў бы ў сэрцы сум па Беларусі –*
*я Украіну б роднаю назваў».*

Гэтыя радкі напісаныя мною ў Львове, дзе я ў 1964–1967 гадах вучыўся на вайсковага журналіста і дзе выспяваў на беларуса. Верш «Песня Украіне» з «Кастроў Купалля» перакладалі Іван Гнацюк, Раман Лубкіўскі і — Мая Львовіч:

*Не жив би в серці сум за Білоруссю –*
*я Україну б рідною назвав.*

Вось ужо больш як 40 гадоў жыве ў мяне сум па Украіне. Але пра нашую роднасць і ўзаемную любасць штораз нагадваюць мае сябры. І сёння я зноў сплочваю свой доўг перад імі…

**Сяргей Панізьнік**

## Дмытро ПАЎЛЫЧКА



Дмытро Паўлычка нарадзіўся ў 1929 годзе ў Івана-Франкоўскай вобласці. Скончыў Львоўскі ўніверсітэт. Многія яго вершы прысвечаны Беларусі. Перакладае творы беларускіх, англійскіх, іспанскіх, польскіх аўтараў. Герой Украіны.

У 1987 годзе у Мінску выйшаў зборнік лірыкі Д. Паўлычкі «Таямніцы вобліку твайго».

Дмытро Паўлычка: «Адраджэнне беларускай мовы можа адбыцца й напэўна адбудзецца бліскавічна, як толькі залунае яна ўверсе, з парламенту, з ураду, з вуснаў прэзідэнта». («Літературна Україна», 2009.)

### Дзікія грушы

*Грушы-дзічкі ў лясах на Валыні*
*Па вясне так шалёна цвітуць.*
*Там нектар з густакветкавай плыні*
*Пчолы ў соты глухія кладуць.*

*Пры даліне напружылі вушы*
*Арабіна, ляшчына ў кустах.*
*І грудочак ля кожнае грушы*
*Неба просіць, каб крыж тут паўстаў.*

*Пахаваная не ў дамавіне —*
*У карэннях стральцовая раць.*
*На валынскай маёй Украіне*
*Грушы-дзічкі, як свечкі, гараць.*

**5.V.2005**

### Закрэсленыя радкі

*Нібы калючы дрот у крэпасці — радкі,*
*Закрэсленыя думкі дарагія.*
*Тут след майго пяра, бязлітаснай рукі,*
*Нібыта выпраўляў свае грахі я.*

*Я іх перапішу і перакрэслю зноў,*
*Іх змест занадта сумны, у дакоры.*
*Вось так, змяняючы нянавісць на любоў,*
*Я захлынаюся ў пранізлівай пакоры.*

*Скрыжальныя радкі — нібы калючы дрот,*
*Я сам яго іраву, шаптаў: «Мая замова».*
*Шкада ўсяго, што чалавечы страціў род,*
*Але шкада найбольш загубленага слова.*

**15.V.2005**

### Чарэшня

*Зацвілі чарэшні, вішні*
*Па-над Лючкай на мяжы.*
*Быў і я там пры Ўсявышнім*
*З літарамі на крыжы.*

*Я калісь не бачыў свету,*
*Я не чуў панамароў,*
*Я агнямі ЗАПАВЕТУ*
*Пражыў свет, гукаў з муроў.*

*А цяпер зышоў я з неба*
*Да сівенькага вала.*
*І мне ўсё, што сёння трэба —*
*Каб чарэшня зацвіла.*

**1. V. 2006**

### Дождж

*Залева. У хлюпах тратуары*
*Ускрылілі і пыл, і цвіль.*
*Чырвоныя ўсплакнулі фары*
*І пасівеў аўтамабіль.*

*Нібы люстэрачка, на плоце*
*Засерабрыўся пырскаў крос,*
*І танцавала на капоце*
*Як дзеўка, бліскаўка з нябёс.*

*Я супыніўся. Небу — страта,*
*І раптам, перапалохам, цьма,*
*І дождж прашыў мяне, як праўда,*
*Калі ратунку ўжо няма.*

**13.IV.2006**

### Песня

*Лістота з явара спадае,*
*За небакраем зноў зіма…*
*Любоў, гукнія, маладая!*
*Але каханачкі няма.*

*Ты азавіся, і суквецце*
*Гадоў у промнях задрыжыць.*
*Тут не нажыўся на планеце,*
*А ўжо да іншай шлях ляжыць.*

*І не шкада мне больш нічога —*
*Зямлю захутала імгла,*
*А жаль кахання маладога,*
*Яго бяссмертнага цяпла.*

**23.X.2006**

### Стапчаціў

*Сады ў маім Стапчаціве яшчэ гудуць,*
*Яшчэ змяняюцца ў хацінах пакаленні,*
*Хоць тут гісторыя цякла, як злая ртуць —*
*Не знішчаны маёй духоўнасці карэнні.*

*Я нарадзіўся тут і ўжо не адвяду*
*За небакрай чужы майго жыцця кардоны.*
*Заснуць бы пры бацьках, асеўшы ў лебяду,*
*І слухаць па вясне бажніцаў перазвоны.*

*О не, я не прыму паўторнага жыцця,*
*Але калі і ўстаць, то глянуць на даліну —*
*Спаверыцца: ідзе Стапчаціва дзіця*
*Маліцца ў родны храм за вільну Украіну.*

**13.XI.2006**

## Галіна КІРПА



Галіна Кірпа нарадзілася ў 1950 годзе на Кіеўшчыне. Філолаг па адукацыі, працавала выдаўцом, журналістам. Аўтар некалькіх паэтычных зборнікаў. Многія кнігі для дзяцей выдала разам з мужам Дмытром Чараднічэнкам. У тым ліку і «Світ від А до Я. Австралія — Ірландія», дзе ў раздзеле «Білорусь» прадстаўлены творы для дзяцей 27 нашых аўтараў у перакладзе Г. Кірпы, Д. Чараднічэнкі, іх дачкі Оляны Руты, Наталкі Пазняк і яшчэ дзесяці ўкраінскіх сяброў беларускай літаратуры.

Галіна Кірпа перакладае творы аўтараў з Беларусі, Нямеччыны, Даніі, Нарвегіі, Швецыі. Чакае выдання перакладзеная ёю трылогія Сяргея Грахоўскага «Зона маўчання».

* * *

*Душа цяпер — як плыткі гон рачулкі.*
*А прыпамін — нібыта міф былы.*
*Ніхто не прыйдзе і не будзе гулкі,*
*хто й скрыпне, то як тыя капылы.*

*Душа бы нітка: тонкая — ірвецца.*
*І спогадзь наша — бурбалкай на дне.*
*Ніхто не гляне, з ласкай не ўсміхнецца,*
*хіба што кветка выглядкаю ў сне.*

*Душа — як лета бабіна — згарае.*
*Ёй поле — як сумётная гурма.*
*У вочы адзінота зазірае —*
*й парожыка парожняга няма.*

* * *

*Як вечарок мне пераўжыць спрасоння?*
*Як перабыць мне вецер і слату?*
*Я — кветка маку.*
*Можна так, што сёння*
*у вас пад вокнамі*
*бялява пацвіту?*

*Я доўга не ўтрываю красавання –*
*не маю раю, дзе не сад — чахол…*
*Я — кветка маку.*
*Мо і да змяркання*
*паспею ўквецiць*
*ачужэлы дол.*

* * *

*Вось і лісточак з абтрэсенай грушы*
*пайшоў на той свет.*
*Сад акалелы душу запарушыў*
*і мерзне, як той парапет.*

*Кожны загляне — і вецер, і воран,*
*нават нячысты дух…*
*Змрочная моўчадзь… У стылай прасторы*
*душа мая — зыбкі пух.*

*Хай і яна прысядае ў галінках,*
*дзе вецер, дзе воран сеў.*
*Дайце сустоіцца, дайце пахлімкаць*
*адменнай, такой, як не ўсе…*

### Усяго-усягусенькі дзень

*Жыццё — усяго-усягусенькі дзень,*
*у якім:*
*мама й тата —*
*імгненная стрэча*
*на свеце дзяцінства,*
*сама я —*
*непрачытаная кніжка,*
*маё дзіця —*
*казюлька*
*ў наўпроцьветравой дарозе,*
*каханы —*
*рэха*
*ў забытай Богам крыніцы.*

* * *

*Удосталь дажджоў.*
*Аж занадта нягоды,*
*дакукі калюжаў,*
*маркоты слаты.*
*А нашае неба чакае пагоды?*
*Адсунуць вятры каламуць нематы?*
*Калі ўжо абудзіць адліга даліну?*
*Калі дно Дзясны зноў асвецяць вякі?*
*А то новы вырай спаўе Украіну*
*і — жах! — не пазнаюць яе жаўрукі.*

### А мы хто?

*— Я украінец, —*
*лепятнуў заяц.*
*— І я шчэ ўкраінец, —*
*праляпаў воўк.*
*— А я ўжо украінец, —*
*прагугнеў каларадскі жук*
*дый гам-гам*
*бульбяны лісточак,*
*на якім сядзеў,*
*і стаў надалей каларадзіць.*
*— А мы хто? А мы хто? —*
*бубніць розная сматкаўня, і пташня,*
*усяляка дудзенне, загуменне,*
*— А мы за кан-са-лі-да-цы-ю!!!*

## Аксана СЕНАТОВІЧ

Аксана Сенатовіч нарадзілася ў 1941 годзе ў мястэчку Беражаны на Тэрнопальшчыне. Пасля заканчэння Львоўскага політэхнічнага інстытута працавала інжынерам, у навукова-даследчым інстытуце. Выдала некалькі паэтычных зборнікаў, у тым ліку і для дзяцей. Разам з мужам Уладзімірам Лучуком любіла наведваць Беларусь для ўстанаўлення творчых кантактаў. Зарана адышла з жыцця. Але яе сын Іван прадаўжае творчае пабрацімства з беларускім мацерыкам.

### Чаканне ў Зэльве

*У зеллі Зэльвы нібы ў храме,*
*Усё ў чаканні — уздыхнуць,*
*ідуць зубры па-за дварамі,*
*за плотам яблыні цвітуць.*

*У зельнай Зэльве ціша стыне,*
*душа адкрыта для дабра.*
*Мы тут удвох, а гаспадыня*
*пайшла ваду браць да Дняпра.*

*Пайшла пад вечар, крок люляе:*
*глядзіць на зоры з-пад рукі,*
*а можа, з небам размаўляе*
*над плёсам вечнае ракі.*

*Тут мы, чакаючы, маўчалі,*
*і ў цішыні спазналі ўраз:*
*усё даслоўна прачыталі,*
*што на абліччах ёсць у нас.*

*Стаялі, нібы дзеці, ў скрусе.*
*Пяршыла, і гарчэў камок…*
*Яна аб'явіцца!.. Дануся*
*хавае слёзы ў рукавок.*

**Пераклаў з украінскай Сяргей Панізьнік.**

## Наталка ПАЗНЯК



Наталка Пазняк нарадзілася ў 1972 годзе на Ровеншчыне, дзе ў мястэчку Нобіль Зарэчынскага раёна нарадзіўся ў свой час Сяргей Грахоўскі. Наталка прызнавалася, што на прырэччы Гарыні чутно было толькі водгулле старажытнай Тураўскай Зямлі. Украінскую мову яна спасцігла толькі ў школе.

На яе творчым майдане — пераклады ангельскіх аўтараў, вершы Максіма Багдановіча, Віктара Шведа, Міхася Скоблы… Ёсць і мае, створаныя пасля наведвання Полацка, мясцінаў Наталлі Арсенневай пад Дрысаю, майго музея «На шляху з Грэкаў у Варагі» пад Бігосавам…

Мае пераклады ўкраінскіх тэкстаў Наталкі Пазняк былі надрукаваныя ў 2004 годзе. І вось… паэтка перадала мне свае два вершы, напісаныя па-беларуску, — «гарыньскую аўтэнтыку» кіяўлянкі.

### Захад Сонца

*Як яблык чырвоны, скацілася сонца за мора.*
*Стамілася, пэўна: сарвалася, ўпала на дно.*
*І сполах у сэрцы —*
*здалося мне сонейка хворым.*
*Мо заўтра не здолее выйсці на неба яно?*

*Задумліва выплыла сціплая*
*лекарка-поўня,*
*Усцішыла раны на моры сваім серабром.*
*А хвалі хрыплі, быццам нейкія*
*дзіўныя коні,*
*І зоркі лавілі, што з неба ляцелі дажджом.*

*Тых зорачак дробных скацілася*
*з неба нямала:*
*Спяшаліся сонца праведаць,*
*ці знічкай у хвалях растаць.*
*А я кожнай зорцы жаданне шаптала,*
*шаптала —*
*Каб раніцай сонца знайшло ў сябе сілы*
*паўстаць.*

* * *

*Ты застаўся фантомам*
*Там, дзе сад не цвіце,*
*У прыдуманым доме,*
*На забытай вярсце.*

*Толькі адрас застаўся:*
*Тонкі водар вясны…*
*Незакончана казка,*
*Недасніліся сны.*

*Сёння вешчая поўня*
*Ціха зорыць на нас.*
*Лёс ляжыць на далонях —*
*Тонкіх рысаў наказ.*

*Ціха падаюць зоры…*
*Я спаліла масты.*
*Дагарае мне ўчора:*
*Там — праменьчыкам — ты.*

ПЕРАКЛАДЫ

# ДЗЕСЯЦЬ ВЕРШАЎ

Паўло ВОЛЬВАЧ

**Пераклаў з украінскай Уладзімір НЯКЛЯЕЎ**

* * *

*Верыцца не ветру — цішыні,*
*Сівізне па летах і па зімах.*
*Але ж ноч!.. І ў ноч плывуць агні —*
*І цякуць па дрэвах, па ўспамінах.*

*Чуеш?.. Слухай: дрэваў абалонь*
*Жывіць гул з прадонняў незапёртых,*
*І няўлоўна, як да скроні скронь,*
*Жылка ў жылку — галасы ўсіх мёртвых.*

*Шапацяць, стаяць дарог наўзбоч,*
*Шэпты іх — да болю, да крыві нам…*
*І няўлоўна: Украіна… ноч…*
*Хай няўлоўна.*
*Але ж*
*Украіна!*

* * *

*Ну і што, што недзе там Амерыка,*
*У якой валтузяцца народы.*
*Вунь дзяўчо, і праз хвіліну — Жмерынка,*
*І табе ў той Жмерынцы на сходы.*

*А дзяўчо мільгне за агароджаю,*
*У суцемках знікне, прападзе.*
*Прыйдзе да кагось, як ноч, прыгожая…*
*Жмерынка.*
*Амерыка.*
*Што дзе…*

* * *

*Жыццё бяжыць па вуліцы дзяўчынкаю,*
*А ўслед за ёй — са мною пад руку —*
*І жаль, і хмель, і музыка, што чыркае*
*Аб неба птахам, чоўнам аб раку.*

*І, як вясёлка, вертыкальна выгнуты*
*Шлях ад радзільні аж да цвінтару…*
*У гэтым свеце і абраў, і выбраў я*
*Дарэшты ўсё. І рэшту дабяру.*

* * *

*Паўсюль вятры, як злодзеі залётныя.*
*Крыві лятучай невядомы спын.*
*Яшчэ — жанчыны залатымі плоткамі*
*У срэбнае вадзе, дзе ты адзін.*

*Яшчэ вунь там, над кручаю быліннаю*
*Паўстаў Шаўчэнка — ветры корміць*
*з рук.*
*А што яшчэ?.. А плынь нябёс няспынная*
*На Стэп,*
*на Ніз,*
*на Луг,*
*на Базаўлук…*

* * *

*Жніва чакаеш па сяйве,*
*На бруку між каменняў сцёртых*
*Шукаеш кветкамі ў траве*
*Жывых між нежывых і мёртвых.*

*«Пустое!..» — між крыжоў і пліт*
*Спяшаеш і ўцякаеш плечы,*
*Блукаеш — сам сабе егіпт —*
*Сам цемрадзь у сваёй пустэчы.*

* * *

*За рог, праз арку — і наўкол*
*Пад месяцам над мінарэтамі,*
*Як з неба скінуты, Падол*
*З непрачытанамі прыкметамі*
*Часоў і новых, і былых,*
*Што між вякамі сталі стыкамі.*
*…І памінальныя сталы*
*Пад зоркамі над базілікамі…*

*Няхай хаўтурным святарам*
*Зазвычай адчуваць агонію —*
*Ён Храм. Ён Замкавы. А там —*
*Шукаць шляхі на Македонію.*

* * *

*Няма ні змен, ні вінграну* замены.*
*Веніямініч… Вершы з вены ў вену…*
*Пах валяр'янкі, плямы на сталe.*

*Чырвоны ліст на парапеце стыне,*
*З натоўпу позірк раптам страляне,*
*І зноўку тло асенняй ломкай плыні…*
*То ж я — на тле.*

*Тысячавокай запарожскай змовай*
*Здаля ці зблізку раптам блісне слова,*
*Якое не забыць і не пазбыць,*
*На лаву ў парку і ў дзясятку «марку»*
*Са мной сядае, падае цыгарку,*
*Пытаецца: а тут табе кім быць?*
*(А паўз усё мігціць, бяжыць, ляціць…)*

*Я прамінаю браму ў голы скверык,*
*Ад ветру падымаючы каўнерык,*
*П'ю на Падоле цьмянае віно,*
*Па вуліцы, што на вачах радзее,*
*Іду сабе, прыдумваю надзеі*
*І долю, што прыдумана даўно.*

*Маецца на ўвазе паэт Мікола Вінграноўскі.

* * *

*Што ў навінах? Зіма як зіма.*
*Снег… І дым над гарбамі гарбее.*
*Вінграноўскі пайшоў — і няма.*
*Як шарэў, мост Маскоўскі шарэе.*

*Плюс, такое, пра што й не сказаць,*
*Што чуваць з-пад зямлі — незямное:*
*Хутка — цалкам усім васкрасаць,*
*А на чвэрць — ужо гэтай вясною.*

* * *

*У акладзе лістападу*
*Толькі золата адно.*
*(А цікава: з Цараграду*
*Ззянне Кіева відно?*
*З гэтым, быццам на карціне,*
*Бегам круч — бы ветру ўслед?)*
*…Тонкім рвуцца павуціннем*
*Сны-трызненні пра сусвет,*
*Пра бліскучы, пра лятучы,*
*Пра няўлоўны свет хімер*
*З гэтай, скінутай на кручы,*
*Музыкай нябесных сфер…*

*Б'юць па сферах бліскавіцы,*
*Па зямлі ідуць жанкі…*
*Вось жа йдуць… І залаціцца*
*Завіток каля шчакі…*

* * *

*Так склалася: сярод усіх адна*
*Жанчына. Восень. Сінь. Распуснымі губамі*
*Цалуе, шэпча штосьць, знікаючы, яна.*
*Хістаюцца дымы. І Кіеў — за гарбамі.*

*Здзіўляйся сам сабе. І ўсё, як ёсць, прымі,*
*Пранізаны, як пыл, сурмою залатою.*
*Свет неба і зямлі стаў крыламі тваймі —*
*У пыле залатым ты ўскрыліш над сабою.*

# «МЫ ВА ЎСПАМІНАХ АЖЫВЕМ НЕ РАЗ»

Восіп МАКАВЕЙ

**Пераклаў з украінскай Сяржук СЫС.**

21 жніўня ва Украіне адзначалася 85-годдзе з дня смерці таленавітага пісьменніка, сатырыка і публіцыста Восіпа Макавея (1867–1925), творчасць якога доўгі час была незаслужана паўзабытая. Адзіная ягоная кніга «пры Саветах» «Вибрані твори» выйшла ў 1954 годзе. Між тым ён падтрымліваў цесныя кантакты з Іванам Франко і Лесяй Украінкай, пісаў сатырычныя фельетоны і гумарыстычныя навелы, скіраваныя супраць буржуазных дэмагогаў і «масквафілаў».

Але асобнае месца ў ягоным літаратурным набытку займаюць паэтычныя творы: вершы і паэмы, у якіх найбольш раскрыўся нацыянальны характар творчасці Макавея, ягоны рамантычны лірызм і бязмернае шанаванне роднага краю — Галіччыны. Нездарма некаторыя ягоныя творы сталі народнымі песнямі.

Некалькі вершаў Восіпа Макавея ўпершыню публікуюцца ў перакладзе на беларускую мову.




* * *

*Наляцела куля з поля,*
*зазвінела, як пчала, —*
*Божая, адбудзься, воля,*
*гэх, казацкая ты доля, —*
*грудзі куля апякла.*

*Ўпаў казак, устаць не можа,*
*наваколле аглядзеў:*
*«Ах, Карпаты, як тут гожа!*
*Не ўміраць, а жыць тут, Божа,*
*ды забілі неспадзеў.*

*Толькі й шчасця, што ўміраю*
*на зямлі маіх братоў;*
*толькі й жаль, што не спазнаю:*
*можа, з рук іх тут канаю*
*за правіны шчэ дзядоў.*

*Дый гатовая магіла,*
*не магіла, а гара;*
*досыць, душачка, тужыла,*
*дзе ты, Украіна міла, –*
*так далёка да Дняпра».*

*Без кітайкі, без каліны*
*пахавалі на вякі,*
*толькі вецер Верхавіны*
*панёс вестку да радзіны...*
*Што за горкі лёс такі…*

## СОН

*Ціхі сон гарамі ходзіць,*
*За сабою шчасце водзіць.*
*Лес шуміць як быццам цішай,*
*Свае кветачкі калыша.*

*Спіце, сінія званочкі,*
*Ружы, змружце свае вочкі!*

*Не шумі ты, гай зялёны,*
*Вецер, адпачні, сцюдзёны.*

*Спяць няхай салодка краскі,*
*Хай ім сняцца сны, як казкі.*

*Неба ж як запунсавее –*
*Сонца іх малых сагрэе.*

*І сагрэе, й пацалуе,*
*І ў сусветы павандруе.*

*Ціхі сон гарамі ходзіць,*
*За сабою шчасце водзіць.*

## КРЫЖ

*І тут між скалаў крыж!*
*Вось край заганны!*
*Куды ні глянеш, Бог укрыжаваны.*
*Няма тут ведаў, толькі — бездань веры,*
*І ўсюды рабскіх шыбеніц без меры.*

*Зямлёю песні вольныя лунаюць,*
*А людзі божай літасці чакаюць.*

*Паганяць твар асветлены прыроды*
*Ліхім канцом Хрыстовае прыгоды.*

*А самі д'яблавымі йдуць шляхамі —*
*Звяругі ад калыскі аж да ямы!*

*О, Хрысце, глянь: як тыя Юды і Пілаты*
*Чакаюць ад Цябе нябеснае адплаты!*

*Крыжом Тваім аздобіўшы сумленне,*
*А сэрцы іх, нібы крыжы — з каменя.*

*І шыбеніца ў хатах іх ёсць Богам,*
*А Ты стаіш, Ісусе, за парогам...*

* * *

*Калі памром і ўзыдзем палынамі,*
*Мы ва ўспамінах ажывем не раз,*
*Аж покуль побач з нашымі касцямі*
*Заснуць усе, хто памяталі нас.*

*І з намі смерць адружыцца дазвання,*
*наш пыл па свеце вецер параздзьме…*
*Вясна надыдзе, прыйдзе час кахання,*
*а нас ніхто не ўспомніць анідзе.*

*Ды выйдзе некалі самотная дзяўчына*
*Пагодным днём у ціхамройны лес —*
*І сцісне сэрца ёй без дай прычыны,*
*І ейны дзень ад слёз памеркне спрэс.*

*Тады яна пабачыць нас, пачуе,*
*Нібыта сон і казку з тых гадоў,*
*Прымружыць вочы, цяжка засумуе,*
*Заслухаўшыся ў ціхі сон лясоў.*

РОЗГАЛАС

# Святлана Алексіевіч: МЫ Ў БЕЛАРУСІ ВЫПАЛІ З ЧАСУ…

**Перакананыя, што гутарка Віталя Цыганкова са Святланай Алексіевіч дапаможа не толькі наблізіцца да творчай псіхалогіі вядомай пісьменніцы, глыбей зразумець ейныя творы, але і падштурхне чытачоў да ўласных дыскусійных разважанняў.**



Мы запрашаем літаратараў і крытыкаў да "завочнага" круглага стала, каб выказацца наконт агучанай у прапанаваным інтэрв'ю тэзы: «Без расійскай культуры мы будзем правінцыяй і мала каму цікавымі». Што страчвае і што набывае нашая нацыянальная творчасць ад такой прывязкі? Ці стаўся б Быкаў Быкавым, калі б яго перакладалі і друкавалі не па-расійску, а, скажам, па-польску ці па-шведску? І, наогул, што за феномен — «куст славянскай культуры», «славянскі арэал»? На чым ён трымаецца і дзе ягоны «цэнтр»?

Аб тым — новыя гутаркі ў наступных нумарах «Літаратурнай Беларусі»…

## «Мяне зачароўвае тэма смерці»

***Віталь ЦЫГАНКОЎ: — Праз усе Вашыя творы прасочваецца трагічнае ўспрыманне рэчаіснасці. Гэта такі прадуманы літаратурны ход, калі, напрыклад, аўтар у жыцці баіцца крыві, а піша крывавыя дэтэктывы? Ці тое, што Вы пішаце, сапраўды супадае з Вашым светаадчуваннем?***

*Святлана АЛЕКСІЕВІЧ:* — Можа быць, якраз страх смерці — галоўная рэч, якая мне цікавая. Гэта асноўнае чалавечае пытанне. Асабліва гэта адчуваецца цяпер, увосень, калі ўсё вакол паміраe.

Што тычыцца прафесійнага разліку, то яго не можа быць. Калі я пачынала пісаць "У вайны не жаночы твар", мне такое ў галаву не прыходзіла — нешта напісаць так, каб спадабацца чытачу…

Я вырасла ў вёсцы, пасля вайны, я нарадзілася ў 1948 годзе і памятаю толькі аповеды аб смерці. Мае бацькі, сельскія настаўнікі, жылі ў вёсцы, дзе была страшная бедната і бясконцыя гутаркі аб смерці. Вясковыя людзі — прыродныя людзі, яны ўмеюць і без Дастаеўскага звязаць гісторыю і прыроду.

***— Але, мабыць, толькі годам нараджэння гэта нельга растлумачыць? Напэўна, можна знайсці пісьменнікаў, Вашых аднагодкаў, якія пішуць нешта лёгкае і вясёлае. Мусіць, справа ў асобе пісьменніка, у Вашай асобе?***

— Можа быць, гэта адна з маіх глыбокіх дзіцячых траўмаў. Пасля вайны людзі ні аб чым іншым не казалі. Колькі я сябе памятаю ў дзяцінстве — жанчына плача на лавачцы і просіць Бога: «Хай бы ён хоць без ног вярнуўся, я б яго на руках насіла».

Я не думаю, што так уладкаваныя мае вочы і вуха, што я толькі ГЭТА улоўліваю. Я была знаёмая з Ганнай Паліткоўскай і магу сказаць, што яна была траўміраваная вайной, яна не змагла зберагчы псіхіку. Але я спадзяюся, што я захавала раўнавагу, іронію і радасць жыцця. Зрэшты, для гэтага ёсць вершы, музыка, чалавечыя сустрэчы.

Калі выразна сфармуляваць, то — так, мяне зачароўвае тэма сыходу. Куды? Навошта? Як быць да гэтага гатовым? Але я не люблю хадзіць на пахаванні і, у прынцыпе, не хаджу. Да таго ж чалавека, якога ты ведаў і любіў, ужо няма, гэта проста абалонка.

## «У мяне аголеная скура, я не магу абараніцца ад болю»

***– Аляксандра Андрыеўская напісала ў часопісе ARCHE, у артыкуле пра Вас, наступныя словы: «Алексіевіч займаецца свядомым калекцыянаваннем чалавечага болю».***

— Дурасць, гэта найпоўная дурасць. Гэта трэба быць нейкім робатам, каб калекцыянаваць боль. Усё жыццё і так працятае болем.

Можа быць, у мяне сапраўды аголеная скура, я не магу абараніцца ад болю. Занадта шмат яе вакол. У Еўропе, дзе я шмат жыву, яна прыхаваная за камфортам, за культурай, а ў нас усё тырчыць і заклікае. І як тут прайсці міма? У мяне не атрымліваецца.

***— Вы лічыце, што без гэтага, без такога абвостранага адчування, не можа быць вялікага пісьменніка?***

— Думаю, што так. Калі ўспомніць сур'ёзных пісьменнікаў, то ў іх ва ўсіх скура вельмі тонкая. А інакш і пісаць нельга. Тады трэба пісаць дэтэктывы, як Данцова.

Праўда, у мяне з гадамі запас трываласці вычэрпваецца. На нейкія рэчы ў мяне ўжо няма сілаў. Я б цяпер ужо не зайшла ў шпіталь да інвалідаў-афганцаў. Я б ужо не зайшла ў Дом дзіцяці. Таму што калі быць сумленнай — або бяры аднаго з іх сабе, або наогул не хадзі.

***— Атрымліваецца, што шчаслівы чалавек не можа стаць пісьменнікам?***

— Заўсёды шчаслівым можа быць толькі ідыёт. Ёсць фрагменты, хвіліны шчасця ў жыцці. Але як можа чалавек быць шчаслівым, калі вы чытаеце навіны, а там — маці забіла дзіця, кагосьці зноў застрэлілі. Якое тут можа быць шчасце? Я не ўмею быць шчаслівай, калі бачу ў Расіі бездаглядных дзяцей.

***— Гэта вы дзе-небудзь у Эфіёпіі не былі…***

— Я была ў Індыі. Там натыкаешся на жывы дзіцячы шкілецік. Але ты не можаш яму нічога даць, бо на цябе накінуцца іншыя дзеці і разарвуць.

А багатая вуліца, дзе жывуць мае выдаўцы, зачыняецца на замок. Трэба патэлефанаваць, і тады вас пусцяць. І як тут быць шчаслівым?

***— Але калі б усе нармалёвыя людзі разважалі так, як «думаючыя людзі» (маўляў, як можна быць шчаслівым, пакуль у свеце столькі гора), то ўсе б сталі шызафрэнікамі…***

— Я не магу сказаць, што я няшчасны чалавек. Я ведала каханне, сяброўства, я выгадавала дзіця — увесь гэты чалавечы набор у мяне ёсць. Але калі вы «думаючы трыснёг", то вы бачыце свет шырэй. Ён для вас празрысцей.

***— У адным інтэрв'ю Лявон Вольскі сказаў фразу, якая мне вельмі спадабалася: «Я нават заказныя рэчы пішу з натхненнем». Ці ёсць у Вас такая мяжа, калі Вы адчуваеце: нешта трэба напісаць, каб спадабацца чытачу або крытыкам?***

— Вось тут я шчаслівы чалавек. Калі напісала «У вайны не жаночы твар», я стала абсалютна вольным чалавекам. Пасля гэтага я радка не напісала, калі мне не было цікава.

Форма, якую я абрала ў літаратуры, вядома ж, не выпадковая. Адно з наймацнейшых узрушэнняў было, калі я прачытала «Я з вогненнай вёскі» Брыля, Адамовіча і Калесніка. Я якраз у той час шукала сябе і ўбачыла, што гэты жанр мой. Адразу ўспомнілася вёска, маё ўкраінскае і беларускае дзяцінства — і гэта супала са мной. Тут не было ніякага разліку. Які разлік можа быць у каханні, калі чалавек знайшоў сябе, свой працяг?

## «Без расійскай культуры мы будзем правінцыяй і мала каму цікавымі»

***— Вы называеце сябе чалавекам расійскай культуры. Што Вы ў гэта ўкладваеце?***

— Я, вядома, сфармаваная расійскай культурай: Дастаеўскім, Талстым, Чэхавым. Калі б у маім жыцці не было расійскай культуры, то мае кнігі аб вайне, Чарнобылі былі б іншымі. Мне прадметны свет як такі мала цікавы, мне цікавы свет думкі.

Беларуская культура іншая, яна аб іншым. З беларускіх пісьменнікаў мне бліжэй усяго Кузьма Чорны ў сваіх філасофскіх рэчах, Міхась Зарэцкі. Там я бачу філасафічнасць, якая мне блізкая.

***— Можа быць, у нас столькі людзей расійскай культуры толькі таму, што ў савецкай школе Някрасава і Бялінскага вывучалі больш, чым Шэкспіра і Сервантэса? Але Някрасаў не Шэкспір. Расійская культура значная, але яна займае, пры ўсёй павазе, скажам, 10 адсоткаў сусветнай культуры.***

— Мы ўсё-ткі адзін куст славянскай культуры. Прычым тут Шэкспір, гэта цалкам іншы свет, нябліжкі нам свет. Мы жывем у гэтым арэале і, вядома, галоўнае тут расійская культура. Мы славянскі арэал.

***— Але ў любой чэшскай або польскай школе (там таксама славяне) расійскай культуры аддадзеныя свае 10 адсоткаў як часткі агульнасусветнай. А ў нас — і ў школе, і ў тэлевізары расійскае душыць усё астатняе.***

— Мы жылі ў адной краіне.

***— Ужо 20 гадоў у розных краінах жывем… Вы выступаеце за культурную прывязку да Расіі?***

— Так, я лічу, што без расійскай культуры мы будзем правінцыяй, мала каму цікавымі далей той жа Чэхіі і Польшчы. Але ў мяне моцная мая беларуская частка, і ў расійскім коле я заўсёды бачу, што я іншая.

***— Вы — беларуская пісьменніца, але пішаце на расійскай мове і завеце сябе чалавекам расійскай культуры. Не ці бачыце Вы тут супярэчнасць?***

— Гэта не мая супярэчнасць, гэта супярэчнасць часу, у якім апынулася нашая краіна. Мы ж жывем на абломках імперыі. Але, у прынцыпе, я пішу гісторыю ўтопіі, якая размаўляла на расійскай мове. Па-беларуску я была б не роўная сама сабе. Мяне цікавіць наогул чалавечая прырода ў экстрэмальных сітуацыях.

## «Мы ў Беларусі выпалі з часу, мы нікуды не рухаемся»

***— Вы спадзяецеся атрымаць Нобелеўскую прэмію?***

— Я нават аб гэтым не думаю. Хоць ведаю, што я ў спісах. Мне спадабалася фармулёўка, з якой мяне вылучылі: «за стварэнне энцыклапедыі чырвонай цывілізацыі». Мне падабаецца, што хтосьці зразумеў, што я раблю.

***— Гэтыя некалькі месяцаў Вы знаходзіцеся ў Беларусі, але вялікую частку часу праводзіце за мяжой. У Вас не збілася адчуванне дома, Вы не блытаецеся, дзе «тут», а дзе «там»?***

— Я жыву тут. Яшчэ год пражыву за мяжой, потым вяртаюся дадому. 10 гадоў там — ужо годзе.

Я паехала, таму што бачыла, што тут, на барыкадзе, «звужаецца зрок», замест чалавека ты бачыш мішэнь, ты прывязаны да «рэвалюцыйнай» тусоўкі. Гэта быў шлях майго асабістага вызвалення ад нейкіх клішэ і стэрэатыпаў. Хацелася ўбачыць свет шырэй, застацца мастаком, а не Дзям'янам Бедным.

Да гэтага мяне падштурхнуў Чарнобыль. Стала зразумела, што няма асобна маленькай Беларусі, а ёсць проста людзі, уся Зямля. Мне хацелася паглядзець на свет, каб зрэнка пашырэла.

***— Як Вы ставіцеся да таго, што Вашыя калегі-пісьменнікі ідуць у палітыку? Самы апошні і яркі прыклад — Уладзімір Някляеў…***

— З усіх патэнцыйных прэтэндэнтаў мне падабаецца эканаміст Яраслаў Раманчук. Час дылетантаў у палітыцы мінуў. Мне здаецца, у Раманчука ёсць праграма, а ў астатніх — любоў да Радзімы.

Валодзя Някляеў — ідэаліст, ён рамантычна думае, што можа выратаваць краіну. А ў мяне меркаванне, што ратаваць яе сёння павінны эканамісты, людзі, якія ведаюць, што такое бюджэт, ВУП і гэтак далей.

Мы ў Беларусі выпалі з часу, мы нікуды не рухаемся. У гэтым сэнсе Лукашэнка — трагічная і камічная пастаць для нашай гісторыі. І людзі цяпер яшчэ больш баяцца зменаў, таму што час, калі ўсе верылі, кудысьці імкнуліся, ужо мінуў.

Часам пытаюць, чаму я не займаюся палітыкай. Але мая справа — пісаць кнігі. Дадумваць нейкія рэчы і ідэі да канца — вось чым павінен займацца пісьменнік. У яго пад рукой і сучаснасць, і вечнасць. А калі ты становішся палітыкам, ты спрашчаеш праблемы.

Я сустракалася з вялікімі палітыкамі, прэзідэнтамі, і нават самыя лепшыя з іх глядзяць на свет прасцей, занадта заганяюць сябе ў сённяшняе. Мне на такім узроўні ідэі нецікавыя. Хочацца пражыць чэсна, і што цяжэй усяго — перад самім сабой. Быць сумленным чалавекам, і ў той жа час быць адкрытым свету… І яго болю…

**«Свободные новости плюс».**
**Пераклад з расійскай.**

MEMORIA

# АЛХІМІК, КАЗАЧНІК, ЖАЎНЕР

Прадмова доктара мастацтвазнаўства Яўгена Сахуты называлася «Пра Дубінку і выцінанку». Была яна напісаная да кніжкі выцінанак, якую з розных прычынаў я так і не выдаў, хоць і падступаўся да яе гады са два. Сёння пачуваюся ўдвая вінаватым за гэта, бо з раніцы на сайце незалежніцкага радыё ў рубрыцы «Вянок памяці» прачытаў, што заўчора пакінуў нас, пайшоў у лепшы свет Вячаслаў Андрэевіч Дубінка.

Пазнаёміўся я з ім завочна, калі быў яшчэ студэнтам-філфакаўцам і зачытваўся надрукаванымі ў «Маладосці» авантурна-прыгодніцкімі аповесцямі «Не плач, душа мая!» і «Браты святой ночы». Падаліся яны абсалютна адметнымі, напісанымі нязмушана, нібыта на адным дыханні. На палях часопіса і па самім тэксце кланіся бясконцыя пазнакі, а ў мой тагачасны творчы нататнік перакачоўвалі шматлікія слуцкія дый, падазраю, прыдуманыя аўтарам словы-наватворы, прымаўкі ды прыказкі…

Пазней раззнаёміліся, неўзаметкі зблізіліся на беларускіх імпрэзах, выставах дый дэманстрацыях, на якія дзядзька Слава прыходзіў з нязменным важкім скураным куфрам на баку і з фотаапаратам на грудзях.

З прадчуваннем чароўнага спускаўся па бетонных прыступках у ягоную майстроўню на вуліцы Ленінградскай, што непадалёк ад сталічнага чыгуначнага вакзала. У жыцці многае прадвызначана зараней, і суседства з вакзалам, мабыць, няраз нагадвала дзядзьку Славу вучобу ў тэхнікуме чыгуначнага транспарта ды працу на вайсковых аб'ектах. Арыенцірам майстроўні служыла крама «Aurum» («Золата»), агульнымі з ёю былі і ўваходныя дзверы. Але сапраўднае золата беларускага мастацтва было якраз у сутарэннях, у пісьменніцкай студыі і ў мастакоўскае лабараторыі, дзе нібыта сярэднявечны алхімік ператвараў ён у золата, здавалася б, пабытовыя і звыклыя рэчы: паперу, скуру, кардон. Цудадзейнічаў мэтр андэграўнду і з хімікатамі, выцінаў нажнічкамі і скальпелем, высякаў разнастайнымі і мудрагелістымі самаробнымі прабойнікамі, рэзакамі дый іншымі інструментамі, найменні некаторым з іх даваў сам.

Кім толькі ні рабіў і чым толькі ні займаўся дзядзька Слава! Працаваў прарабам будаўнічага ўпраўлення, будаваў ракетныя пляцоўкі на Палессі, быў цеслем, мулярам, брыгадзірам комплекснай брыгады, тэхнікам-пуцейцам, кухарам на кацеры, механікам на рыбалоўным тралеры, геолагам па «прымусу», пераплётчыкам. Даводзілася яму рабіць штучныя кветкі на продаж, сплаўляць платы па Енісею, ганяць коней па Алтаі, скубсці жывіцу ў Красноярскай тайзе, бо лічыў, што рамяство — не вясло: за плячыма не цягаць.

Ці не ўвесь Савецкі Саюз аблазіў ён з «лейкай» і блакнотам. А ўжо Беларусь абхадзіў уздоўж і ўпоперак, здымаючы, занатоўваючы, дзівячыся родным мясцінам. Але пасля кожнага падарожжа з радасцю вяртаўся дадому.

Мудры і пранклівы, крытычны і самакрытычны, іранічны і самаіранічны, годна і з гонарам паказваў ён фотаальбомы «Бабруйск», «Брэст», «Магілёў», «Нясвіж». Марыў, што некалі пабачаць свет сотні, калі не тысячы адзнятых разам з Георгіем Ліхтаровічам кадраў — выяваў беларускіх храмаў.

А як іскрыліся вочы Майстра, калі паказваў ён аркушы і альбомы ці не галоўнай справы свайго жыцця — выцінанкі! Не будзе перабольшаннем сказаць, што менавіта ён адрадзіў гэты від народнага мастацтва, амаль што забыты ў пяцідзясятыя гады мінулага стагоддзя, і мае ці не сотню паслядоўнікаў, аматараў гэтага віда народнай творчасці…

Жыў ён, штодня чакаючы дзівосаў і падарожжаў у дзівосныя краіны, а восьі казкі і чарговыя святы тварыў сам…

Развіталіся з ім на ўправе Беларускага Народнага Фронту пад бел-чырвона-белымі штандарамі, і было гэта глыбока сімвалічна — пайшоў на спачын адзін з жаўнераў Беларушчыны, народжаных у далёкім і трагічным 1941 годзе.

Лёг долу яшчэ адзін дуб, яшчэ адзін волат айчыннае культуры, яшчэ адзін нашчадак слаўных слуцкіх паўстанцаў.

Пухам яму зямля!

Добры спачын і заўсёдная слава!

**Уладзімір СІЎЧЫКАЎ**

**У дзень развітання, 12 жніўня 2010 года**

Вячаслаў ДУБІНКА

## АБРАЗКІ



***Лепш малы рублік, чым вялікі дзякуй***

Улас Каржакевіч — ветэран сотае дывізіі. У трыццаць дзявятым на баявой танкетцы з чырвонымі ваярамі ўзяў Пінск і смаляную з саракапяткі па фарнаму касцёлу. І доўга шкадаваў, што мазануў па мураванцы з крыжам, паклаўшы намертва некалькі каровак на лузе.

Улас не ваяр, грудзіну у гарачых баталіях пад кулі не падстаўляў. Пасада ў яго адказная. Галоўны бухгалтар дывізіі. Начальнік па дывізійных фінансах.

— Я не бухгалтар, а начфін, — удакладняў пакрыўджаны падпалкоўнік. Панімаеш, блытаюць бухгалтара драждзавога завода з дывізійным начальнікам па фінансах…

Коціцца вялікае свята, травеньскі гучны бубен перамогі. Уласу на тыдзень, паўтара няма спакою. Маладым ваярам-танкістам хто раскажа, як адчайна біліся з фрыцам за раку Днепр. Пад Курскам дугу фрыцам завярнулі, крупаўскія панцыры крышылі. Пра слаўную пяхоту слаўцо хто скажа? Павучыцеся, байцы-маладзёны, як за партыю біцца! З адной супрацьтанкавай на варожых акопы перці.

Усё б лахва, але Уласу не дае жыцця Цімох Кукарэка. Куды Улас, туды і ён, яны ж суседзі, клямка ў клямку. Цімох — акопнік з трыма выцьвілымі медалямі і з адной сяржанцкай нашыўкай, а Улас багацей. Паўтара дзясятка медалёў і тры вялікія зоркі на пагонах.

Пераможныя дні коцяцца, Уласу немцы тралююць гуманітарную пайку, як «пачотнаму» ветэрану. Уласу ў свой час перапала і цёплая шапка ад роднага генералісімуса, а восьі ад немцаў пераможаных — шакаладкі, цукеркі, кава, курка. Акопніку падкінулі ўсяго толькі кіло грэчкі, пачак макаронаў і дзіну нож — сціжорык, які прыляцеў па небе з Бразіліі.

На дзень «слёзны» на вуліцу Грыбную прыбягае аўтабудка, размаляваная, у «бантах» і на харошых колах. З музыкай, з бубнамі ого як ветэранаў шануем! Улас мундзір на плечы і да аўто. Следам за Уласам пакільчыгаў і акопнік, адно фрэнч салдацкі прыхапіўшы з баявымі ўзнагародамі. Сустрэлі ветэранаў у вайсковай вучэльні. Хлеб-сольцам пачаставалі.

Улас сеў за сукно, акопнік прымасціўся побач. Улас падхапіўся і рушыў да шпакоўні з аплецанымі дулямі, пачаў завучана, на ўрачыстай ноце:

— Ламанулі мы хрыбет фашыстам на ўсіх франтах, пёр Гітлеруга, хвост паджаўшы…

Не выцерпеў, падскочыў акопнік і рашуча даў адлуп:

— Бухгалтар ты, а не баец. Паперкамі баявыя мазолі набіваў, а я ж зямлю жор, крывёю адплёўваючы...

Начыста сапсаваў урачыстасць настырны акопнік. Скончылася святочная імпрэза. Уласу ўручылі грамату-ганароўку, а восьі акопніку паклалі дзвацаць пяць тысячаў новенькімі соткамі. Усцешаны нечаканым багаццем, акопнік хітранька зірнуў на ваяра-бухгалтара, засмяяўся:

— Мне лепш такі во рублік, а табе згодзіцца і вялікі дзякуй на залатой каёмачцы.

***Вёска ў дым п'яная, а сонейка толечкі закацілася***

Вёска Бастынь схавалася-згубілася ў глухамані Лунінецкіх лясоў і балот. Дзень дагараў, сонца лена каціласа за небакрай, чырвоныя пацалункі рассыпаючы. Звыклыя закідон-пасядзелкі ў старшыні сельсавета. Хата ладная, пакоі прасторныя, вокны вялікія, лаўкі шырокія, закусь свая.

Бухае мясцовае начальства, па душах шчымлівую гамонку вядзе. Натхняе свая мутная чарка, пажоўклая скварка, салёны агурок і салодка-чырвоны бурачок. І прычына не абы-якая. Прsuccessfully вадыр у сваім бетонным логаве чынавенскай хунце чубы падчыпурвае, патыліцы гультаям чэша. Народ балотны ўсцешаны: бацька жылы рве, каб сярмяжны народ кусманістую скварку меў. У люда бастынскага ад тэлесе-лектара душа цешыцца, рука да чаркі сама цягнецца, вяскоўцы ад пачутага і бачанага ў захапленні. Давай новую чарку, гурок на гнілы зуб, вачэй не адарваць ад пуката-мутнага экранчыка старэнькага «Гарызонта», лебядзіная песня здыхаючага белпрама.

— Наш вусаты дае пытлі! Дармаедаў працьма. Дрыжаць, халяўшчыкі!

— Чаго дзівіцца. Зладзюкоў вунь колькі! Адзін крадзе, другі прадае, трэці капейчыну ныкае. Пяты ў мянтоўню бяжыць, мала яму напілілі з крадзенага.

На пукатым экране правадыр балотнае галаты разагрэўся, трэцюю гадзіну малоціць, што збожжавы камбайн на палеглым жыце. Раптоўна адчыняюцца дзверы, у праёме паказалася галава ў хустцы. Галасістая жонка калгаснага аграномa не супакойваецца, каторы раз галаву шчэміць. На ўсю моц зараўла:

— Расселіся, п'янтосы! Балбатуна не бачылі? Сабачага будана за жыццё не скляпаў, а таўчэ! З папугай і дурань пабегае! А вам альбы толькі пойла глытаць. А вой да чаго дажыліся. Вёска ў дым п'яная, а сонейка толечкі закацілася.

***Верабейка не сее, не жне, а зярняткі дзяўбе***

Каля помніка найжывейшаму з жывых, бронзаваму правадыру мяне запыняе дзіўны дзядзок. Дзве палатняныя торбы перакінутыя праз плячо, а світка-самашыйка падперазаная вяроўкай, у чорных гамах з чырвонымі кантамі.

Ці не з Гарадзішчаў хадок? Па гамах бачна. Мой бацька Андрэй такія ж гамалёпы майстраваў, а ён жа — найлепшы спец па гамах на Случчыне. У канцы пяцідзесятых да яго па файныя гамы у Слуцак, дужа хадавыя на той час, чорныя з чырвоным кантам, прыязджалі аж з Украіны.

— Адкуль, дзядзька, у сталіцу? Праўду шукаеце там, дзе яе даўно няма?

— З Гарадзішчаў, што пад Слуцакам, — адказвае стары, дзівячыся. — Лоўка вы па-вясковаму гаворыце. Выхаваны, апранаты па-гарадскому, а, бачыце...

— Што ў вас за клопат, дзядзька? — пытаюся ў хадака, асцярожна дакранаючыся да дзядзькавае торбы.

— Вой, братачка, — адказвае, — праўду шукаю, а яна, як сабака, збягае і за хлявом хаваецца. Выперся ў горад, каб патрапіць да начальніка, які вясковым людзям пенсійны рубельчык накідвае. Мне ж тае пенсіі даюць столькі, што ў жмені нябачна. У родным калгасе, які «Крэмаль» зваўся, за жыццё так знасіўся, што і расточкам пяменеў. Цэлы дзень соваюся, праўды шукаю. Мяне ў каршэль не гоняць, а далікатна падвядуць пад дзверы, увапхнуць у пакойчык, а самі ходу. Скрозь вумныя кабеты сядзяць, гладкія, чыста ўбраныя і ўсе над паперкамі вочы слепяць. А мужыкі сур'ёзныя, дзелавітыя, што міністры. Бачыш, колькі разумных, а я ўсё жыццё ў гамах хаджу. І бацька ў іх красаваўся, і маці, і бабця. Ватоўка і гамы — уся і радасць…

Дзядзька весела, з гумарам, апавядаў пра свой бясконцы шпацыр па казённаму дому, дзе баб харасцвенных, што кураслепу ў полі. І кожнай дай на добрыя валёнкі, паддзёўку цёплую.

Я спрабую нешта сказаць-параіць, але ў гэтым тлуме я і сам бездапаможны.

Дзядзька зірнуў на вераб'ёў, што ўселіся на кумпал бронзавага Ілліча, весела прагаварыў:

— Верабей, як і гладкія цёткі ў казённым доме, не сее, не жне, а лепшыя зярняткі дзяўбе.

***У жыцці многа дарог да шчасця***

Пад такім рамантычна-аптымістычным «гучаннем» праходзіла вечарына ў Слуцкай сярэдняй школе № 5 паўстагоддзя таму. І наш «9 Гэ» дазваляў сабе перад атрыманнем атэстата сталасці даць нырца ў краіну мары. А цяпер жа, падсумаваўшы пражытае паўстагоддзе, што брала разгон так рамантычна і ўзнёсла, аж душа спявала: «У жыцці многа дарог да шчасця», пара назваць і шчасліўчыкаў.

Гузіка Сціпана сцежка шчасця прывяла ў кацельную слуцкага гаркамгаса.

Пятра Акуліча гукнула на трактарны стан калгаса «Прамень камуны».

Дарога шчасця Міколы Козіка збочыла ў арцель «Вяровачнік»

Міхася Махлая закончылася на гароднінай базе мястэчка Бабоўня. Міхаська кожнай вясной тут гнілякі перабірае.

Ці шчаслівая Ганна Ляхавіч на мясцовай птушкафабрыцы?

Паліна Крывальцевіч — ударніца ўсіх пяцігодак на заводзе бетонных вырабаў…

І праўда, чыя ж доля шчаслівейшая? У бядотнай Эфіопіі апынулася Вольга Мімрык. Не хваліцца пра сваё шчасце і Паліна Казак. Яе ж жыццёвыя аглоблі «павярнулі» ў Дакар.

І зноў лякскат бубнаў і пра ўсё тое ж узнёсламе, рамантычна-напеўнае…

На жаль, жыццё ўсяго толькі адно. Пашанцуе, будзеш жыць у Парыжы, цешыцца на беразе Эгейскага мора ў Грэцыі . Але ж, працуючы ў задрыпанай сельгасарцелі «Вяровачнік», не вярэдзь душу, прыгадваючы, як на світанку жыццёвых спадзяванняў чулася хлапеча-бадзёрае:

— У жыцці многа дарог да шчасця.

▸ УРОК

# РЫЦАРЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА

Уладзімір АРЛОЎ

**Уладзімір Арлоў падрыхтаваў да друку новае выданне сваёй вядомай кніжкі гістарычных апавяданняў для дзяцей «Адкуль наш род». Зборнік павялічыўся на цэлае XX стагоддзе і ў тры разы «распаўнеў». Новыя апавяданні напісаныя і пра падзеі даўніх вякоў.**

**Прапануем юным чытачам разам з аўтарам пагартаць старонкі будучай кнігі.**

## Шляхта

Вы ўжо ведаеце, што знатныя роды ў нашай дзяржаве зваліся шляхтай. Да шляхты належалі кожныя дзесяць–дванаццаць са ста жыхароў Вялікага Княства Літоўскага. Гэта вельмі вялікая частка насельніцтва. У суседніх Расеі, Аўстрыі і Прусіі знатных людзей, якіх яшчэ называлі дваранамі, было ў дзесяць разоў меней — толькі адзін чалавек з сотні.

Шляхта валодала зямлёй і сялянамі і карысталася надзвычай шырокімі правамі. Шляхцічы былі вольнымі людзьмі. Яны вызваляліся ад усялякіх плацяжоў са сваіх уладанняў, маглі купляць, прадаваць і дарыць зямлю. Любы шляхціч меў права свабодна выехаць за мяжу. Шляхта судзіла сялянаў, а ейныя справы мог разглядаць толькі адмысловы шляхецкі суд.

Збіраючыся на мясцовыя з'езды-соймікі і на агульнадзяржаўны Сойм, шляхта ўдзельнічала ў кіраванні краінаю. Якраз яна выбірала вялікага князя, а таксама ўсіх суддзяў, у тым ліку і самага галоўнага — Трыбунала Вялікага Княства.

Найважнейшым абавязкам ліцвінскай шляхты была абарона Айчыны. Але шляхта не толькі ваявала. Яна давала дзяржаве палітычных і рэлігійных дзеячаў, вучоных, пісьменнікаў і асветнікаў.

## Пра што кажуць гербы

Кожны шляхецкі род ганарыўся сваім гербам.

Герб заўсёды меў назву і сведчыў пра вольнасць і незалежнасць гаспадара. Па гербе можна было вызначыць паходжанне і сваяцкія сувязі яго ўладальніка.

Разглядваць шляхецкія гербы вельмі цікава. На іх можна сустрэць выявы самых розных знакаў, рэчаў, раслін, жывёлаў і птушак. На гербе «Любіч», якім карысталіся больш за 500 родаў, мы бачым падкову з двума крыжамі. На гербе «Дарагаслаў» змешчаная страла. З герба магутнага магнацкага рода Радзівілаў глядзіць чорны арол.

Кожная выява на гербе мае сэнс. Каб дакладна зразумець, што азначае той альбо іншы герб, трэба ведаць навуку геральдыку. Яна дапамагае пазбегнуць смешных памылак. Да прыкладу, на гербах нярэдка сустракаюцца бараны і казлы. Нехта можа падумаць, што ўладальнікі гэтых гербаў былі неразумныя або ўпартыя. А геральдыка кажа, што дзве гэтыя жывёліны — вельмі паважаныя, бо яны азначаюць кіраўнікоў статка. Герб з такой выяваю паказвае, што ягоны гаспадар — правадыр, які ідзе наперадзе і вядзе за сабою іншых.

Шляхта шанавала гербы, бо яны нагадвалі аб продках ды іхніх слаўных справах і перамогах.



## Абаронцы дзяржавы

З шляхцічаў складалася аснова нашага войска. Паводле закона на вайну ішлі ўсе мужчыны, што мелі зямлю.

Магнаты, якім належалі велізарныя зямельныя абшары і тысячы сялянаў, ішлі ваяваць пад уласнымі сцягамі-харугвамі на чале вялікіх аддзелаў з баяраў і слугаў. Да прыкладу, у 1528 годзе князь Юрай Алелькавіч Слуцкі пасылаў у войска 433 кавалерысты, а князь Канстанцін Астрожскі — 426. Дробны шляхціч, у якога не было сялянаў, цалаваў зямлю з дзецьмі і выпраўляўся ваяваць сам.

Галоўная роля ў войску адводзілася кавалерыі. Яна дзялілася на капейнікаў і стральцоў. Капейнікі мелі дужэйшых коней і цяжкую зброю для блізкага бою. Стральцы на лёгкіх хуткіх конях стралялі па ворагу здалёк.

Каманду над злучанымі збройнымі сіламі дзяржавы прымаў гетман. Існавалі пасады вялікага (найвышэйшага) і палявога гетмана.

У мірны час баявым станам рабіліся пушчы, палі і лугі, дзе шляхцічы практыкаваліся ў коннай яздзе і валоданні зброяй.

Пра падрыхтоўку ваяроўліцвінаў пісаў тагачасны паэт Мікола Гусоўскі, з якім мы бліжэй пазнаёмімся ў адным з наступных апавяданняў:

*Князь наш загадваў ствараць*
*у сваіх уладаннях*
*Лагер ваенны пры кожным*
*паселішчы ў пушчах…*
*Выган пры вёсцы, і там ад відна*
*да сутоння*
*Носяцца коннікі з гіканнем*
*цугам па кругу,*
*Шабляй і стрэламі цэляць*
*у вешкі…*

*Звычай у коннікаў быў свае лукі*
*і стрэлы*
*Укручваць у клунак з адзежай*
*і гэтак сухімі*
*Потым выносіць на бераг…*
*Вось рынулі коні,*
*Пырханне чуеш адно, бачыш вушы*
*ды храпы,*
*А на стырне, уплішыся ў грывы,*
*мільгаюць*
*Конных галовы. Свабодную*
*левай рукою*
*Кожны грабе, памагае каню*
*выбірацца…*



## Мячы, дзіды, арбалеты

Войска Вялікага Княства Літоўскага было ўзброенае не горш, а часам і лепей за арміі іншых еўрапейскіх краінаў. Жаўнеры мелі агняпальную зброю — ручніцы і аркебузы, а таксама ручную, якую яшчэ называлі халоднай. Такая зброя падзялялася на некалькі відаў.

Да зброі блізкага бою належалі вострыя з абодвух бакоў мячы. Яны былі аднаручныя і двухручныя. Гэта значыць, што больш лёгкім мячом ваяр біўся адной рукою, а для цяжкога патрабавалася і другая. Гэткі меч мог быць блізу двух метраў удоўжкі і важыў пяць кілаграмаў.

Нашы майстры выраблялі выдатныя мячы. Захаваліся звесткі пра тое, як радаваліся тэўтонскія рыцары, калі захапілі ў палон славутага мечніка-ліцвіна Іллю. Яны прымусілі палоннага працаваць у сваіх майстэрнях, але для чужынцаў ён рабіў горшую зброю.

Калі ваяры сыходзіліся з ворагам вельмі блізка, у ход ішлі карацейшыя і вострыя толькі з аднаго боку цесакі і корды. Шляхцічы добра валодалі шаблямі, кінжаламі, шпагамі і канчарамі — мячамі з доўгім клінком-джалам, ад якога не ратавалі панцыры.

Грознай наступальнаю зброяй і ў вершнікаў, і ў пяхотнікаў былі дзіды, даўжыня якіх даходзіла да чатырох метраў. У баі з цяжкай варожай конніцай надзейна служылі абаронцам Айчыны алебарды. У гэтай зброі спалучаліся дзіда, сякера і крук, прызначаны для сцягвання кавалерыста з каня.

Добра дапамагала ў бітве абуховая зброя: сякеры, кляўцы (баявыя молаты для прабівання панцыраў), булавы і баявыя цапы — кісцяні.

З даўніх часоў заставаліся ў арсенале ліцвінскага войска лукі і арбалеты-самастрэлы. Страла з лука магла праляцець трыста метраў. Арбалет даставаў далей і меў большую прабіўную сілу, аднак у некалькі разоў саступаў луку ў хуткасці стральбы. Пакуль арбалетнік рабіў адзін стрэл, лучнік паспяваў стрэліць пяцьшэсць разоў.

Ад варожых стрэлаў, куляў і ўдараў ваяра абаранялі разнастайныя кальчугі, панцыры, шаломы і шчыты-тарчы. Свае панцыры і налобнікі мелі баявыя коні.

Апрача кавалерыі і пяхоты войска Вялікага Княства славілася артылерыяй. Гарматныя майстэрні тады называліся людвісарнямі. У сярэдзіне XVI стагоддзя ў Вільні працавала вядомая ва ўсёй Еўропе людвісарня, дзе за дзень маглі вырабіць 18 гарматаў, якія стралялі чыгуннымі ядрамі. Яшчэ адна знакамітая людвісарня была ў Нясвіжы. Шмат якія нясвіжскія гарматы праславіліся ў бітвах і нават атрымалі імёны.

## Мы — ліцвіны!

У Вялікім Княстве Літоўскім, як і ў іншых еўрапейскіх краінах, існавала рыцарства.

Упершыню пра нашых рыцараў гаварылася ў грамаце, якую ў 1387 годзе падпісаў князь Ягайла, які потым стаў польскім каралём.

Беларускае рыцарства на чале з Вітаўтам Вялікім здабыло сабе неўміручую славу пад Грунвальдам. Праз некалькі гадоў да нашага князя прыехалі паслы з Чэхіі. Яны прапанавалі яму стаць чэшскім каралём і бараніць іхнюю краіну ад нямецкіх крыжакоў. Вітаўт застаўся на радзіме, але пасла ў на падтрымку чэхам 5-тысячнае войска пад камандаю свайго пляменніка Жыгімонта Карыбутавіча. Беларусы, якіх называлі тады ліцвінамі, ваявалі поплеч з братамі-чэхамі больш за дзесяць гадоў. І пазней рыцары-ліцвіны шмат разоў перамагалі ворагаў, абараняючы родную зямлю і дапамагаючы суседзям.

Рыцарамі лічыла сябе ўся шляхта.

Правы і абавязкі рыцараў былі падрабязна запісаныя ў законах. Правілы рыцарскіх паводзінаў перадаваліся ў шляхецкіх сем'ях ад бацькоў сынам. Рыцары мусілі заўсёды паказваць сілу, мужнасць і розум. Але не для таго, каб проста выхваляцца імі, а каб бараніць слабых, шанаваць жанчын, падтрымліваць царкву. Разам з тым з юных гадоў рыцар не забываў пра адукацыю і навуку.

Дзеля прымнажэння славы рыцар мог зрабіць падарожжа

ў любую, апрача непрыяцельскай, краіну. Закутых у панцыры вояроў з берагоў Дзвіны, Дняпра і Нёмана бачылі пры дварах уладароў розных дзяржаваў.

Добра спраўляцца са шматлікімі нялёгкімі абавязкамі рыцар мог толькі тады, калі старанна клапаціўся пра ўзбраенне. Закон забараняў ваярам мяняцца конямі і зброяй, каб лепей паказаць сябе на гетманскім вайсковым аглядзе. Махляроў сурова каралі.

Рыцарскія правілы не дазвалялі паражаць праціўніка ззаду. Пячатка ганьбы чакала таго, хто конны забіў пешага або ўзброены — бяззбройнага. Здрада і баязлівасць клалі вечнае кляймо не толькі на ваяра, але і на ягоных нашчадкаў.

Кожны рыцар здзяйсняў подзвігі дзеля гонару Айчыны і дамы свайго сэрца. У кагосьці гэта была каханая дзяўчына ці жонка, у кагосьці маці або сястра. Недзе ў Полацку, Вільні, Нясвіжы ці Горадні дама чакала, калі яе рыцар вернецца з вайны ці далёкай вандроўкі. Але гаварыць пра сыноў, братоў ці каханых стараліся няшмат. Спрадвеку жанчыны ў Беларусі верылі, што, калі мужчына ваюе, нельга называць ягонае імя ўголас, бо тады ён можа неспадзявана азірнуцца і трапіць пад варожы ўдар…

## Хто мацнейшы?

І ў мірныя часы рыцары надоўга не развітваліся са зброяй, бавячы час на турнірах.

Турніры, дзе вызначаліся самыя дужыя, хуткія і спрытныя, можна параўнаць з цяперашнімі спартыўнымі спаборніцтвамі. Правілы барацьбы былі падобныя ва ўсёй Еўропе, таму кожнае такое спаборніцтва збірала вояроў з розных краінаў.

На турнір рыцары з'яўляліся за чатыры дні да яго пачатку. Першы вечар адводзіўся святочнай вячэры і танцам. Назаўтра суддзі абмяркоўвалі кандыдатуры ўдзельнікаў. Для гэтага на ўсеагульны агляд выстаўляліся іхнія баявыя шаломы і сцягі. Пасля таго, як гучна называлі імя рыцара, кожны з прысутных меў права сказаць сваё слова. Калі пра кандыдата даведваліся нешта нядобрае, ягоны шалом скідвалі на зямлю, і гэты чалавек мусіў вяртацца дахаты.

На трэці дзень рыцары, пакуль што без зброі, прыязджалі на месца спаборніцтваў, якое называлася рысталішчам. Яны ўрачыста прысягалі выконваць усе правілы турніру. Уздоўж рысталішча ладзіліся трыбуны для гледачоў. За турнірамі, што адбываліся на гарадскім пляцы, можна было за плату назіраць з вокнаў блізкіх дамоў. Зрэдку турнірныя гульні праходзілі і ў вялікіх залях палацаў і замкаў.

Дзень спаборніцтваў пачынаўся з таго, што рыцары апраналі панцыры. Зброя ўдзельнікаў, найперш дзіды, павінна была мець прыкладна аднолькавую якасць і даўжыню. Коні таксама падбіраліся аднаго росту, каб праціўнікі мелі роўныя ўмовы і перамога залежала толькі ад майстэрства.

Спаборнікі выпрабоўвалі сілу і ваярскае ўмельства і камандамі, і сам-насам. Праціўніка трэба было выбіць з сядла альбо збіць на дол разам з канём. Пры гэтым забаранялася калечыць чужога каня, біць ззаду або ніжэй пояса, нападаць на рыцара са збітым шаломам.

Бывала, што бай зацягваліся да позняга вечара. Але нарэшце трубачы гралі адбой, і на святочнай вячэры ўручалі ўзнагароды. Праўда, перад гэтым спаборніцтвы яшчэ працягваліся ў выглядзе ўзаемных застольных жартаў. Часам яны былі вясёлыя, а часам маглі і абразіць.

Аднаго разу на турніры ў Вене немцы ўзяліся пацяшацца над тым, што ў рыцараў з Вялікага Княства і Польшчы горшае ўзбраенне. Нехта з нашых запытаўся: «Чаму ж тады вы з добрай зброяй прайгралі бітву пад Грунвальдам?» Немцы не супакоіліся і для большай крыўды прапанавалі супернікам купіць за сто злотых свайго самага старога і маларослага каня. Ліцвіны з палякамі заплацілі грошы, а на наступны дзень запрасілі крыўдзіцеляў на абед, каб пачаставаць свежаю алянінай. Немцы нахвальвалі смажанае мяса, пілі віно і весяліліся. Пры канцы абеду ім на вялікім падносе прынеслі галаву і ногі з капытамі ад іхняга каня. Зразумеўшы, якога «аленя» яны з'елі, нямецкія рыцары схапіліся за мячы, але правілы змусілі іх сесці на месца і прысаромлена заціхнуць.

Такія вось здараліся тады суровыя жарты, аднак і часы былі не лагодныя.

## Турніры ў Вільні

Многія ліцвіны, як тады называлі беларусаў, выпраўляліся на спаборніцтвы ў заходнееўрапейскія дзяржавы і вярталіся адтуль з узнагародамі. Замежныя турнірныя кнігі мелі асобныя раздзелы, прысвечаныя Вялікаму Княству Літоўскаму. Там змяшчаліся гербы рыцараў і кароткія аповеды пра здабытыя імі перамогі.

У сваю чаргу ваяры з Францыі, Ангельшчыны, Нямеччыны, Італіі, Чэхіі, Вугоршчыны (Венгрыі) ды іншых краёў прыязджалі памерацца сіламі ў нашую сталіцу Вільню. Асабліва часта турніры адбываліся ў нас у XVI стагоддзі, калі вялікім князем быў Жыгімонт Аўгуст. Некалькі тысяч гледачоў бачылі ў 1546 годзе бой, у якім сышліся ліцвін Габрыэль Тарла і прускі рыцар Лягендорф. Доўгае і зацятае адзінаборства выйграў, хоць і быў паранены, наш зямляк.

Праз год на вялікія рыцарскія спаборніцтвы ў Вільню з'ехаліся рыцары з дзесяці краінаў. Апрача ваярскіх двубояў турнірнікі бралі прыступам «пацешны» драўляны замак. На рысталішча выходзіў і перамагаў сам гаспадар Жыгімонт Аўгуст. Але найбольш запомнілася віленчукам і гасцям, як, надзеўшы панцыр, у жартоўны бой адразу з двума рыцарамі ўступіла ліцвінка Зоська Доўгая, якую ўся Вільня паважала за спрыт і весялосць. Ваяры-мужчыны крыху разгубіліся. Зоська тым часам нядрэнна ўпраўлялася з дзідаю, і суддзі пад рогат прысутных абвясцілі кабету мацнейшай.

Самым доўгачаканым момантам было ганараванне найлепшых рыцараў. Калісьці пераможца проста забіраў сабе каня і зброю суперніка. Потым з'явіліся іншыя ўзнагароды: срэбны панцыр, меч з залатой рукавяткай, залаты рыцарскі пас і такія самыя астрогі-шпоры.

Прызы прысуджаліся і тым рыцарам, якія найдаўжэй прат-







рымаліся на рысталішчы і захавалі некранутымі аздобы на шаломах. Ушаноўвалі таксама за самы трапны ўдар і самую вялікую колькасць скрышаных дзідаў праціўніка. Адмысловы прыз чакаў рыцара, што прыехаў на турнір з найбольш далёкай краіны.

Галоўную ўзнагароду звычайна ўручала жанчына, якую выбралі «каралевай любові». Побач з ёю лепшыя месцы на трыбунах займалі дамы, якія былі ганаровымі суддзямі.

## Нашчадкі сарматаў

Шляхта Вялікага Княства Літоўскага лічыла сябе нашчадкамі ваяўнічага, вольнага і ўдачлівага народа — сарматаў. Калісьці сарматы валодалі велізарнымі еўрапейскімі абшарамі і кідалі выклік магутнаму Рыму. Паступова шляхцічы пачалі называць сябе сарматамі, і ў выніку два гэтыя словы сталі азначаць адно і тое ж.

Бацька выхоўваў сыноў у «сармацкіх» звычаях. З малых гадоў шляхціч-ліцвін ведаў, што найдаражэйшае ягонае багацце — конь і шабля.

У мірны час шабля вісела на сцяне ў гаспадаравай спальні, але доўга ніколі не адпачывала. Сармат мусіў перадаць сынам не толькі зброю, але і ўласныя сакрэты абыходжання з ёю.

Не менш, чым за зброяй, сапраўдны сармат сачыў за сваім парадным адзеннем. Яго ўпрыгожвалі перламі, золатам, футрам гарнастая. У модзе былі накідкі са шкураў драпежных звяроў: ваўкоў, рысяў, мядзведзяў. Яны падкрэслівалі ваяўнічасць і сілу гаспадара. «Сармацкія» кашулі, каптаны ды іншае адзенне шылі з дарагіх і яркіх тканін пурпуровага, блакітнага, жоўтага і зялёнага колераў. Багатыя і пышныя з добрым густам уборы паслоў Вялікага Княства ўражвалі прыдворных усёй Еўропы.

Але галоўнае было не адзенне, а тое, што шляхцічы-сарматы сапраўды вызначаліся рыцарскімі паводзінамі і адданасцю роднай зямлі. Сваім дэвізам яны абралі словы: «Жыццё — Айчыне, гонар — нікому!»

І праз стагоддзі нашыя шляхцічы захавалі добрыя даўнія традыцыі. Некаторыя памылкова называюць шляхту былога Вялікага Княства Літоўскага польскай. Напраўду ж яна, хоць і карысталася пазней польскаю мовай, ніколі не захоплівала гэтай зямлі, а наадварот, заўсёды бараніла яе ад ворагаў, паўставала супроць акупантаў, добра ведала мову і звычаі продкаў. Якраз з беларускай шляхты выйшлі паўстанцкія правадыры, палітыкі, культурныя дзеячы XIX — пачатку XX стагоддзяў.

Сёння нашых прапрадзедаўсарматаў можна ўявіць, дзякуючы старадаўнім партрэтам. Іх вы пабачыце, калі прыйдзеце на экскурсію ў нацыянальныя гістарычны і мастацкі музеі Беларусі.

## «Срэбны Адзінарог» і «Жалезны Воўк»

Звычаі, правілы і забавы рыцараў Вялікага Княства не забытыя і ў наш час. Іх зберагае моладзь з рыцарскіх клубаў. Толькі ў Менску такіх клубаў блізу пятнаццаці, а ва ўсёй Беларусі — некалькі дзясяткаў.

Цяперашнія рыцары маюць майстэрні, дзе вырабляюць сабе баявы рыштунак, за які не сорамна было б і пяць стагоддзяў таму. Дзяўчаты шыюць паводле даўніх узораў сукенкі, развучваюць танцы, якія выконвалі іхнія прабабулі ў палацах Вітаўта і Жыгімонта Аўгуста.

Юнакі з беларускіх рыцарскіх клубаў штогод заваёўваюць узнагароды на святкаванні Грунвальдскай перамогі ды іншых сучасных турнірах. У розных краінах ведаюць пра менскія клубы «Ордэн Паўночнага Храма», «Срэбны Адзінарог», «Рыцары Вялікага Княства», пра палачанаў і навапалачанаў з «Жалезнага Ваўка» і «Чорнага Войны», магілеўцаў з «Барысфену».

У Менску праходзіць фэст старадаўняй культуры «Белы замак». Разам з рыцарскімі баямі ў яго праграме — спаборніцтвы лучнікаў і арбалетнікаў, конкурсы сярэднявечных убораў і канцэрты тагачаснай музыкі. На некалькі летніх дзён у рыцарскую сталіцу ўсёй Усходняй і Цэнтральнай Еўропы ператвараецца наш старажытны Навагрудак, які быў першай сталіцаю Вялікага Княства Літоўскага.

Шануючы памяць сваіх герояў, аднаўляючы іх традыцыі, мы кажам свету, што беларусы — еўрапейскі народ з багатай гісторыяй.

## Пытанні і заданні

1. Што такое шляхта? Якія правы мелі шляхцічы?
2. Якая частка насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага належала да шляхты?
3. Пра што сведчылі шляхецкія гербы?
4. Што было галоўным абавязкам шляхціча?
5. Раскажыце, як шляхта бараніла дзяржаву.
6. Што вы ведаеце пра падрыхтоўку вояроў-ліцвінаў?
7. Якой зброяй ваявалі нашыя продкі?
8. З якіх часоў у Беларусі з'явіліся рыцары? У якой славутай бітве яны праславілі сябе ўпершыню?
9. Якія правы і абавязкі мелі рыцары? Што ім забаранялася рабіць?
10. Што такое рыцарскія турніры? Як яны ладзіліся?
11. Паспрабуйце намаляваць рыцараў пад час спаборніцтваў.
12. Раскажыце пра турніры ў нашай старажытнай сталіцы Вільні.
13. Каго прызнавалі пераможцамі турнірных баёў?
14. Чаму нашая шляхта называла сябе сарматамі? Што вы ведаеце пра іхнія звычаі? Які дэвіз мелі сарматы?
15. Спытайце ў бацькоў, ці належыце вы да шляхецкага роду. Няхай яны раскажуць вам пра знакамітых продкаў, нават калі тыя і не былі шляхцічамі.
16. Калі вашыя продкі былі шляхцічамі, даведайцеся пра іх гербы і намалюйце іх.
17. Чым займаюцца сучасныя рыцары? Ці ёсць у вашым горадзе рыцарскі клуб?

ЗАПІСЫ

# У ГАСЦЯХ У БРАТОЎ СЛАВЕНЦАЎ

**Ніл ГІЛЕВІЧ**



## 1966

…У Любляне — падземны пераход да вакзала з пуцей – такі, як і ў Мінску, толькі наш прыгажэйшы. Здаў я куфар у «гардэробу», узяў на руку плашч (дождж перастаў, праўда) і пайшоў. Пайшоў у ноч, у незнаёмую ноч у незнаёмым горадзе. Пачатак адзінаццатай. Знаю, што на Захадзе гарады ўкладаюцца спаць раней, чым у нас. Якісь студэнт (па выгляду) правёў мяне да аўтобуснай «станцыі» (не проста паказаў, а вельмі ахвотна правёў) і растлумачыў, як дабірацца да «філазофскай факультэты».

…Вось і гарадок з некалькіх карпусоў: яшчэ гарэць сям-там агні. Знаходзім корпус № 3, заходзім, праважаты (я ўжо ведаю, што яго завуць Барыс Рэбернік) тлумачыць дзяжурным студэнтам, хто я і што я. Гляджу — студэнты без энтузіязму выслухалі і як бы трохі разгубіліся. Лаўлю іх фразы і разумею, што ў спіску такога, на жаль, няма, — спісак ужо ў іх руках, яны глядзяць адзін і другі раз і зноў паўтараюць, што ў спіску з «Савецкай звезы» ніхто не значыцца. Вось табе, бабулька, і Юр'еў дзень! Здароў табе! Ляцеў, спяшаўся за тысячы вёрстаў, а выходзіць – асадзі назад! Нават у спіску няма! Гляджу сам спісак, мільгаюць адрасы: Praha, Hamburh, Italia, Budapest...! Мінска няма. «Што ж будзем рабіць? — усміхаюся ім. Чую: праваднік лапоча «ютро, ютро», значыць — разбярыцеся заўтра, а цяпер прымайце чалавека, каб адпачыў з дарогі. Так нарэшце апынуўся ў студэнцкім ложку ў чыстых простынях вялікі змагар за славянскае пабрацімства. Сон, не гледзячы на няпэўнасць і перажытыя хваляванні, быў надзіва смачны і моцны.

**18.VII.** А восьмай раніцы ўжо быў на факультэце… Уступнае слова рабіў пісьменнік Божыдар Борко, які на перапынку ўзяў у мяне «ЛіМ» з перакладамі і сказаў, што дасць аб гэтым інфармацыю ў газеце «Delo» (галоўны ўрадавы орган Славеніі). Усе выкладчыкі сустрэлі мае пераклады надзвычай радасна — з акцэнтацыяй на вялікай павазе, якую нібыта я гэтым самым аказаў Славеніі. Відаць, што людзі вельмі даражаць нават дробным фактам зацікаўленасці іх культурай і працай дзеля яе папулярызацыі.

**20.VII.** І сёння ўсе гадзіны правёў з намі Ёжэ Тапарышыч — надзвычай сімпатычны чалавек і фанатычна закаханы ў роднае слова вучоны. А потым пайшлі на экскурсію ў бібліятэку — Нацыянальную і ўніверсітэцкую адначасова (так і называецца «Narodna in univerzitetna knjiznica»). Бібліятэка — выдатная. Кніг — каля мільёна. Залы — дзве — невялікія — толькі для вучоных, для працы навуковай, а не для масавага карыстання мастацкай літаратурай, «чыталкі» такой, як у нашай Ленінцы, няма. Для масавага чытача ёсць дзясяткі іншых бібліятэк. Дарэчы, у Люблянскім універсітэце кожны факультэт і нават аддзяленне маюць сваю бібліятэку — так, напрыклад, у аддзяленні славянскіх моў і літаратур бібліятэка на 35 000 тамоў (!), на гістарычным аддзяленні — на 16000.

Дырэктар бібліятэкі — прафесар Яро (Яраслаў) Долар — абвадзіў па залах, паказаў картатэкі (каталогі), расказаў гісторыю бібліятэкі. Доктар Бранко Берчыч пазнаёміў з аддзелам рукапісаў. Вось тут я і ахнуў: пад шклом агромністая кніга з кірылічным пісьмом на пергаменце, а ўнізе подпіс: Супрасльскі летапіс. Арыгінал XI стагоддзя! Арыгінал (частка, сказаў Берчыч, 112 старонак) славутага беларускага летапісу! Сюды трапіла гэтая бясцэнная рэліквія з Варшавы — ад каго і калі — пакуль не высветлена. Цікава, ці ведаюць у нас аб гэтым? Ці зроблена копія?

**29.VII.** …У 6 гадзін заехаў па мяне Янез, узяў каля «універзы» француза Костаню Дзідзіера і павёз нас у Саюз пісьменнікаў. Там ужо былі Віцязслаў Хечка і Яраслаў Панэк — першакурснік з Прагі, амаль дасканала ведае славенскую. (Зацікавіў я яго — пазней за сталом — Беларуссю, сказаў, будзе вывучаць беларускую мову)…

Гаварылі ўсе мы і многія з гаспадароў — аб тым, як лепш мацаваць кантакты і прапагандаваць славеншчыну за мяжой. Госці тут жа выступілі па тэлебачанні — без падрыхтоўкі. Я прачытаў пераклад з Міле Клопчыча («Тры жаданні дзіцяці»). Былі канкрэтныя прапановы з абодвух бакоў... Сказалі, будуць падбіраць кандыдатуру, хто б зацікавіўся беларускай паэзіяй і стаў перакладаць яе на славенскую мову. Калі я сказаў, што хачу падрыхтаваць анталогію славенскай паэзіі — прагучалі воплескі.

Па афіцыйнай частцы адбылася сяброўская вячэра — з віном і гарачай закускай. Гаварылі на тэмы міжнацыянальных адносін. Владо Хаб'ян сказаў: «Калі б нас было столькі, колькі вас, мы б захапілі сабе яшчэ палавіну Еўропы, а не толькі вярнулі Трыест. Мы б такога не пацярпелі і аднаго дня — каб школы ды працавалі не на роднай мове. Або інстытуты. Мы ўжо дабіліся і мытню перавялі на славенскую. Хто б ні працаваў на мытні — серб, македонец — павінен умець гаварыць па-славенску. Мы заявілі, што інакш чай парушаецца Канстытуцыя». Слухаў я гэтага чалавека і бачыў, што з такімі людзьмі сапраўды жартаваць нельга.

## 1973

Веласіпедыстаў на вуліцы стала ў сто разоў менш — машын у сто разоў больш, за 7 гадоў, як я не быў тут. Зусім не тая Любляна.

І ў некалі ціхай Любляне ужо ад машын не дыхнуць...

Думаю: чым можа «ўзяць» маленькі колькасна народ, малая нацыя? Вядома, не размахам індустрыяльнага будаўніцтва, не маштабамі матэрыяльнай вытворчасці, тым больш — не ваеннай сілай. Можа ўзяць — толькі культурай. Толькі высокім узроўнем бытавой і духоўнай культуры. «У культуры няма вялікіх і малых народаў» (Георгі Дзімітроў). Малы народ, калі ён мае вялікую культуру, прымусіць паважаць сябе і лічыцца з ім. Але для гэтага трэба дбаць пра нацыянальную культуру, трэба ўмець падаць яе, паказаць свету, ганарыцца ёй. Славенцы гэта разумеюць. Іх бытавая культура — нам яшчэ да такой далёка. Пераход вуліцы і ўваход у аўтобус — адсюль яна пачынаецца. Харчэўні! Калі мы дажывем да такой культуры кухні — тады будзе пара гаварыць аб культуры наогул. Нават пісаць няёмка: ні ў адным рэстаране Мінску ці Масквы не еў такіх смачных страў (свежых, гарачых, прыпраўленых), як тут — у сталовай-самаабслужцы,— з той жа самай бульбы, мяса і зеляніны. А салаты! А сокі! Культура кухні... Ну, а культура гандлю? Тут толькі горка ўсміхнешся, успомніўшы наш гандаль…

Калі хто скажа, што Югаславія бедная краіна — не верце! Не ведаю, як у іншых рэспубліках, а ў Славеніі — завалы мясных прадуктаў выдатнай якасці і смакаты; калбас і іншых вырабаў са свініны і гавядзіны – трашчаць магазіны. А магазінаў — безліч. І блізка нічога падобнага на чаргу. Ні разу не бачыў чаргі — ні ў якім магазіне! Думаю: які сабекошт магазіна? Як не вылятаюць у трубу? Здаецца ж, мала пакупнікоў: ну, што за мясны магазін, калі ў ім зрэдку паявіцца адзін чалавек? І вось жа — тысячы магазінаў (у горадзе каля 200 тысяч жыхароў)…

Люблянскія кнігарні — разбягаюцца вочы! Такое багацце і яркасць афармлення. Бадай — ніводнай кнігі ў шэрай, бляклай, сумнай апратцы! Такой яркасці, стракатасці вокладак зроду не бачыў. І зноў — культура. На гэты раз — культура выдання, культура афармлення, за якой — павага да чытача. Толькі дзівішся: якая папера! Які матэрыял на вокладку! Што праўда, кнігі дарагія — дык жа ёсць за што плаціць. Каму трэба — купіць. Каму не трэба — дарам не возьме. Зрэшты, дарагавізна залежыць ад характару выдання. Ёсць і адносна танныя.

Прыглядаюся да людзей, да іх твараў: вельмі лёгка прыняць за беларусаў (толькі — вопратка, асабліва ў жанчын — розніцца). Жанчыны — у сталым веку — амаль усе мажныя, ва ўсякім разе — не худэцкія; твары простыя, валасы — большасцю цёмна-русыя, шатэны, ёсць многа зусім русых. Але ў абліччах нічога «турэцкага» — як у балгар або сербаў, мяккасць і дабрыня на тварах, у вачах. У кампаніі вельмі вясёлыя, любяць жартаваць і пець. Песні — не скажу, каб надта багатыя і разнастайныя, пераважна — шлягернага тыпу, на аўстрыйскі (цірольскі) лад (ва ўсякім разе – усе тыя, што я чуў). Не заўважыў багацця мелодый, шырыні, распеўнасці, багацця рытмаў і інтанацый, як у беларускіх.

Калі горы не вельмі высокія — як у Карпатах, як тут, у Славеніі — гэта надта прыгожа. Усе горы пакрыты лесам, а сям-там на схіле — на чорным фоне лесу — белы храм Божы (касцёл — у бляску вечаровага сонца).

Ехалі пераважна далінамі паўз рэчкі і рэчачкі — неглыбокія, па каменнях перакатваюцца, журчаць, а паабапал — камень, зарослы мохам, стромы — у кустоўі і дрэвах. Хараство незвычайнае.

Малыя гарадкі — як нашы мястэчкі, але — каменныя. Асабліва прывабнасць іх — у стыку сяла і горада. У іх жыве дух сяла, увесь побыт — сельскі (гароды, куры, скаціна, азярody з сенам — «казольцы»), і ў той жа час — нешта ад горада: плошча, лавачкі (крамкі), рэстаранчык... Падобна і ў Балгарыі.

Глядзеў рукапісы і інканабулы ў нацыянальнай бібліятэцы (яна ж — універсітэцкая). Супрасльскі летапіс. Выданні часу вайны: «Славенскі веснік» — антыфашыцкі часопіс, на шклографе, май 1941 г. «Хто вінават? Вінават імперыялізм»... Зборнік Бора — і на шклографе і з друкарні (1942). Рукапісы (арыгіналы) Прэшэрна, Ашкерца, Леўстыка, Грэгорчыча, Жупанчыча, Цанкара і іншых. Святыні. Дух святасці ва ўсёй бібліятэцы. У фае над лесвіцай — арыгінальны бюст Цанкара. Будынак арыгінальны. Масіўныя калоны ўздоўж лесвіцы. Мармур, цёмны мармур. Цішыня. На вякі ўсё разлічана.

Сустрэча ў Саюзе пісьменнікаў. Былі: Антон Інгаліч (стары, гадоў 70), Бажыдар Борка (журналіст, гадоў 70), Яро Далар, Францэ Філіпіч, Дане Зайц, Тоне Паўчэк. Былі і нашы з «універзы» Зор, Мацяж і Логарава. Чытаў свае пераклады. Прынялі з апладысментамі. Размова была крыху дзяжурнай. Тым не менш. Вельмі зацікавіў іх Быкавым. Сёлета выходзіць зборнік яго аповесцяў, на наступны год, сказалі, «заплануем» зноў. Зрэшты, «заплануем» — не тое слова. Нічога там не плануецца. Цікавае, вартае — з іх пункту гледжання — ідзе з ходу.

Слухаў выступленне мужчынскага актэту. Выдатны ансамбль! Вельмі высокі прафесіянальны ўзровень, хаця — кожны з іх дзесь працуе (у школе і г. д.).

На просьбу Мікіты Хрушчова: «Ну, а что-нибудь русское, из старых народных песен?» — узялі ды гакнулі: «Жило двенадцать разбойников, их атаман Кудияр». Не па нутру прыйшлося Хрушчову. Расказваюць са смехам аб гэтым у Славеніі…

Уважлівасць да рускіх (савецкіх) выключная. Нават маскоўскім студэнткам (дзве дзяўчыны) аказана столькі ўвагі, як ніякім з іншых краін.

Развітанне было вельмі сардэчным. Каб адвезці на вакзал, заехалі за намі, савецкімі, у гасцініцу: прафесар Логар, дырэктар семінара Кмецл, Якапін і Зор. Усе былі на вакзале. Кожны ўручыў гасцінцы. Кмецл — па цэлай торбе яды на дарогу. А мне — сюрпрыз: на вакзал прыйшоў пабачыцца са мной Цырыл Космач! Абняў мяне. Нашы абалдзелі: ён — жывы класік, аб ім была лекцыя на семінары. Былі ўражаныя і мае славенскія сябры. Космач толькі што прыляцеў са Скандынавіі (быў там разам з Марцінкявічусам і Міхалковым). Пачуў, што я ў Славеніі і што ад'язджаю, і — на вакзал. Цягнік спазняўся, і мы пайшлі ў рэстаран, пасядзець за півам. Сумленны, сапраўдны мастак слова. Думка Космача пра выданне кніг у Славеніі: «Вялікія дзяржавы могуць дазволіць сабе выданні, якія прачытаў у цягніку і выкінуў. Мы — не. Хоць дарагія — але каб гэта было мастацтва. Да ўсіх рэчаў — у нас такі падыход. Бо — чым можа ўзяць колькасна малы народ? Узроўнем культуры. Вышынёй духа».

Мудра — для ўсіх і на ўсе часы.

1973

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 280-17-91. Мінск-25, а/с 91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 1 КАСТРЫЧНІКА, ПЯТНІЦА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05** Серыял «Ганначка» (Расія).
**10.00** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.55** Дэтэктыўны серыял «Апошні кардон» (Расія).
**12.10** Камедыя «Кітайская бабуля» (Расія).
**13.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**14.05** «Славянскі базар». Абранае.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Ён сэрцам песню адчуваў». Дакументальны фільм.
**15.55** Меладраматычны серыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу» (Расія).
**16.45** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**17.50** Дэтэктыўны серыял «Апошні кардон» (Расія). Заключная серыя.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Серыял «Ганначка» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.55** Прэм'ера. Фантастычны трылер «Чалавек, які ведаў усё» (Расія).
**00.10** Моладзевая камедыя «Бабнік» (ЗША).
**01.55** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.15** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Шальны анёл». Шматсер. фільм.
**12.15** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі? у Беларусі». Восеньская серыя гульняў.
**22.30** «Наша Белараша».
**23.05** Меладрама «Дзіўная лёгкасць».
**01.15** Нашы навіны.
**01.30** Навіны спорту.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Жорсткі бізнэс». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** Прэм'ера. «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял.
**15.35** Фінальны турнір тэлевізійнай гульні «Брэйн рынг».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Ля парадная пад'езду».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Прэм'ера! Ток-шоў «Лёс».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Няўдачлівыя». Францыя-Мексіка, 1981 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.10** Фільм «Падзямелле цмокаў». ЗША-Чэхія, 2000 г.
**02.00** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Час футболу.
**08.30** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Лірычная камедыя «Нашы суседзі» («Беларусьфільм»).
**12.05** Дакументальны фільм «Ігар Лучанок. Мелодыя лёсу».
**12.55** Гаспадар.
**13.25** Медычныя таямніцы.
**13.55** Меладраматычны серыял «Пакахай мяне зноў» (Мексіка).
**15.00** Мультсерыял «Драконьчык і яго сябры» (Канада).
**15.10** Пазакласная гадзіна.
**15.25** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.15** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**17.20** Усё аб бяспецы.
**17.50** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**18.55** Хакей. КХЛ. Барыс (Астана) - Дынама (Мінск) . У перапынку: Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.10** «Бітва экстрасэнсаў».
**23.20** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.50** «Пра мастацтва».
**00.20** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд тура.
**01.15** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

**РОССИЯ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.25** «Кулагін і партнёры».
**11.55** Тэлесерыял «Земскі доктар». Расія, 2010 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** «Пакой смеху».
**16.05** Прэм'ера. «Формула кахання». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.25** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**20.25** Тэлесерыял «Земскі доктар». Расія, 2010 г.
**22.20** Навіны - Беларусь.
**22.30** Прэм'ера. «Юрмала-2010». Фэст гумарыстычных праграм.
**00.25** Камедыя «Вуліца поўная нечаканасцяў».

**НТВ**

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Рускія сенсацыі».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.05** «Лепшы горад Зямлі».
**12.00** Дэтэктыўны серыял «Угро».
**13.00** Сёння.
**13.30** Гістарычны серыял «Спадары прысяжныя».
**15.10** «Асабліва небяспечны!».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.00** Прэм'ера. «Улада сну».
**22.15** «Нтвшнікі».
**23.25** Прэм'ера. Трылер «Хто вы, містэр Брукс?».
**01.40** «Ты Расія, мая Расія». Канцэрт Аляксандра Новікава.

**EUROSPORT**

**09.30** Веласпорт. Чэмпіянат свету (шашэйныя гонкі). Да 23 гадоў. Мельбурн (Аўстралія).
**11.00** Тэніс. Турнір WTA. Токіо (Японія). 1/2 фіналу.
**14.00** Летні біятлон. Чэмпіянат свету. Польшча.
**15.00** Настольны тэніс. Кубак свету. Жанчыны. Каманды. Фінал. Дубай (ААЭ).
**15.30** Настольны тэніс. Кубак свету. Мужчыны. Каманды. Фінал. Дубай (ААЭ).
**18.00** Летні біятлон. Чэмпіянат свету. Польшча.
**19.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 140. Ліберац (Чэхія).
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 140. Ліберац (Чэхія).
**20.45** Конны спорт. Сусветныя конныя гульні. Выездка. Кентукі (ЗША).
**22.15** Боўлінг. Тур PBA. ЗША. Часопіс.
**23.15** Самыя моцныя людзі планеты. Гран-пры суперсерый. ЗША.
**00.15** Кіберспорт. Турнір Extreme Masters. Шанхай (Кітай).
**00.45** Летні біятлон. Чэмпіянат свету. Польшча.
**01.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 140. Ліберац (Чэхія).

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.50** Сальда (эканамічная праграма).
**08.05** Без рэтушы: «Фядора, якая лечыць», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**08.35** Форум: «Мільярды для рэгіёнаў».
**09.15** Басаножам па свеце (спазнаваўчая праграма): «Горад у джунглях».
**09.40** Беларусы ў Польшчы.
**10.00** «100 хвілін вакацыяў», тэлесерыял.
**10.25** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 2, 13 серыя.
**11.15** «Фальшываманетнікі. Вяртанне «Згаі», серыял: 8 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Чароўнае дрэва», серыял.
**17.30** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 2, 13 серыя.
**18.15** Блізкая гісторыя. Іншы пагляд: «З выцягнутымі рукамі», дак. фільм, 2006 г., Польшча: ч. 1.
**19.10** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў: «Еўразвяз і свабодная прэса».
**19.25** Калыханка для самых маленькіх.
**19.35** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.00** «Чаму дэмакраты?», цыкл рэпартажаў: 4 серыя: «У пошуках Гандзі».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Госць «Белсату».
**21.40** «Дзеці вялікага возера», дак. фільм, 2008 г., Расія.
**22.10** «Дазнанне», маст. фільм, 1982 г., Польшча.
**00.00** Аб'ектыў.

## 2 КАСТРЫЧНІКА, СУБОТА

**06.50** Дакументальна-пазнавальны серыял «Асабнякі, дзе вяршылася гісторыя» (Францыя).
**07.20** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.35** Пазнавальны серыял «Чалавек супраць дзікай прыроды» (ЗША-Вялікабрытанія).
**10.30** Дакументальны цыкл «У пошуках ісціны» (Украіна).
**11.25** Эксцэнтрычная камедыя «Дванаццаць крэслаў» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.10** «Праверка чутак». Інфармацыйна-аналітычная перадача.
**16.45** Відэафільм АТН «Дзеці Еўрабачання: Ксенія Сітнік».
**17.10** Відэафільм АТН «Гараджане»: Мінск».
**17.40** Відэафільм АТН «Іўеўскі малітваслоў» цыклу «Зямля беларуская».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Новая хваля». Канцэртная праграма.
**21.00** Панарама.
**21.40** Відэафільм АТН «Грузінскі перавал».
**22.05** Камедыя «Вайна нявест» (ЗША).

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Разумніцы і разумнікі».
**12.10** «Залатая калекцыя «Беларусьфільма». «Быць першым».
**12.40** «Блакітны карбункул». Мастацкі фільм.
**14.10** «Хвіліна славы».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Дынама-Мінск» - «Пік».
**18.00** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Летні кубак.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Дэтэктар хлусні».
**22.10** «Пражэктарпэрысхілтан».
**22.50** Драма «Правілы вінаробаў».
**01.25** «Неверагодныя прыгоды італьянцаў у Расіі».

**06.45** «Анфас».
**07.00** «Сямейнае кіно»: «Братка і сястрыца». Германія, 2008 г.
**08.00** Фільм «Няўдачлівыя». Францыя-Мексіка, 1981 г.
**09.35** Прэм'ера! «Давай паспрабуем?».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.05** Прэм'ера! «КультУРА!».
**11.35** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.05** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.35** Фільм «Пудзіла». СССР, 1983 г.
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**16.55** «Вялікі горад».
**17.30** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: ФК «Віцебск».-БФК «Белшына». Прамая трансляцыя.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Аднойчы ў Амерыцы». ЗША-Італія, 1984 г.
**01.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.45** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.15** Усё аб бяспецы.
**08.40** Нашы тэсты.
**09.50** «Рэальны свет».
**10.25** Жансавет.
**11.10** Тэлебарометр.
**11.15** «Запал па культуры».
**11.55** Дэтэктыўны серыял «Запасны інстынкт» (Расія). 1-я - 4-я , заключная серыі.
**15.50** Серыял «Дурнушка Бэці-2» (ЗША).
**16.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Тотэнхем - Астан Віла. Прамая трансляцыя.
**18.55** «Восеньскі жарт з…» Гумарыстычная праграма (Расія).
**19.25** Тэлебарометр.
**19.30** Джэймс Бонд - Агент 007. Баявік (Вялікабрытанія).
**21.40** Баскетбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Паўфінал. Прамая трансляцыя.
**23.30** Жывы гук.
**00.10** Меладрама «Вандраванне з хатнімі жывёламі» (Расія).

**РОССИЯ**

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.15** «Юрмала-2010». Фэст гумарыстычных праграм.
**08.50** Фільм «Вясновая пуцёўка».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Камедыя «Вуліца поўная нечаканасцяў».
**13.10** «Нататкі натураліста».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Мая планета».
**14.45** «Гарадок». Дайджэст.
**15.10** Фільм «Ішоў чацвёрты год вайны…».
**17.00** «Суботні вечар».
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.40** «Пакой смеху».
**20.35** Лірычная камедыя «Варажэя».
**00.05** Фільм «Жыве такі хлопец».
**01.50** Юбілейны вечар Веры Васільевай.

**НТВ**

**07.35** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Выратавальнікі».
**09.25** «Жывуць жа людзі!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Жаночы пагляд».
**14.15** Сямейная камедыя «Круты Джо».
**16.00** Сёння.
**16.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Злачынства будзе раскрыта».
**17.25** «Вочная стаўка».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.10** «Рускія сенсацыі».
**22.15** «Ты не паверыш!».
**23.15** Фільм «Шпількі-3».
**01.05** Драма «Зло».

**EUROSPORT**

**09.35** Веласпорт. Чэмпіянат свету (шашэйныя гонкі). Жанчыны. Мельбурн (Аўстралія).
**11.00** Тэніс. Турнір WTA. Токіо (Японія). Фінал.
**12.30** «Алімпійскія гульні. Лондан». Часопіс.
**12.35** Летні біятлон. Чэмпіянат свету. Польшча.
**13.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 140. Ліберац (Чэхія).
**14.45** Веласпорт. Чэмпіянат свету (шашэйныя гонкі). Жанчыны. Мельбурн (Аўстралія).
**15.45** Тэніс. Турнір WTA. Токіо (Японія). Фінал.
**17.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 140. Ліберац (Чэхія).
**18.00** Конны спорт. Сусветныя конныя гульні. Шматбор'е. Кентукі (ЗША).
**22.45** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Адмысловы выпуск.
**00.15** Веласпорт. Чэмпіянат свету (шашэйныя гонкі). Жанчыны. Мельбурн (Аўстралія).
**01.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 140. Ліберац (Чэхія).

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.50** Госць «Белсату».
**08.05** «Дзеці вялікага возера», дак. фільм, 2008 г., Расія.
**08.35** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў: «Еўразвяз і свабодная прэса».
**08.50** Блізкая гісторыя. Іншы пагляд: «З выцягнутымі рукамі», дак. фільм, 2006 г., Польшча: ч. 1.
**09.45** «Чароўнае дрэва», серыял: 4 серыя.
**10.10** Калыханка для самых маленькіх.
**10.50** «Чаму дэмакраты?», цыкл рэпартажаў: 4 серыя: «У пошуках Гандзі».
**11.50** «Дазнанне», маст. фільм, 1982 г., Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Арол: крымінальная сага», серыял: 4 серыя.
**18.00** Незвычайнае жыццё, звычайныя людзі: «Бясрэбранікі», дак. фільм, 2009 г., Вялікабрытанія.
**19.00** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.10** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.30** Басаножам па свеце (спазнаваўчая праграма): «Аазіс свабоды».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Суботні сеанс: «Жаночы раман», маст. фільм, 2005 г., Чэхія.
**22.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Карова».
**23.00** Аб'ектыў.

## 3 КАСТРЫЧНІКА, НЯДЗЕЛЯ

**08.20** Мультфільмы.
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** «Арсенал».
**09.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.45** Альманах вандраванняў.
**10.15** Культурныя людзі.
**10.45** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**11.20** Дакументальны цыкл «У пошуках ісціны» (Украіна).
**12.10** Лірычная меладрама «Вясна на Зарэчнай вуліцы» (СССР).
**14.05** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм АТН «Грузінскі перавал».
**15.55** Прэм’ера. Сямейная музычная камедыя «Элвін і бурундукі» (ЗША).
**17.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**18.05** Суперлато.
**19.20** «OFF STAGE LIFE».
**19.35** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.55** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.25** Прэм’ера. Меладрама «Манолетэ» (Іспанія- Вялікабрытанія).

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** «Фазэнда».
**11.50** «Ранішняя пошта».
**12.25** «Шчасце ёсць!».
**13.15** Тэлечасопіс «Звяз».
**13.45** «Уся праўда аб ежы».
**15.00** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Давай ажэнімся».
**17.35** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**18.50** Прэм’ера сезону. «Лёд і полымя».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: шоў «Кухня».
**21.40** Прэм’ера сезону. «Лёд і полымя». Працяг.
**23.30** Прэм’ера. Камедыя «На цвярозую галаву».

**06.30** «Сямейнае кіно»: «Кароль Дроздабарод». Германія, 2008 г.
**07.30** Фільм «Дама з сабачкам». СССР, 1959 г.
**09.00** Прэм’ера! «Кажа і паказвае Мінск». Радыё ONline.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.50** Фільм «Добры дзень і бывай». СССР, 1972 г.
**15.40** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Асабісты інтэрас».
**17.30** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Прэм’ера! Фільм «Вяртанне ў Брайдсхед». Вялікабрытанія-Італія-Марока, 2008 г.
**23.10** «Прафесійны бокс».
**23.55** Фільм «Зняў каго-небудзь?». Японія, 1994 г.
**01.45** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.35** Дабравест.
**08.00** Мір вашай хаце.
**08.10** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.40** Нашы тэсты.
**09.50** Медычныя таямніцы.
**10.30** Школа рамонту.
**11.45** Тэлебарометр.
**11.50** «Правы чалавека».
**12.05** Кінаспробы.
**12.25** Дакументальны фільм «Дзень настаўніка» (Беларускае тэлебачанне).
**12.55** Хакей. КХЛ. Авангард (Омск) - Дынама (Мінск). Прамая трансляцыя.
**15.20** Серыял «Дурнушка Бэці-2» (ЗША).
**17.00** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм’ерліга. Чэлсі - Арсенал. Прамая трансляцыя.
**19.55** Смешная часіна.
**20.35** Тэлебарометр.
**20.55** Баскетбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Фінал. Прамая трансляцыя.
**22.55** Культасвет.
**23.25** Трылер «Зман» (Італія).

**07.00** «Уся Расія».
**07.30** Лірычная камедыя «Варажэя».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** Фільм «Вей, ветрык!».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Уся Расія».
**15.00** «Гарадок». Дайджэст. 315.30
Фэст дзіцячай мастацкай гімнастыкі «Аліна».
**17.00** Камедыя «Добры дзень, я ваша цётка!».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.00** «Сумленны дэтэктыў».
**20.30** Фільм «Ваш прыпынак, мадам!». 2008 г.
**22.25** «Адмысловы карэспандэнт».
**23.35** Фільм «На даху свету». 2008 г.

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**10.55** «Праспявана ў СССР».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** Прэм’ера. «Бітва за Поўнач. Беламорканал».
**14.20** «Суд прысяжных: Галоўная справа».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Развод па-руску. Зубныя ірвачы».
**17.25** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.50** «Цэнтральнае тэлебачанне». Першае інфармацыйнае шоў.
**22.05** Прэм’ера. Дэтэктыўны серыял «Дарожны патруль».
**23.55** «Асабліва небяспечны!».
**00.30** «Футбольная ноч».
**01.00** «Нерэальная палітыка».

**09.35** Веласпорт. Чэмпіянат свету (шашэйныя гонкі). Мужчыны. Мельбурн (Аўстралія).
**12.45** Супербайк. Чэмпіянат свету. Маны-Кур (Францыя).
**13.00** Супербайк. Чэмпіянат свету. Маны-Кур (Францыя). Заезд 1.
**14.00** Суперспорт. Чэмпіянат свету. Маны-Кур (Францыя).
**15.15** Веласпорт. Чэмпіянат свету (шашэйныя гонкі). Мужчыны. Мельбурн (Аўстралія).
**16.30** Супербайк. Чэмпіянат свету. Маны-Кур (Францыя). Заезд 2.
**17.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 140. Клігенталь (Германія).
**19.00** Веласпорт. Чэмпіянат свету (шашэйныя гонкі). Мужчыны. Мельбурн (Аўстралія).
**19.30** Мотаспартыўны часопіс.
**19.45** Конны спорт. Сусветныя конныя гульні. Шматбор’е. Канкур. Фінал. Кентукі (ЗША).
**23.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 140. Клігенталь (Германія).
**00.30** Веласпорт. Чэмпіянат свету (шашэйныя гонкі). Мужчыны. Мельбурн (Аўстралія).
**01.30** Супербайк. Чэмпіянат свету. Маны-Кур (Францыя). Заезд 2.
**02.15** Мотаспартыўны часопіс.

**07.00** Аб’ектыў.
**07.10** Еўропа сёння.
**07.35** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**08.05** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**08.15** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Аазіс свабоды».
**08.45** Незвычайнае жыццё, звычайныя людзі: «Бяссрэбранікі», дак. фільм, 2009 г., Вялікабрытанія.
**09.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.55** Калыханка для самых маленькіх.
**10.25** «Арол: крымінальная сага», серыял: 4 серыя.
**11.20** «Жаночы раман», маст. фільм, 2005 г., Чэхія.
**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**17.45** «Малая Масква», тэлесерыял.
**18.30** Дакументальная гадзіна: «13 гадоў, 13 хвілін...», дак. фільм, 2006 г., Польшча.
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Барбара Радзівіл і Жыгімонт Аўгуст».
**19.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.05** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**20.30** Басанож па свеце: «Штодзённае жыццё ў Амазоніі».
**21.00** Тыдзень у «Аб’ектыве».
**21.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Алімпійскі смак».
**21.55** Фільматэка майстроў: «Дзённік свавольнага дзіцяці», псіхалагічная драма, 1988 г., Францыя.
**00.00** Тыдзень у «Аб’ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**Будзьце ўважлівымі: змяніліся нашы рэквізіты ў банку і адрас рэдакцыі. Рахунак: 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**
**Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА
ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)
ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐
(сумма цифрами) (сумма прописью)
ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926
КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)
ОТПРАВИТЕЛЬ
почтовый код, адрес отправителя, телефон)
АДРЕС
Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное
(назначение платежа)
(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ____________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Ідзем у адзяленне банка і на адмысловым бланку пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
2. Указваем суму аплаты і здзяйсняем пералік грошай.
3. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
4. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ
ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)
Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня
Кассир Всего

**Для тых, хто прымае рашэнні!**
Новы час
www.novychas.org

ВЫБАРЫ

# КАРЛСАН, ЯКІ ГАЛАСУЕ ЗА ПРАВЫХ

Алег НОВІКАЎ

**Сенсацыяй выбараў у Швецыі стаў прарыў у парламент правай радыкальнай партыі Шведскія дэмакраты (SD).**

Хаця шведы лічацца вельмі памяркоўнай нацыяй, сустракаюцца тут і такія экзатычныя экземпляры, як правыя радыкалы. Першыя групоўкі нацыстаў узніклі ў краіне ў 1920-я гады, калі ў Еўропе пачала набываць папулярнасць расавая тэорыя. У 1926 годзе на свет з'явілася Фашысцкая народная партыя Швецыі. Пасля партыі такога кшталту пачалі расці як грыбы пасля дажджу — Нардычная моладзь, Нацыянал-сацыялістычная партыя будучага, Новы шведскі рух і г.д. Гісторыкі налічылі да 90 рознага кшталту карычневых асацыяцый і ініцыятыў, якія існавалі ў краіне да вайны. Дарэчы, сябрам адной з такіх груп — Новы шведскі рух — быў некаторы час Інгвар Кампрад, адзін з заснавальнікаў кампаніі IKEA.

Аднак колькасць — не значыць якасць. Адзінства сярод карычневых не было. У 1930 годзе фюрэры дзвюх вядучых партый вырашылі аб'яднацца, але хутка зноў пасварыліся, і ўсё вярнулася на свае месцы. Магчыма, нацысты не маглі падзяліць грошы, якія ішлі з Берліну.

Цікава, што пасля падаўлення путчу Рэма ў Германіі некаторыя шведскія нацы расчараваліся ў нямецкай мадэлі нацызму. Яны нават замянілі свае сімвалы — свастыку на герб каралеўскага роду Ваза. Ускосна гэта пасавала тэзісу пра тое, што немцы — арыі другога гатунку, а вось Швецыя з'яўляецца сапраўднай калыскай арыйскай расы. Цікава, што Швецыя, як і Германія, да вайны праводзіла палітыку стэрылізацыі хворых і алкаголікаў.

Падчас вайны ў краіне дзейнасць правых была паралізавана. Улады Швецыі, якая заняла нейтралітэт, бачылі ў радыкальных правых патэнцыйных нямецкіх шпіёнаў.

Пасля вайны правы рух адрадзіўся, аднак ніякай істотнай ролі ў палітыцы не адыгрываў. Звычайна гэты лагер прадстаўлялі дастаткова радыкальныя, антысеміцкія і вельмі далёкія ад рэальнасці секты.



Еўрапейская прэса прызнае, што шведскае грамадства зрабіла крэн направа. Рэалізацыя ж лозунгаў SD на практыцы з'яўляецца дастаткова ўтапічнай

У якасці прыкладу можна прывесці Нацыянал-сацыялістычны фронт Швецыі (NSF), створаны ў 1994 годзе. Фронт (яго забаранілі ў 1998-м) выступаў за ліквідацыю дэмакратычнай сістэмы і за наданне датацыі сем'ям, дзе растуць «генетычна здаровыя дзеці».

Іншая экзатычная тусоўка — Нацыянальныя дэмакраты. Гэта, як правіла, былыя сацыял-дэмакраты, якія выступаюць за забарону рэстаранаў McDonald's і супраць прапаганды культуры амерыканскіх гета.

Асобная фракцыя шведскага правага радыкалізму — ініцыятывы, звязаныя з моладзевымі субкультурамі цяжкага року, панку і г.д. Напрыклад, сетка Storm. Вось з якога асяроддзя выйшлі Шведскія дэмакраты.

А пачалося ўсё з кампаніі «Захаваем Швецыю шведскай», арганізаванай шэрагам радыкалаў.

У 1988 годзе тагачасны лідэр кампаніі пачаў паступовую трансфармацыю ў «еўрапейскую нацыяналістычную партыю». Гэта азначала стаўку на папулісцкія лозунгі за кошт нацысцкай традыцыі. Шведскія дэмакраты выступаюць супраць эмігрантаў і гомасексуалістаў. Трыбуны SD патрабуюць вяртання эмігрантаў на іх гістарычную радзіму. Сцвярджаецца, што зэканомленых на эмігрантах грошай будзе дастаткова, каб палепшыць жыццё маргінальных частак насельніцтва і пенсіянераў. Таксама Шведскія дэмакраты супраць аднаполых шлюбаў і ўвогуле гомасексуалістаў. Тут ёсць адзін кур'ёз — гамафобскія лозунгі SD знаходзяць падтрымку сярод выбаршчыкаў-мусульман, якія, як правіла, эмігранты.

SD заявіла пра сябе пасля выбараў 1996-га, на якіх Шведскія дэмакраты сабралі 30 тысяч галасоў — столькі правыя не збіралі з даваенных часоў. У 2006 годзе Шведскія дэмакраты набралі 2,9 працэнта (прахадны бар'ер у шведскі парламент — 4 працэнты). Поспех шырока каментаваўся ў прэсе. І вось цяпер узятая наступная прыступка: набраўшы 6 працэнтаў, партыя атрымала 20 дэпутацкіх мандатаў.

Пакуль цяжка сказаць, якія перспектывы ў Шведскіх дэмакратаў. Еўрапейская прэса прызнае, што шведскае грамадства зрабіла крэн направа. Рэалізацыя ж лозунгаў SD на практыцы з'яўляецца дастаткова ўтапічнай. Асабліва высылка эмігрантаў, якіх у Швецыі 14 працэнтаў.

У лепшым выпадку, на думку экспертаў, SD могуць паўтарыць прыклад Дацкай народнай партыі, ад галасоў дэпутатаў якой залежыць лёс урадавай кансерватыўна-ліберальнай кааліцыі. Аднак правыя цэнтрысты, якія перамаглі на выбарах, не збіраюцца весці перамовы з ультраправымі, нават нягледзячы на тое, што ім не хапае галасоў для парламенцкай большасці. Па іх словах, яны будуць намагацца пераманіць на свой бок Зялёных, якія, дарэчы, упершыню ў гісторыі сталі трэцяй партыяй у парламенце.

## КАМЕНТАР

**Пра вынікі апошніх выбараў разважае Сяргей Рауш, беларускі студэнт, які вучыцца ва ўніверсітэце Мальмё.**

***— Ці сапраўды настолькі важная праблема эмігрантаў у шведскім грамадстве?***

— Хутчэй, існуе праблема інтэграцыі эмігрантаў, асабліва ўцекачоў як групы, у шведскае грамадства. Часткова таму, што працэс афармлення прытулку занадта зацягнуты, часткова таму, што курсы шведскай мовы для эмігрантаў маглі б быць яшчэ лепшымі. Больш таго, існуюць раёны, якія заселены галоўным чынам эмігрантамі, і гэта, вядома, таксама вельмі замінае інтэграцыі. Але шматлікія шведы лічаць, што з самім эмігрантамі праблем няма, а гэта хутчэй структурныя праблемы, звязаныя з эміграцыяй і інтэграцыяй.

***— Які партрэт сярэдняга правага выбарца?***

— Гэта часцей мужчыны, чым жанчыны, хутчэй некваліфікаваныя працаўнікі ці беспрацоўныя, чым людзі з пасадай, і яны звычайна жывуць на поўдні Швецыі, дзе вялікі працэнт эмігрантаў.

***— Як шведы ставяцца да эмігрантаў з Беларусі?***

— Наконт беларусаў у шведаў няма вызначанага меркавання, пра іх вельмі мала ведаюць і рэдка сустракаюць. Хоць нядаўна я пазнаёміўся з адным з сяброў партыі «Новыя мадэраты» з Мальмё, які ведае Франака Вячорку. Апошні неяк прыязджаў у Мальмё і распавядаў пра Беларусь. Яшчэ амаль усе шведы-мужчыны лічаць несправядлівым тое, што аднойчы беларусы выйгралі ў шведаў у хакей.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Правакуючы паніку ў грамадстве, улада сама панічна баіцца актыўнасці апазіцыі і акцый народнага пратэсту на вуліцы. Гэта больш падобна на падрыхтоўку абставін, якія апраўдваюць магчымасць увядзення ў Беларусі надзвычайнага становішча ў выпадку, калі падзеі вакол выбараў пачнуць разгортвацца не па запланаваным сцэнары. І колькі б ні казалі, што Мінску на пачатку выбараў не патрэбныя падзеі, якія могуць выклікаць негатыўную рэакцыю Еўрасаюза, сёння беларускую ўладу менш за ўсё хвалюе рэакцыя каго б там ні было.

**«Deutche welle» (Германія)**

Складаецца ўражанне, што амбіцыі Крамля даволі сціплыя: Масква гатовая задаволіцца папросту адэкватным чалавекам на пасадзе прэзідэнта Беларусі — любы апазіцыянер будзе лепш ісцерычнага і непрадказальнага Лукашэнкі. Таму Расія не вядзе актыўнай гульні на ўнутрыпалітычным полі Беларусі, абмяжоўваючыся байкотам Лукашэнкі. Нельга сказаць, што гэта вельмі ўдалая тактыка, аднак ва Украіне яна сябе апраўдала. Урад Януковіча пагадзіўся на значныя для Масквы саступкі.

**Gazeta.ru (Расія)**

«Апошні дыктатар Еўропы» Лукашэнка знаходзіцца пад сур'ёзным ціскам, які звязаны таксама з велізарным доўгам яго дзяржавы перад Расіяй. З-за пераследу апазіцыі ён па большай частцы пазбавіўся падтрымкі Еўропы, а ў Маскве яго перасталі лічыць надзейным партнёрам. Рэйтынг папулярнасці яго ў Беларусі складае прыкладна 33 працэнты, чаго недастаткова для перамогі ў першым туры на нармальных выбарах. Безумоўна, у Беларусі наступілі неспакойныя часы. Гістарычны збег падзей стварае магчымасць для сапраўдных змен у краіне. Праўда, іх зыход пакуль застаецца нявызначаным.

**«Center for European Policy Analysis» (ЗША)**

На гэтым фоне можна падводзіць некаторыя вынікі найбольш прасунутага працэсу постсавецкай інтэграцыі. Праект Саюзнай дзяржавы з Беларуссю абышоўся Расіі больш чым у 50 мільярдаў долараў прамых і ўскосных датацый. Вынікам сталі мытныя войны, замарожванне палітычных адносін і дэманстратыўная пераарыентацыя на іншых партнёраў. Эксперымент больш за паказальны і дазваляе зняць перспектывы з далейшага разгляду. Калі ж абмежавацца тэарэтызаваннем, то гіпатэтычны кошт завершанай інтэграцыі з Беларуссю склаў каля 100 мільярдаў долараў. Дадаткова да ўжо патрачаных. Плюс выдаткі асабіста Аляксандру Рыгоравічу. Які, прыняўшы сродкі, напэўна ўсё адно знойдзе бы спосаб «кінуць».

**«Независимая газета» (Расія)**

Па словах назіральнікаў, Лукашэнка ўпершыню апынуўся ў незайздросным становішчы чалавека, які падвяргаецца крытыцы з абодвух бакоў: на Захадзе сапраўдных саюзнікаў у яго няма, а Расія зараз паграхае інфармацыйнай вайной. Аднак яго татальны кантроль над палітычным жыццём і СМІ ў краіне ў апошняе дзесяцігоддзе прывёў да таго, што ні адзін апазіцыйны палітык не карыстаецца шырокай падтрымкай электарату. Так што аналітыкі сумняваюцца ў тым, што Лукашэнка сыдзе нават пад бязлітасным ціскам Масквы.

**«The Independent» (Вялікабрытанія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### БІШКЕК — СТАЛІЦА ЦЮРКАЎ

Менавіта такое рашэнне прыняў саміт лідэраў цюркамоўных краін, які адбыўся ў Стамбуле. У ім прынялі ўдзел лідэры Турцыі, Казахстану, Азербайджану, Туркменіі і Узбекістану. Яны дамовіліся наконт стварэння сакратарыяту аб'яднання, якое будзе знаходзіцца ў кіргізскай сталіцы. Аднак, на думку аналітыкаў, гэта хутчэй знак тармажэння працэсаў цюркскай інтэграцыі. Справа ў тым, што Турцыя сёння знаходзіцца ў ідэйным ступары. Пасля правалу планаў уваходжання ў ЕС, кіраўніцтва краны думае над новай геапалітычнай дактрынай. Такой дактрынай мог стаць панцюркізм — ідэя аб'яднання цюркскіх нацый пад турэцкім дахам. З іншага боку, Анкары вельмі цяжка навязаць такую ўстаноўку ўсім цюркамоўным дзяржавам. Галоўная праблема — Казахстан, які звязаны з Расіяй і Арменіяй. Апошняя, як вядома, канфліктуе з-за Паўночнага Карабаху з цюркскім Азербайджанам. Не вельмі сяброўскім учынкам назвалі туркі стварэнне Мытнага саюзу Казахстану, Расіі і Беларусі. Пасля гэтага імпарт турэцкіх тавараў у Казахстан падаражэў на 300 працэнтаў. У гэтай сувязі некаторыя жартаўнікі нават кажуць, што адзіны шанец для Турцыі захаваць ідэю панцюркізму — таксама ўступіць у Мытны саюз. Адным словам, пакуль інтэграцыя цюркаў тармозіцца. Таму сталіцай і стаў Бішкек, які, з улікам сваіх рэсурсаў і складанай сітуацыі ўнутры краіны, на глабальныя працэсы ўплываць не можа.

**Па матэрыялах сайтаў Сярэдняй Азіі**

### ІТАЛІЯ. ПАСВАРЫЛА САСНОВАЯ ГАЛІНКА




Оскар Ланчыні, мэр невялікага італьянскага гораду Адро ў Паўночнай Італіі, стаў героем нацыянальнага скандалу. Оскар — прыхільнік партыі Ліга Поўначы, якая выступае за стварэнне аўтаномнага рэгіёну Паданія. Галоўная ідэя праекту ў тым, што Паданія, куды павінны ўвайсці багатыя рэгіёны Паўночнай Італіі, не павінна фінансаваць слаба развіты Поўдзень. Мэр настолькі адданы сваёй партыі, што патрабаваў, каб на сценах новага мясцовага школьнага комплексу намалявалі сімволіку партыі — сасновую галінку. У дадатак школу назвалі ў гонар аднаго з заснавальнікаў Лігі Поўначы. Так звычайная школа стала партыйнай школай, што, натуральна, не спадабалася некаторым бацькам вучняў. Асабліва тым, хто выступае супраць цяперашняга ўраду Берлусконі. 180 з 400 бацькоў, дзеці якіх вучацца ў згаданай школе, напісалі ліст пратэсту. Адна маці ўвогуле заявіла, што яе дзіця не будзе хадзіць у такую навучальную ўстанову. Адказваючы на крытыку, мэр заявіў, што сасновая галінка — гэта не толькі сімвал партыі, аднак і гораду. Быццам у мясцовым касцёле ёсць вітражы з вывяай сасновай галінкі. Міністр адукацыі падтрымаў Ланчыні. Ён сказаў, што сімволіка Лігі Поўначы мае даўнія народныя карані. А вось апазіцыя так не думае. Левая партыя дэмакратаў прывезла да школы некалькі соцень сваіх прыхільнікаў, якія пікетавалі будынак, патрабуючы зафарбаваць галінку. На цяперашні час усё закончылася палітызацыяй вучняў і бойкай, якую некаторыя маці, незадаволеныя зрывам вучэбнага працэсу, учынілі з маніфестантамі.

**Па матэрыялах «TAZ» (Германія)**

### ЧЫЛІ. УРАД ПАЧЫНАЕ ПЕРАМОВЫ З ІНДЗЕЙЦАМІ

Напярэдадні 200-й гадавіны абвяшчэння незалежнасці Чылі яе прэзідэнт Мігель Хуан Себасцьян Піньера зрабіў падарунак індзейцам з племені мапучэ, землі якіх былі канфіскаваныя падчас каланізацыі. Прэзідэнт пагадзіўся пачаць з тубыльцамі мірныя перамовы. Дадатковым фактарам стала галадоўка, якую абвясцілі яшчэ ўлетку некалькі актывістаў індзейскага руху. Яна цягнулася 67 дзён. Разам з заявай пра пачатак перамоў Піньера прызнаў віну за стан абарыгенаў і абвясціў праграму, мэта якой — палепшыць якасць жыцця мапучэ. Канфлікт з мапучэ цягнецца больш за сто гадоў. Напрыканцы XIX стагоддзя Санцьяга пачаў рэалізацыю плана, у выніку якога 95 працэнтаў індзейскіх зямель сталі належаць белым каланістам і дзяржаве. З тых часоў былыя ўладальнікі зямель патрабуюць іх вяртання. Часам канфрантацыя набывала радыкальны фармат: індзейцы атакавалі латыфундыі і фермы. У часы дыктатуры Пінача з мапучэ разбіраліся проста: кідалі ў турмы, а часам папросту забівалі. Пасля аднаўлення дэмакратыі ў 1990 годзе дзяржава пачала шукаць шляхі вырашэння канфлікту. Праўда, працэс ідзе вельмі цяжка, пра што сведчыць згаданая вышэй галадоўка. Магчыма, у рамках перамоў бакі знойдуць кампраміс. Дарэчы Піньера паабяцаў індзейцам сродкі на развіццё іх культуры і мовы. Сёння ў краіне пражывае паўмільёна мапучэ.

**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

ЦІКАВА

# АД УЛАДЗІВАСТОКУ ДА ЛІСАБОНУ

**Альтэрнатыўная гісторыя зараз у модзе. Польскі часопіс «Tygodnik Powszechny» паспрабаваў пафантазаваць, як выглядала б Еўропа, калі б улетку 1920 года не было Цуду над Віслай. Прапануем скарочаную версію артыкула.**

Лета 1920 года. Здавалася, ніщто не можа выратаваць Польшчу. Пасля паразы пад Кіевам польская армія імкліва адыходзіць на захад. Пад Плоцкам Чырвоная армія нават фарсіравала Віслу.

Асуджаных на фіяска палякаў выратавала памылка Сталіна, які на той час быў камандуючым паўднёвым фронтам. Джугашвілі накіраваў конніцу Будзённага на Львоў, марачы пра будучы кідок на Венгрыю (там нядаўна было задушана камуністычнае паўстанне). Гэта дало магчымасць польскай арміі сканцэнтраваць сілы на ўчастку галоўнага ўдару бальшавікоў і ў выніку перамагчы.

А што было б, калі б Вісарыёнавіч не памыліўся? У такім разе Чырвоная армія магла б бліскуча паўтарыць манеўр Паскевіча (царскага генерала, які браў Варшаву ў 1831 годзе). Замест таго, каб атакаваць польскую сталіцу з усходу, дзе знаходзілася галоўная лінія абароны, зайсці ў тыл з захаду. А далей? Як склаўся б у такім разе лёс усёй Еўропы?

Перш за ўсё, у выпадку падзення Варшавы бальшавікам удалося б надаць кастрычніцкай рэвалюцыі міжнародны характар, вывесці яе за межы былой Расійскай Імперыі.

Акрамя таго, вайна з палякамі была замахам на Версальскую сістэму, як, дарэчы, адзначаў Ленін. Крах Польшчы — аднаго з прадуктаў Версаля, мог бы значыць перагляд усёй геапалітычнай сістэмы, якая склалася пасля першай сусветнай вайны. Гэты момант значным чынам пашыраў сацыяльную базу падтрымкі чырвонай інтэрвенцыі ў Еўропе. Пра гатоўнасць тактычнага блакіравання з Леніным у імя знішчэння Версальскага міру адкрыта казалі нават правыя ў Германіі.

Таксама поспеху бальшавіцкага маршу на Захад спрыяла б псіхалагічная грамадская атмасфера таго часу. Людзі цалкам не адышлі ад вайны. Мільёны салдат, якія вярнуліся дахаты, адчувалі, што перамога не прынесла ім жаданага міру і шчасця. Хутчэй, наадварот, яны былі не інтэграваныя ў капіталістычныя правілы гульні і гатовыя падтрымаць любую палітычную авантуру. Тым больш, што ў мазгах панавала ўстаноўка пра тое, што нічога немагчымага няма. На вачах гэтай генерацыі за пару гадоў ператварыліся ў руіны імперыі, якія існавалі некалькі стагоддзяў.

У гэтым плане, калі б Тухачэўскі рэалізаваў свой намер — «праз польскі труп прайсці ў Германію», там яго чакаў бы вялікі поспех. У камуністаў і саюзных ім сацыял-дэмакратаў быў патэнцыял, каб забяспечыць лаяльнасць да новага парадку. Левыя ідэі былі вельмі папулярныя сярод немцаў. Дастаткова згадаць шэраг паўстанняў, якія камуністы і анархісты арганізавалі ў Германіі ў 1918–1919 гадах.

Можна прагназаваць, што ўжо да канца 1920 года Германія стала б камуністычнай. Саюзныя арміі Германіі і Расіі выйшлі б на Рэйн, рыхтуючыся да паходу ў Францыю. Мусім прызнаць, што французы ніякага супраціву, падобнага таму, які чынілі немцам у 1914–1918 гадах, ім не аказалі б. Не знайшлося б ужо ў нацыі сіл на такі вялікі чын. Не кажучы пра тое, што ў Францыі былі таксама распаўсюджаны левыя погляды. Асабліва ў сталіцы, дзе быў папулярны міф пра Парыжскую камуну.

Пасля захопу Францыі камунізм выйшаў бы на бераг Атлантыкі. Адначасова, напэўна, у зону яго ўплыву перайшлі б усе краіны цэнтральнай Еўропы, якія паўсталі на базе былой імперыі Габсбургаў. Прыклад Венгерскай сацыялістычнай рэспублікі, якая варта трымалася некалькі месяцаў супраць войскаў Антанты, дэманструе, што тутэйшае грамадства было цалкам гатовае прыняць чырвоны сцэнар. Рухаючыся з Венгрыі, чырвонае цунамі лёгка пакрыла б Балканы і перайшло праз Альпы.

Італія, дзе на той час панаваў татальны палітычны хаос, і так рухалася ў бок дыктатуры, якую, як мы ведаем, устанавіў у 1922 годзе Мусаліні. Аднак з'яўленне ў Падуанскай даліне Чырвонай арміі магло б змяніць расклад: ініцыятыва цяпер належала б не фашыстам, а камуністам.

З тых жа прычын — высокая ўнутраная палітычная напружанасць — таксама не мела б шансаў выстаяць супраць навалы з Усходу ў Іспаніі і Партугаліі. Праўда, з улікам аўтарытэту, які тады на Пірэнеях меў касцёл, тут дакладна ўзнік бы моцны антыкамуністычны супраціў. Для канчатковага ўстанаўлення камуны спатрэбіўся б нейкі час — да пачатку 1930-х гадоў. Аднак перавага ў грамадзянскай вайне б бальшавікі захапілі Еўропу, чалавецтва ніколі не даведалася, што такое фашызм і Халакост. Канцэпцыі пінэраў карычневай ідэі выглядалі б маргінальнымі. Мусаліні з яго радыкальным італьянскім нацыяналізмам лічыўся б вар'ятам. Гітлер, які будаваў сваю праграму на рэвізіі мадэлі Версалю, напэўна, звodзіў бы канцы з канцамі за кошт продажу малюнкаў турыстам.

Хаця, як добрыя дэмагогі, Беніта і Адольф мелі б шансы зрабіць кар'еру нават у часы татальнага трыумфу ідэй марксізму-ленінізму. Першы мог стаць, напрыклад, загадчыкам аддзелу прапаганды рымскага райкаму партыі, а другі — мастацкім кіраўніком нейкага ДК.

А вось пазбегнуць другой сусветнай вайны наўрад ці ўдалося б. Праўда, была б яна значна менш маштабнай і, хутчэй за ўсё, яе выклікаў бы канфлікт з ЗША і Японіяй. Найбольш верагодна, што полем канфлікту стаў бы Кітай. У такім разе Мао Цзэ Дун абвясціў бы пра стварэнне Кітайскай Народнай Рэспублікі не ў 1949 годзе, а значна раней.

Хто б перамог у вайне, залежала ад працэсаў унутры СССР, які ўключаў не толькі БССР або УССР, аднак таксама Французскую ССР або Бельгійскую ССР. У перспектыве камуністычным лідэрам Францыі, Германіі, Іспаніі, хутчэй ха ўсё, не спадабаўся б статус васала Масквы. І, як Дубчак у Чэхаславакіі або Ціта ў Югаславіі, яны арганізавалі б нейкую фронду, што пачыналася б як рух за сапраўдны ленінізм, а закончылася б, напэўна, банальным нацыяналізмам, які мы сёння назіраем у Кітаі.

Што да Польшчы, то, з улікам яе тагачаснай сітуацыі, яна ператварылася ў нешта падобнае на Беларусь або Украіну ў складзе СССР. А калі б Германія засталася б у межах 1920 года, а крэсы адышлі да Беларусі, Літвы і Украіны, памер савецкай Польшчы быў бы роўны Варшаўскаму каралеўству 1809 года.

Горш, аднак, было б тое, што палякам давялося б перажыць

**Перш за ўсё, у выпадку падзення Варшавы бальшавікам удалося б надаць кастрычніцкай рэвалюцыі міжнародны характар, вывесці яе за межы былой Расійскай Імперыі**

за кошт людскіх і эканамічных рэсурсаў з Еўропы была б відавочна на баку Камінтэрну.

Магчыма, толькі Вялікабрытанія пазбегла б лёсу кантыненту. Усё за кошт праліву Ла Манш, які, як бывала ўжо і раней у гісторыі, выступіў бы прыроднай перашкодай для наступу на Лондан. Але і тут няма пэўнасці. Самая старая дэмакратыя ў свеце на той час таксама была не ў лепшым стане. Лейбарысты рыхтаваліся да таго, каб першы раз узначаліць кабінет яе Вялікасці.

Парадаксальна, аднак такая схема мае пазітыўныя бакі. Калі усе савецкія эксперыменты: калектывізацыю, кампанію супраць рэлігіі, русіфікацыю. Вынікам былі б буйныя палітычныя рэпрэсіі, хаця да перасялення польскай нацыі ў Казахстан наўрад ці дайшло б.

Артыкул у часопісе «Tygodnik Powszechny» заканчваецца словамі: «Ад усіх гэтых бедаў Польшчу і ўсю Еўропу ўратавалі самі палякі ў вайне з Саветамі ў 1920 годзе. Вельмі рэдка бывае, што ў нашых справах вырашаецца лёс усяго свету, хаця на той час ніхто гэтага, натуральна, не разумеў».

**Падрыхтаваў Алег Новікаў**

ДЭБАТЫ

# БЕЛЬГІЯ – ФЛАМАНДЫЯ = ВАЛОНІЯ?

Алег НОВІКАЎ

**Бельгія ўжо каторы раз у стане ўрадавага крызісу з-за сабатажу фламандскіх нацыяналістаў. Нарэшце тыдні нервы франкамоўных валійцаў лопнулі. Яны заявілі пра гатоўнасць да падзелу дзяржавы і стварэння незалежнай Валоніі.**






Думка пра тое, што Бельгію цяпер ужо сапраўды ніяк не ўратаваць, зляцела з вуснаў Лорэта Анкелінкса — аднаго з лідэраў Партыі сацыялістаў (вядучая палітычная фармацыя ў франкамоўным рэгіёне Бельгіі). «Трэба быць гатовымі да таго, што Бельгія можа прыпыніць сваё існаванне», — заявіў палітык. Ён таксама дадаў, што «прыйшоў час прызнаць — ідэя незалежнасці вельмі папулярная сярод фламандскага насельніцтва».

Заяву Лорэта ўспрынялі на ўра шмат сяброў па партыі. Аднак гэта не азначае аўтаматычны падзел Бельгіі на дзве незалежныя дзяржавы — Фландрыю і Валонію. Валійскі нацыяналізм — больш тонкая рэч.

Народжанае ў 1830 годзе, Бельгійскае каралеўства было хутчэй справай рук жыхароў Поўдня, якія размаўлялі на французскай мове. Аднак, аддзяляючыся ад Нідэрландаў, яны прыхапілі з сабой у склад новай дзяржавы і раёны, дзе жылі фламандцы.

Праз некаторыя час фламандцы пачалі патрабаваць для сябе роўных з франкафонамі правоў і крок за крокам іх дабіліся. Тым больш, што яны былі большасцю насельніцтва Бельгіі. Напрыканцы XIX стагоддзя нацыянальны парламент прыняў законы пра афіцыйны статус фламандскай мовы. Пасля першай сусветнай вайны фламандцы атрымалі аўтаномію, а сама Бельгія стала федэральнай краінай з трыма суб'ектамі — Фландрыяй, Валоніяй і Бруселем.

Пры гэтым франкамоўныя бельгійцы прыблізна да 1912 года, калі з-за ўвядзення ўсеагульнага выбарчага права ўпершыню аказаліся ў меншасці ў парламенце, дастаткова пасіўна ставіліся да націску фламандцаў. На той час эканоміка краіны была завязаная на вугальныя шахты Валоніі. Гэты рэгіён быў самым індустрыяльна развітым.

Пераломам у масавай свядомасці франкамоўных бельгійцаў адбыўся падчас другой сусветнай вайны, калі Германія атакавала Бельгію. Ніводная фламандская вайсковая частка не аказала супраціву войску Вермахту. Гэта стала вынікам добрай працы фламандскіх нацыяналістаў перад вайной, якія давялі ўсёй супольнасці, што Фландрыя — гэта не Бельгія, а частка германскага свету. Гітлер адразу пасля акупацыі краіны аддаў спецыяльны загад пра вызваленне з палону ўсіх бельгійскіх жаўнераў фламандскага паходжання. У сваю чаргу, фламандцы сталі аднымі з самых адданых саюзнікаў Гітлера (цікава, што ў той жа час галандцы, з якімі фламандцы складаюць адну этнічную групу, аказвалі актыўны супраціў Гітлеру).

Адначасова ў гады вайны франкамоўныя бельгійцы спачувалі французскаму руху супраціву Шарля дэ Голя. Таму іх ініцыятывы мелі выразны антыфашысцкі і левы характар. У 1942 годзе ўзнікла падпольная група Дэмакратычнае і сацыялістычнае аб'яднанне Валоніі (RDSW). Яе актывам быў складзены праект маніфесту незалежнай Валоніі. Ідэю агучылі падчас Кангрэсу валійскага народа ў маі 1945 года, аднак за рэзалюцыю прагаласавалі толькі 14 працэнтаў удзельнікаў мерапрыемства. Перамаглі тыя, хто лічыў, што Валонія можа быць часткай канфедэратыўнай Бельгіі.

Пасля канфузу на кангрэсе тэма незалежнасці згубіла актуальнасць. Аднак час ад часу яна абмяркоўваецца. У 1950 годзе ў Бельгіі прайшоў рэферэндум наконт вяртання на трон караля Леапольда III, які ў гады другой сусветнай вайны супрацоўнічаў з нацыстамі. 58 працэнтаў валійцаў былі супраць, у той час як 70 працэнтаў фламандцаў падтрымалі ідэю вяртання манарха. У 1960 годзе ў час забастоўкі шахцёраў Валоніі на суд публікі вынеслі ідэю сацыялістычнай аўтаномнай рэспублікі Валонія.

На хвалі студэнцкіх пратэстаў 1960-х гадоў узніклі групы Фронт вызвалення Валоніі і Народны сход Валоніі, якія, праўда, засталіся маргінальнымі. Падзенне цікавасці да ідэй незалежнасці мела эканамічныя прычыны. Валонія ў выніку закрыцця шахтаў стала залежыць ад датацый фламандцаў.

І вось цяпер, пасля серыі ўрадавых крызісаў, выкліканых сабатажам фламандцаў, ідэя незалежнасці, здаецца, атрымала новае нараджэнне. Праблема, аднак, у тым, што шматлікія валійцы лічаць сябе хутчэй французамі, чым грамадзянамі незалежнай краіны Валонія.

Адпаведна вынікам апытання, якое было праведзена ўлетку гэтага года, 52 працэнты жыхароў Валоніі хочуць атрымаць французскі пашпарт. Адначасова 56 працэнтаў французаў быццам не супраць далучэння рэгіёну да Францыі. Толькі 12 працэнтаў жыхароў Валоніі выступаюць за яе не залежнасць. Дарэчы, у Фландрыі за незалежнасць выступаюць 38 працэнтаў. Акрамя таго, у французскай канстытуцыі закладзены пункт, які дазваляе далучэнне да дзяржавы тэрыторый з франкамоўным насельніцтвам.

**Пра культурную адрознасць ад французаў валійцы задумаліся вельмі позна. Толькі ў пачатку 1980-х пачалося фармаванне валійскага культурнага руху. Адбылася кадыфікацыя валійскай мовы, пачалі выходзіць першыя творы**

Пра культурную адрознасць ад французаў валійцы задумаліся вельмі позна. Толькі ў пачатку 1980-х пачалося фармаванне валійскага культурнага руху. Адбылася кадыфікацыя валійскай мовы, пачалі выходзіць першыя літаратурныя творы на гэтай мове. Аднак край дэ-факта знаходзіцца ў зоне культурнага ўплыву Францыі. У дадатак, паралельна з нацыяналістамі існуе сфармаваны яшчэ да вайны палітычны рух за пераход пад кантроль Парыжу.

Перакананьць валійцаў у неабходнасці заснавання самастойнай Валоніі нацыяналістам будзе цяжка. Аднак дэбаты, па вялікім рахунку, толькі пачынаюцца, і не выключана, што ў хуткім часе на карце Еўропы ўзнікнуць яшчэ дзве новыя дзяржавы.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### КАРЛ ШВАРЦЭНБЕРГ



Кіраўнік чэшскай дыпламатыі і прадстаўнік дому Габсбургаў зрабіў сенсацыйную заяву. Ён паведаміў пра тое, што міністэрства разглядае магчымасць адмены так званых Дэкрэтаў Бенеша. Дэкрэты Бенеша — гэта законы супраць нямецкай меншасці Чэхаславакіі, якія былі прынятыя Прагай у 1945 годзе. Адпаведна ім тры мільёны чэхаславацкіх грамадзян нямецкага паходжання былі пазбаўленыя грамадзянства, а іх маёмасць канфіскаваная дзяржавай. Расправа над немцамі была адказам на тое, што апошнія актыўна дапамагалі гітлераўцам у часы акупацыі. З тых часоў тэма адмены дэкрэтаў з'яўляецца каменем супярэчнасці ў адносінах паміж Чэхіяй і нямецкімі кансерватарамі, якія традыцыйна падтрымліваюць бежанцаў і іх нашчадкаў. І вось упершыню Прага вуснамі Шварцэнберга прызнала, што ўчынкі Бенеша былі несправядлівымі. Праўда, сам Шварцэнберг прызнаў, што, каб набыць законнасць, яго ініцыятыва наконт адмены дэкрэтаў Бенеша павінна быць падтрыманая ўсім парламентам. А гэта ўжо дастаткова цяжка.



### УЛАД ФІЛАТ

Прэм'ер-міністр Малдовы зрабіў тое, што ніколі не ўдавалася ніводнаму малдаўскаму прэм'еру. Ён наведаў Цірaспаль — сталіцу непрызнанай Прыднястроўскай Малдаўскай Рэспублікі (ПМР). Праўда, не з афіцыйным візітам, а як фанат аднаго кішынёўскага клуба, які гуляў з цірaспальскай камандай. Ні разу ў гісторыі ўлады Прыднястроўя не дазвалялі візіты на сваю тэрыторыю прадстаўнікам кішынёўскай улады. Прычым Філат — не проста палітык, а старшыня ўраду кааліцыі, якая займае празаходнія пазіцыі і выступае за ўключэнне краіны ў склад NATO. У дадатак падчас візіту ў ПМР Філат меў размову з лідэрам прыднястроўскіх сепаратыстаў Смірновым. «Што ж адбываецца?» — задае пытанне малдаўская прэса. Асабліва пратэстуюць камуністычныя СМІ (іх лідэр Уладзімір Варонін, калі займаў пасаду прэзідэнта Малдовы, так і не атрымаў права наведаць ПМР). Між тым, праанaлізаваўшы дакументацыю ўраду, аналітыкі знайшлі цікавую рэч, якая, магчыма, і з'яўляецца ключом для разгадкі. Літаральна пасля візіту Філата ў Цірaспаль яго ўрад унутранай пастановай дазволіў перапраўляць праз тэрыторыю Малдовы пэўную колькасць грузаў з ПМР без праверкі на малдаўскай мытні. Гэта, фактычна, — прарыў мытнай блакады, якую ў 2006 годзе ўстанавілі Украіна і Малдова, калі кожны груз з ПМР, які вывозіўся за межы рэгіёну, павінен быў даглядацца малдаўскімі мытнікамі. Як піша левая прэса, Смірнову дазволілі прадаваць тавары на суму каля 80 мільёнаў долараў на год. Левыя сцвярджаюць, што старшыня ўраду атрымае нейкі працэнт з экспарту. Аднак іншыя аналітыкі перакананыя, што на самай справе ўрад свядома фарсіруе стварэнне інстытутаў незалежнасці ПМР, каб паставіць кропку ў прыднястроўскім пытанні і пачаць працэс інтэграцыі Малдовы і Румыніі.

### БРАЯН КАРЫН

Адвакат з Паўднёвай Афрыкі Браян Карын вядомы тым, што ўдзельнічаў ва ўрэгуляванні канфліктаў у Паўночнай Ірландыі і Паўднёвай Афрыцы. Зараз ён заручыўся падтрымкай групы дэпутатаў Еўрапейскага парламента і прапанаваў стварыць міжнародную камісію па кантролі над тым, як тэрарысты з баскскай нацыяналістычнай групоўкі ЕТА выконваюць сваё абяцанне пра спыненне агню, пра што тыя заявілі 5 верасня. Браян пры гэтым не хавае, што задача яго камісіі — не столькі ўсталяваць кантроль за ўчынкамі ЕТА, колькі падштурхнуць Мадрыд пачаць мірны дыялог. Нагадаем, што ЕТА ў аднабаковым парадку адмовілася ад баявых акцый. Іспанскія ўлады палічылі мараторый ЕТА не дастатковым і прапанавалі сваю ўмову для пачатку дыялогу — поўная капітуляцыя групоўкі. Больш за тое, па Краіне Баскаў пракаціліся арышты лідэраў маладых нацыяналістаў з арганізацыі Ekin, звязанай з ЕТА. Улады кажуць, што арыштаваныя прызналіся, нібыта заява ЕТА пра мірныя перамовы — блеф.



СПАДЧЫНА

# БЕЛАРУСКАЯ ШЛЯХТА:

Аляксей ХАДЫКА

**Памятаць свой род да сёмага калена — традыцыя сцвярджае, што ў гэтым прынцыпе ўтрымліваецца залог трываласці роду, аснова патрыятычнага выхавання, перадумова фармавання грамадзянскай пазіцыі. Апірышча, каб не быць бяспамятным манкуртам. У даўнія часы вернасць сямейнай гісторыі найбольш выяўлялася ў асяроддзі шляхецкага саслоўя. Але ў краіне Саветаў страх быць рэпрэсаваным, расстраляным толькі за наяўнасць высакародных каранёў прымушаў старэйшае, народжанае яшчэ да катастрофы 1917 года пакаленне хаваць ці знішчаць пажоўклыя дакументы, замоўчваць таямніцы сямейных вытокаў, паданні і легенды.**



Сёння сітуацыя мяняецца. У закінутых маёнткаў знаходзяцца былыя гаспадары — хаця права рэстытуцыі пакуль не гарантавана дзяржавай. Ведаць, адкуль твой род, робіцца пачэсным і прэстыжным. Сучасныя тэхналогіі, як кампутарная праграма Family Tree Maker, дапамагаюць аматарам аднаўляць уласныя генеалагічныя дрэвы, па зярнятку знаходзячы і парадкуючы інфармацыю пра жыццё мінулых пакаленняў. Тыя, чые продкі з'ехалі з радзімы ў ЗША, спачатку ратуючыся ад эканамічнай эксплуатацыі расійскай метраполіяй каланіяльных правінцый, да ліку якіх належала і Беларусь, а потым — ад расійскіх бальшавікоў, у электронным рэсурсе www.ellisisland.org знаходзяць імёны сваіх далёкіх продкаў, ажно ўключаючы месца на параходзе і дату перасячэння акіяна па дарозе ў Новы Свет.

Шляхетнасць у сваіх родавых каранях мае шанец знайсці ладная частка суайчыннікаў — у Беларусі пад канец XVIII стагоддзя доля шляхты складала 10–12 працэнтаў насельніцтва (1 працэнт — у Расіі, Прусіі, Аўстрыі). Але пасля падзелаў Рэчы Паспалітай для Расіі, якая захапіла нашы землі, непакорны, вольналюбівы і патрыятычны дух беларускіх нобіляў быў нібы костка ў горле — і колькасць шляхты скарацілася. Як фізічна, так і юрыдычна. Шляхта была рухавіком вызваленчых паўстанняў 1794, 1830–1831 і 1863–1864 гадоў. У сваю чаргу, расійскі цар Мікалай I, які меў ганебную мянушку «Палкавіч», сваім указам у кастрычніку 1831 года загадаў герольдыям пачаць «разбор шляхты» — мерапрыемства, калі шляхта павінна была дакументальна пацвердзіць свае правы. У большасці беларускай шляхты, хаця гісторыі многіх цягнуліся ад баяраў XIII стагоддзя, галоўным доказам заставалася прызнанне іх статусу суседзямі ды наяўнасць шаблі пры боку. Ці партрэтаў продкаў на сцяне сядзібы. Так за некалькі дзесяцігоддзяў толькі ў Мінскай губерні працэнтны склад высакароднага саслоўя ўпаў да 3,5%.

А часам імкненне шанаваць сямейныя карані, калі спалучалася з жаданнем зацвердзіць уласнае сацыяльна-прэстыжнае становішча, разам з перабольшаным пыхлівым себялюбствам стваралі камічныя сітуацыі. Маем на ўвазе фальшывыя генеалогіі. У радаводзе «князёў» Жагеляў 1794 года, пададзеным у XIX стагоддзі ў герольдыі, спачатку Віленскую, а пазней Расійскую ў Санкт-Пецярбургу, паходжанне сям'і выводзілася «ад Гедыміна, сына яго Кейстута, унука Жыкгімонта, праўнука Міхала Жыкгімонтавіча, ад сына якога Станіслава паходзілі князі Міхайлавічы, пазней празваныя Жагелямі». Успамін пра гэты родавы міф ёсць у надпісе на партрэце Юрыя Аўгуста Жагеля ў экспазіцыі Нацыянальнага гістарычнага музея ў Мінску. Указам Сената і імператара Аляксандра II 31 кастрычніка 1880 года Жагелям было адмоўлена ў карыстанні княжацкім тытулам. Але іх упартая барацьба за княжацкія генеалагічныя карані, што суправаджалася як няўдачамі, так і поспехамі, увайшла ў гісторыю літаратуры. Вялікі Адам Міцкевіч не без спачувальнай іроніі сярод герояў «Пана Тадэвуша» вывеў Жагеля, у вусны якога ўклаў фразу пра наяўнасць княжацкай мітры ў многіх гербах гістарычнай Літвы («znajdziesz pono mitry i w niejednym domu», «тут знойдзеш мітры ледзь не ў кожным дому»; пераклад П. Бітэля).

Так ці іначай, пошук каранёў сям'і — занятак захапляльны і карысны. У 1990-я гады перакананыя ў арыстакратычным паходжанні асобы, здольныя давесці шляхетнасць дакументальна, пачалі яднацца вакол «Згуртавання беларускай шляхты». А ў кастрычніку 2009 года пра сваё з'яўленне абвясціла Грамадскае аб'яднанне «Мінскае згуртаванне нашчадкаў шляхты і дваранства». Больш ліберальнае за папярэднікаў: праверка шляхецкага паходжання ажыццяўляецца ў ім ідэнтыфікацыяй прозвішчаў продкаў заяўніка па гербоўніках і энцыклапедыях. З наступнай, у станоўчым выпадку, выдачай сувенірнай рэканструкцыі набілітацыйнай граматы (з падобных арыгіналаў XIX стагоддзя) і выявы герба з геральдычнай легендай. На сённяшні дзень у шэрагах аб'яднання каля 1000 чалавек.

**За каментарам пра дзейнасць аб'яднання «Мінскае згуртаванне нашчадкаў шляхты і дваранства» я звярнуўся да яго старшыні і адначасова дырэктара выдавецтва «Энцыклапедыкс» (вядомага серыйным праектам «Хто ёсць хто ў Беларусі») Ігара Чакалаў-Шыдлоўскага.**

## Ігар Чакалаў-Шыдлоўскі: «У кожнага з нас ёсць свая гісторыя»




Ігар Чакалаў-Шыдлоўскі

— Чаму наша аб'яднанне імкнецца да адраджэння шляхецкага духа? Па-першае, мы пазіцыянуем сябе як спадкаемцы шляхецкіх і дваранскіх традыцый. Мы падкрэсліваем, што дзяржава ў нас не саслоўная, але важным з'яўляецца вяртанне страчанай высокай культуры і ўкараненне яе ў штодзённым жыцці ў розных яе праявах. Якія звароты мы чуем, перасекшы мяжу з Польшчай? «Пан, пані...» А ў нас жа гучыць: «Жэншчына, падзьвінцеся!» — таму што 80 гадоў маргінальнага кіравання краінай не маглі не пакінуць слядоў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця.

У кожнага з нас ёсць свая гісторыя і сямейныя паданні. У кагосьці — архіўна пацверджаныя дакументы, у кагосьці — падпісаныя фотаздымкі, з выявамі асобаў, якія служылі на высокіх шляхецкіх ці дваранскіх пасадах, што відаць па ўбранні і паставе. У кагосьці ёсць проста сямейнае паданне, пра якое нашаптала бабуля, яшчэ баючыся казаць праўду ўслых, ці распавёў дзядуля. Нехта памятае, як продкі-сваякі знішчылі старадаўнія дакументы. Па-савецку тыповая сітуацыя: бацька аднаго з сябраў нашага аб'яднання ў 1970-я гады атрымаў высокую пасаду. І хаця за шляхецкія карані ў той час ужо не саджалі ў турму і не расстрэльвалі, ён палічыў за лепшае спаліць усе дакументы.

Між тым, шляхта з'яўлялася стрыжнем і асновай дзяржавы, яна дзяржаву стварыла, за яе паміpала ў войнах, пралівала кроў. Яна была сапраўднай структурай грамадства: ні ў Заходняй Еўропе, ні тым больш у Расіі шляхта настолькі не ўваходзіла ўглыб народа. 90% шляхты — бедная, «шарачковая», сама апрацоўвала зямлю, але насіла пры боку на кунтушы шаблю, выбірала ўладу ад мясцовай да караля, судзіла суд і хадзіла на вайну. На вайне шляхціц мог зарабіць грошы і здабыць пасады, вылучыцца, а мог страціць руку і нагу, а то і жыццё. Калі не шанцавала, шляхціц вяртаўся няздатным да працы калекам, і тады сям'я бедавала нават на агульным грамадскім фоне. Магла жыць бядней за суседніх сялян, якія здабывалі дастатак з простай апрацоўкі зямлі.

Вельмі важнае адраджэнне духоўных і агульначалавечых стасункаў, якія караняцца ў спадчыне шляхецкай культуры. Калі наша новая шляхта збіраецца на экскурсіі, музычныя вечарыны, мы бачым паміж сабой асобыя адносіны: раней не знаёмыя людзі сустракаюцца ветліва і радасна. Людзі сяброўюць — у аб'яднанні збіраюцца аднадумцы, блізкія па духу, прыходзяць з дзецьмі, сем'ямі, сустракаюцца асобы ад 5 да 75 гадоў узросту — розныя пакаленні. Гэта, можа быць, самае каштоўнае.

***— Далучанасць да новага кола нешта змяняе ў іх жыцці?***

— Сябры нашага аб'яднання пачынаюць інакш чытаць кнігі па гісторыі, заўважаючы ў рэтраспектыве стагоддзяў тую сувязь, якую і 80 гадоў савецкай улады і ўваходжанне ў Расійскую імперыю перарвалі. Яны бачаць і чуюць — ад эпохі Грунвальда — гербы і прозвішчы ваяроў, якія прыгадваюцца ў рэестрах войскаў, якія паўтараюць іх уласныя. І зусім іначай усведамляюць ролю свайго роду ў гісторыі. Адчуваюць фамільную генетычную повязь з лёсам радзімы.

Належнасць да згуртавання ўзмацняе цікаўнасць да папулярнай і прафесійнай гістарычнай літаратуры: зусім не гумані-

# ПОШУК КАРАНЁЎ

тарыі чытаюць і перачытваюць кнігі Уладзіміра Караткевіча, Адама Мальдзіса, Уладзіміра Арлова...

Генатып праяўляецца таксама ў фенатыпе: калі збіраецца шляхецкая грамада, 50–60 ці болей чалавек, людзі збоку здзіўляюцца: адкуль столькі прыгожых людзей разам? Твары, постаці захавалі гістарычны тыпаж, які мы можам бачыць на старасвецкіх партрэтах! Гэта дзіўна, але ... Як пародны конь вылучаецца перад цяглавым, ці пародны сабака — перад дварняком, так і чалавек, высакародныя шляхецкія гены якога прайшлі стагоддзі шліфоўкі праз адукацыю, кодэкс паводзін, выхаванне пакаленняў яго продкаў, вылучаецца сярод іншых.

***— Як выбіралася назва аб'яднання?***

У кожным слове назвы — «Мінскае згуртаванне нашчадкаў шляхты і дваранства» — ёсць сэнсавая нагрузка. Нашчадкі — таму што вядзецца пра спадкаемства традыцыі. Магчыма, прасачыць пакаленны роспіс усіх генерацый сям'і, які зазвычай вёўся ў шляхецкіх фаміліях, мы зможам у 10% выпадкаў. Ёсць аб'ектыўныя прычыны: у архівах не захаваліся дакументы, яны часткова вывезены ў суседнія краіны (Польшчу, Літву, Расію), часткова знішчаны. Але экстрапаляцыя колішняй колькасці шляхты ў 10–12% на сённяшні час і адносная да іншых лічба шляхетных прозвішчаў, вядомых па гербоўніках, дазваляе меркаваць, што спадчыннікаў шляхты ў Беларусі — прыкладна 1 мільён. Цікава, што ў 1920–1930-я гады многія, хаваючыся, мянялі прозвішчы,

**Шляхетнасць у сваіх каранях мае шанец знайсці ладная частка суайчыннікаў — у Беларусі пад канец XVIII стагоддзя доля шляхты складала 10–12 працэнтаў насельніцтва**

часам зменай адной ці некалькіх літар. Некалькі чалавек, якія прыйшлі ў наша аб'яднанне, аднавілі іх гістарычнае гучанне, вярнуліся да імёнаў прадзедаў.

Сустракаюцца і асобы, якія, маючы шляхецкія прозвішчы, не адчуваюць сябе нашчадкамі высакароднага саслоў'я. Магчыма, яны — спадкаемцы шляхты з несапраўднымі, калісьці падробленымі дакументамі. Загадка генаў...

***— Аб'яднанне часткова сутыкаецца са сферай міфатворчасці?***

— Мы не так патрабавальныя да дакументавання генеалогіі, як сябры «Згуртавання беларускай шляхты» ці спецыялісты Нацыянальнага гістарычнага архіва, хаця ў нас працуюць з дакументамі кандыдат гістарычных навук, аўтар кніг па генеалогіі Аляксандр Залівака і кандыдат гістарычных навук, выдавец кніг метрыкі ВКЛ Валеры Менжынскі. Ёсць іншая звышмэта: сваёй дзейнасцю аб'яднанне спрыяе пераадоленню вялікай хібы нашай культурнай традыцыі — адсутнасці геаічнага гістарычнага міфа.

Не трэба меркаваць, што нацыянальны міф нараджаецца сам сабой — яго неабходна стварыць і свядома ўкараніць. Прыгадайце нашы казкі — там мы не сустрэнем геаічных вобразаў. А яны патрэбна нацыі. У літаратуры для Беларусі іх з глыбіні стагоддзяў пачаў выводзіць Караткевіч, бо наша польскамоўная традыцыя XIX стагоддзя не была адаптаваная новай беларускай нацыяй.

На матэрыяле шляхецкай гісторыі — як агульнай, так і лёсаў асобных фамілій і гербаў, — можа быць створаны геаічны міф. У літаратурнай, выяўленчай форме, у выглядзе фільмаў і мультфільмаў — чаго заўгодна. Генрык Сянкевіч стварыў польскі нацыянальны міф — далёкі ад гістарычнай праўды. Ён трактуе гісторыю з пункту гледжання Польшчы — а як яшчэ яе будзе паказваць паляк? Свае міфы нарадзіла Расія, і цяжка патрабаваць ад расіян, каб яны пісалі гісторыю ў «беларускім аспекце». Без нацыянальнага гістарычнага беларускага міфа, прычым геаічнага, культурнае нацыянальнае адраджэнне на пачатку XXI стагоддзя наўрад ці магчымае.

І падставы, грунт для творчасці ёсць: беларуская шляхта, беларуская геральдычная традыцыя — адна са старажытных у Еўропе, значна больш глыбокая за расійскую. Манеры, культура, танцы, якія ішлі з глыбіні стагоддзяў, — аспекты старажытнай выхаванасці і падрыхтаванасці адчынялі беларускай шляхце ў часы Расійскай імперыі дзверы і адукацыйных устаноў, і імператарскага двара. Імперыя «расла» лепшымі людзьмі скораных народаў — таму і Чартарыйскі мог атрымаць пасаду міністра замежных спраў Расіі. І нават у Расійскай імперыі (у адрозненне ад СССР), пры ўсіх яе мінусах, немагчыма было ўявіць Катынскі лес для шляхты ВКЛ.

Нарэшце, беларуская геральдыка ясна паказвае, што ВКЛ здаўна жыло ў еўрапейскім кантэксце. У сярэднявечным Еўрапейскім саюзе. Таму арыстакратычныя шлюбы нярэдка былі інтэрнацыянальнымі. І служылі пры дварах — у нас замежнікі, мы — за мяжой. ВКЛ цалкам трапляла ў еўрапейскі культурны, палітычны, гістарычны кантэкст. У нашым аб'яднанні сёння сустракаюцца сведчанні былых кантактаў, прозвішчы — Мюнхгаузен, Тулуз-Латрэк і іншыя.

***

«Мінскае згуртаванне нашчадкаў шляхты і дваранства» на базе выдавецтва «Энцыклапедыкс» пашырае і папулярызуе веды па гісторыі шляхты і дваранства, па генеалогіі. Пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Беларусі выдадзена ўнікальная ў паліграфічным, выяўленчым і змястоўным планах кніга «Геральдыка Беларусі», да якой выдатныя тэксты і матэрыялы падрыхтаваў Анатоль Цітоў. У 2009 годзе з'явіўся зборнік дакументаў з гісторыі высакароднага саслоў'я Беларусі і суседніх дзяржаў. Да наступнага года выдавецтва рыхтуе даведнік па сімволіцы шляхецкіх і дваранскіх гербаў — бо ў геральдыцы кожная рыса мае глыбокі, амаль сакральны сэнс і літаральна інтрыгуе гістарычнымі таямніцамі... Тым, хто сёння пачынае шукаць свае карані, зрабіць гэта становіцца лягчэй. Але варта не губляць час.

ПАМЯЦЬ

# СВЕТЛЫ І ЎЗНЁСЛЫ МАСТАК МІХАСЬ РАГАЛЕВІЧ

*Аляксей ХАДЫКА*

**16 верасня споўнілася 40 дзён, як пакінуў гэты свет выбітны беларускі мастак Міхась Вікенцьевіч Рагалевіч (1932–2010). Менавіта ў гэты дзень намаганнямі экспазіцыянераў Таццяны Гаранскай і Віктара Маркаўца пры падтрымцы «Прыорбанку» ў фальварку «Добрыя мыслі», што на вул. Магілёўскай, 12 у Мінску, адчынілася выстава работ Рагалевіча і адбылася прысвечаная яго творчасці дыскусія. Яе ўдзельнікі параўноўвалі лёс Рагалевіча з лёсам Ван Гога: па драматызме, напружанасці духоўнай і стылёвай блізкасці, нарэшце, па познім прызнанні заслуг абодвух творцаў. «Прыорбанк», набыўшы цэлую калекцыю карцін Рагалевіча, плануе адвесці ім у новым офісе спецыяльную залу.**

Мала сказаць, што лёс не песціў мастака. Калі хлопчыку быў год, НКУС арыштаваў і расстраляў яго бацьку і старэйшага брата Франака за адзіную правіну — заможны стан шляхецкай сям'і Рагалевічаў, якая пры Саветах займалася ўласнай гаспадаркай на зямлі ў вёсцы Глінішчы на Уздзеншчыне. У 1937 годзе ў вагоне-цяплушцы паехала на поўнач маці, каб, вярнуўшыся праз 10 гадоў, быць зноў арыштаванай, сасланай у 1948 годзе ў Сібір, дзе і памерла ў 1949-м.

Будучы мастак правёў першыя гады жыцця ў дзіцячым доме, спачатку савецкім, потым нямецкім, здаючы кроў па нялюдскай праграме нацысцкага дзіцячага донарства. Пасля вайны мусіў з 15 гадоў сам зарабляць на жыццё. У хуткім часе перабраўся ў Мінск і пасля фабрычна-завадской вучэльні прыйшоў у ліцейку МАЗа, да пякельнага агню вялізных печаў. Затым было войска (1951–1953), 9-месячныя курсы экскаватаршчыка, зноў праца, і толькі з 1959-га — Мінская мастацкая вучэльня.



Міхась Рагалевіч «Бабіна Лета», 1998

Вучнёўскія работы з цвёрдым, дакладным мужчынскім малюнкам, якія Таццяна Гаранская прадэманстравала на прэзентацыі, абвяргаюць закіды, што спелы стыль мастака са стылізацыяй пад народны прымітыў або народныя іконы — вынік недастатковай адукацыі: гэта свядомы і тонкі прыём. Як і напружаны колер, экспрэсія фарбы, якія ідуць ад захаплення ў маладыя гады Ван Гогам, постімпрэсіянізмам, экспрэсіянізмам, авангардным мастацтвам пачатку XX стагоддзя. Усе гэтыя прыёмы — з набору «фішак» элітарнай мастацкай моладзі 1960-х. Але тое, што вылучае творчасць Рагалевіча, насуперак зімовай прахалодзе яго лёсу — святло і амаль заўсёды блакітнае неба ў яго палотнах. Ён заўжды заставаўся светлым і ўзнёслым, хоць, як кажуць яго блізкія сябры, трошкі замкнёным і надзвычай ранімым.

Галоўная тэма гэтага «сапраўднага народнага мастака» (Т. Гаранская) — яблыні ў квецені, яго фірмовы мастакоўскі вобраз, што прайшоў праз усё творчае жыццё. «Хацеў бы я, каб мяне прыгадвалі па такім паэтычным вобразе — веснавых яблынях. Як Ван Гога па яго «Сланечніках», — заўважыў на адкрыцці выставы сакратар Саюза мастакоў, паэт і мастак Рыгор Сітніца. Невыпадкова Рагалевіч, улюбёны ў паэзію Багдановіча, сваімі творамі натхняў іншых паэтаў. Яму прысвяціў некалькі вершаў Рыгор Барадулін («Божа, душу памяні...» і іншыя).

Яшчэ адна тэма — сям'я, цёплыя і верныя чалавечыя адносіны. З адбіткам уласнага знаку бяды — тэмы ссылкі ў савецкія лагеры, як на карціне «Арышт». «Памяць незагойнай ранай баліць да гэтых дзён», — напісаў мастак у аўтабіяграфіі праз дзесяцігоддзі пасля трагічных падзей). Ён быў першым з беларускіх жывапісцаў, хто ў сярэдзіне 1960-х асмеліўся выставіць творы, прысвечаныя жаху сталінскіх рэпрэсій адкрыта — на выставах у Палацы мастацтва. Ці трэба тлумачыць, што ўлады так і не «палюбілі» мастака пры жыцці, нават у 2000-я гады? Нейкі ён быў няправільны — ні сацыялістычны, ні нацыяналістычны. Тэмы творчасці — толькі агульначалавечыя каштоўнасці.

Прыкладам — краявіды і нацюрморты з кветкамі. Каханне, з вобразамі маладых, што ўзносяцца над зямлёй на кані — гэты казачна-фантастычны сюжэт запазычылі ў Рагалевіча іншыя мастакі Беларусі. Проста жыццё: ягоная знакамітая, шмат разоў рэпрадукаваная «Першакласніца» з букетам. Праводзіны і сустрэча з войска сына. Шмат партрэтаў таленавітых беларускіх фізікаў — яго першая майстэрня месцілася ў Інстытуце фізікі АН БССР, дзе ён працаваў проста афарміцелем.

Прысутныя на прэзентацыі выставы пагадзіліся: як у Ларысы Геніюш, жаночага сімвала трагічнай гісторыі Беларусі XX стагоддзя, у Рагалевіча і яго спадчыны ёсць наканаванне з гадамі ўздымацца і ўздымацца ў прызнанні і любові нашчадкаў. Таму Таццяна Гаранская, чыёй энергіі ў арганізацыі знакавых выстаў не перастаеш здзіўляцца, паабяцала: калектыўнымі намаганнямі будзе скончаны і выдадзены вялікі альбом твораў майстра. Пройдуць больш шырокія паказы яго карцін, прысвечаныя яму спецыяльныя чытанні. Хай гэта спраўдзіцца.

ПАСЛЯСЛОЎЕ

# БАРДЫ «АРШАНСКАЙ БІТВЫ»

Юрка КОПЦІК, Орша

**Заўсёднікі адкрытага фестывалю беларускай аўтарскай песні і паэзіі «Аршанская бітва» ўжо не здзіўляюцца ні пастам міліцыі на дарогах, ні патрулям АМАПу ў баявым рыштунку, ні татальным праверкам на дарогах блізу маленькай рэчкі Крапіўна, што на ўсход ад Оршы. Усё гэта паўтараецца з 2007 года кожны раз у бліжэйшую да 8 верасня суботу.**

Нельга сказаць, што раней улады ставіліся надта лаяльна да фестывалю, які існуе з 1991 года. Хутчэй, яны абыякава глядзелі на тое, як сотні пераважна маладых людзей з заплечнікамі ды гітарамі з'язджаліся на бераг Крапіўны і Дняпра, каб паслухаць бардаў і паэтаў, пасядзець у коле сяброў ля вогнішча і пагаварыць пра сваё. Пра фэсты былі перадачы на радыё, а ў 1995 годзе адпаведны сюжэт паказалі нават па БТ.

Але зараз стаўленне ўладаў ссунулася ў рэзкі негатыў. Зачысткі на вакзалах Магілёва, Віцебска і Оршы, дзе маладых людзей ссаджваюць з электрычак і адводзяць у аддзелы транспартнай міліцыі для прагляду рэчаў (па падазрэнні ў наркатрафіку!), перапісваюць пашпартныя дадзеныя, настойліва раяць не ехаць на Крапіўну і саджаюць на зваротныя цягнікі. Міліцэйскія патрулі на дарогах і сцежках.

Ці думаў у 1991-м бацька ідэі фестывалю Андрэй Мельнікаў, што ў 2010 годзе давядзецца яму са сваім роварам сядзець у райаддзеле міліцыі і 3 гадзіны слухаць лекцыю аб правілах язды ў цёмны час сутак па дарогах?

* * *

Фестываль «Аршанская бітва» — дзейства пераважна начное. Так склалася ад самага пачатку. Другога такога фэсту ў нас няма. Ёсць «Бардаўская восень» на Беласточчыне з журы, з прызавымі месцамі і г. д. Нічога гэтага на Крапіўне ніколі не было. Час паказаў, што самае найлепшае ў свеце журы — гэта зацікаўлены і ўважлівы слухач, а самае большае, што ты можаш тут атрымаць, дык гэта карону «Аршанскай бітвы» ад мастака Алеся Пушкіна. У розны час на Крапівенскім полі выступалі практычна ўсе класікі беларускай аўтарскай песні.



Мікола Рудакоўскі на фестывалі «Аршанская бітва–2008».

Сёлета праз шчыльныя міліцэйскія кардоны і пасты на дарогах на гістарычнае поле прабіліся невядома як толькі 14 чалавек. З выступоўцаў жа ўсяго адзін — Мікола Рудакоўскі з Рэчыцы. Дарэчы, ён з 2004 года не прапусціў ніводнага фэсту.

Калісьці Мікола прыцягнуў увагу сваімі пацешнымі песенькамі на матывы розных папулярных шлягераў галасам надта ж вядомага ўсім персанажа. Адна з іх, на матыў расійскага гурта «Звери» «Я ўхажу красіва» цяпер стала бясспрэчным шлягерам аўтарскай песні. Другая адметнасць гэтага аўтара — надта камернае выкананне. Але сёлета ў яго нарэшце «прарэзаўся» голас, і можна гаварыць пра нараджэнне новага імя на сцэне беларускай аўтарскай песні.

Сёлета Мікола Рудакоўскі паказаў, што ён валодае не толькі наборам шаржавых песенек або гістарычнымі рэтраспектывамі. Цяпер ён здольны сур'ёзна гаварыць са слухачом: Мікола практычна ніколі не называе сваіх песняў, не гаворыць са слухачом у час выступу. І гэта сур'ёзны недахоп у сцэнічным вобразе цікавага барда. Практычна ўсе новыя песні Міколы самотныя і тужлівыя.

* * *

На світанні ў сонным фестывальным лагеры ціха з'явіўся сам бацька фэсту Андрэй Мельнікаў. Праспяваў пасля снеданку свае вядомыя песні — «Шляхецкую», «На полі Аршанскае бітвы ралля», яшчэ сёе-тое. Потым народ пацягнуўся да мемарыяльнага крыжа пры вусці Крапіўны. Гэта ўжо традыцыя. Крыж з надпісам «Героям аршанскай бітвы» паставілі ўдзячныя аршанцы ў 1995 годзе. Ён асвечаны святарамі каталіцкай, грэка-каталіцкай і беларускай праваслаўнай аўтакефальнай цэркваў. Раней правіліся тут у час фэсту і набажэнствы. Цяпер — не. Як патлумачыў мне ксёндз аршанскага касцёла Аляксандр Жарнасек, цяпер закон нібыта не дазваляе. Можна служыць імшу толькі ў афіцыйна ўстаноўленых месцах. Гэтае ж месца — «не ўстаноўленае».

Само поле ля крыжа і лужок ля памятнага знака ў гонар бітвы і дарогу па полі да іх паводле распараджэння мясцовай улады 9 верасня трактар узадраў плугам. Ну няхай сабе так. Рэчка Крапіўна вялікая, і на ёй хопіць месца для нашай удзячнай памяці. Недзе чытаў, што грунвальдскі мемарыял пачынаўся амаль гэтак жа сама: збіраліся польскія студэнты, чыталі вершы паэтаў, спявалі песні, неабавязкова толькі патрыятычныя. Што можа быць лепш, чым спяваць песні і чытаць вершы там, дзе калісьці зямля дрыжэла ад тупату дзясяткаў тысяч коней, дзе лілася кроў і адляталі душы?

Цяпер Грунвальд — месца нацыянальнай славы і гонару. Там кожны год бываюць першыя асобы дзяржавы. У нас пакуль што вось гэтак. Але не на лініі Сталіна, не ля вёскі Студзёнка, а вось якраз на гэтым Крапівенскім полі вырастае і сталее тое пакаленне, якое зробіць нас нацыяй, вартай свайго мінулага.




Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1-1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 938

Падпісана да друку 24.09.2010. 8.00.

Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацтва творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.